Зінаіда Бандарэнка



# МОЙ ШЛЯХ ДА БЕЛАРУСІ

КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА

Зінаіда Бандарэнка

# МОЙ ШЛЯХ ДА БЕЛАРУСІ

Успаміны

Мінск
«Медысонт»
2020

УДК 654.197(476)(092)+929Бандарэнка
ББК 76.032(4Беи)
Б23

*Серыя заснавана ў 2009 годзе*

У выданні выкарыстаны фотаздымкі Уладзімра Крука, Юрыя Іванова, Анатоля Каляды, Яўгена Коктыша, Сяргея Шапрана, Уладзіміра Джэйгалы, svaboda.org, lit-bel.org і сямейных фотаальбомаў.

*Асаблівая падзяка Нобелеўскай лаўрэатцы па літаратуры 2015 года Святлане Алексіевіч*

*Падзяка генеральным спонсарам праекта:*
*Тэлеканалу «Белсат»*
*Саюзу беларускіх пісьменнікаў*
*Фонду «Вяртанне» і Паўлу Бераговічу*
*Выдавецтву «Медысонт»*
*Мэблевай ініцыятыве «Цесляры»*
*Інфармацыйнаму агенцтву БелПАН*
*Анатолю Сяргею*
*Ігару Жабароўскаму*
*а таксама:*
*Людміле Атчанашанка, Зоі Бартош, Станіславу Багданкевічу, Аляксею Брыло, Алесю Вячорку, Святлане Галавач, Уладзіміру Джэйгалу, Яраславу Іванюку, Уладзіміру Іскарцаву, Святлане Калінкінай, Артуру Квяцінскаму, Міраславу Кобасу, Івану Кобзіку, Юліі Лабанавай, Жанне Літвіной, Паўлу Мажэйку, Алесю Мазаніку, Людміле Мірзаянавай, Генадзю Мерчы, Аляксандру Мядзведзю, Яну Мяльніцкаму, Валянціне Навіцкай, Галіне Навіцкай, Сяргею Падсасоннаму, Наталлі Пархомчык, Паўлу Ржэвускаму, Любаміру Рэгаку, Ігару Сакалову, Пятру Станкевічу, Іосіфу Сярэдзічу, Якаву Трэмбольскаму, Ніне Шыдлоўскай, Аляксандру Шыпко*

*Вельмі ўдзячная за інфармацыйную падтрымку Аляксандру Класкоўскаму і Сяргею Шапрану*

**Бандарэнка, З. А.**

**Б23** Мой шлях да Беларусі / Успаміны / Зінаіда Бандарэнка. — Мінск : Медысонт, 2020. — 236 с. — (Кнігарня Пісьменніка).

ISBN 978-985-7261-11-6.

Успаміны адной з самых яскравых і любімых савецкіх дыктарак, Народнай артысткі Беларускай ССР Зінаіды Бандарэнка. Расповед вядомай тэлевядучай будзе цікавы не толькі тэлегледачам сталага ўзросту, але і людзям маладым, якія мараць атрымаць прафесію журналіста, ці проста цікавяцца мастацтвам.

**УДК 654.197(476)(092)+929Бандарэнка**
**ББК 76.032(4Беи)**

**ISBN 978-985-7261-11-6**

© Бандарэнка З.А., 2020
© Афармленне. ТАА «Медысонт», 2020

*Ёсць імёны, якія самі па сабе гісторыя. Адно з такіх імёнаў — Зінаіда Бандарэнка. З Зінаідай Бандарэнка звязана нараджэнне нашага нацыянальнага тэлебачання. Дзясяткі гадоў з дня ў дзень мы бачылі на экранах сваіх тэлевізараў гэтую прыгожую жанчыну, навіны «гаварылі» яе голасам. У гэтай кнізе яна сама расказвае пра сябе і пра савецкі, ужо міфалагізаваны, час. Яна — бясцэнны сведка, а сведка — гэта той чалавек, якому мы, знявераныя ў савецкіх ідэях, а таксама ў постсавецкім часе, яшчэ давяраем, бо мы па-ранейшаму не свабодныя. Свабода, як жар-птушка, заўсёды вабіць нас і вырываецца з рук. Аўтар гэтай кнігі разважае пра сябе і пра тое, чаму пакуты нашага народа не канвертуюцца ў свабоду, а занявольваюць нас. Мы прывыклі казаць пра свае пакуты, а свабоды баімся.*

*Такія кнігі вучаць нас свабодзе. Адгарніце першую старонку — і пачынайце думаць...*

**Святлана Алексіевіч**

***Маёй матулі, паляшучцы***
***Марыі Клімовіч прысвячаецца.***

Доўга думала, шукала, вагалася, з чаго пачаць мае ўспаміны?

Што ў маім доўгім творчым жыцці самае галоўнае, а што другаснае?

Вырашыла пачаць так.

Сталіца Украінскай ССР Кіеў урачыста прымаў у сябе Першы ўсесаюзны фестываль тэлевізійных фільмаў. Гэта быў 1966 год.

На адкрыцці фестывалю ўсе 15 дыктараў саюзных рэспублік віталіся кожны на сваёй роднай мове. Дыктара Цэнтральнага тэлебачання Валянціну Міхайлаўну Лявонцьеву сустрэлі даволі стрымана. Большымі апладысментамі адарылі Тамару Чалую — дыктара ўкраінскага тэлебачання. Мой жа выступ прынялі лепш за іншых, а калі на беларускай мове перадала ўкраінцам прывітанне ад сінявокай Беларусі, апладысментыператварыліся ў авацыі. І я ўбачыла, як людзі апладзіравалі і падымаліся з месцаў.

Калі вярнуліся дадому, у прэсе было шмат станоўчых каментарыяў. Да мяне падыходзілі, віншавалі. Упершыню адчула зацікаўленасць да сябе, калі раптам задавалі пытанне, дзе я нарадзілася?

Кожны тыдзень у нас праходзіла «лятучка», дзе збіраліся кіраўнікі аддзелаў, праграм і проста ўсе жадаючыя — нешта падобнае на «разбор палётаў». Калі дайшла гаворка да нашай украінскай паездкі, Вячаслаў Пятровіч Палескі, старшыня Рэспубліканскага камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні, адразу ўзяў слова: «Напэўна, усе вы бачылі, як сустракалі нашу Зіну. Думаю, яна разумее, што так віталі не яе, а нашу рэспубліку». І я, канечне, гэта разумела. Больш за тое, там, у Кіеве, упершыню адчула такі вялікі гонар за Беларусь, за нашых людзей.

У 1972 годзе наш знакаміты пісьменнік Іван Паўлавіч Мележ атрымаў Ленінскую прэмію за першыя два раманы

сваёй «Палескай хронікі» — «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы». Калі я чытала ў эфіры з тэлетайпнай стужкі паведамленне пра гэта, павіншавала Івана Паўлавіча з узнагародай, а на наступны дзень нечакана сустрэла яго. Паўтарыла віншаванні. Ён падзякаваў і раптам спытаў, адкуль я родам. З задавальненнем адказала, што з яго роднага Палесся. На гэта задаволены Іван Паўлавіч заўважыў: «Вось я і чую, што гаворка ў вас надта шляхетная».

# Першыя крокі

Мама мая, Марыя Піліпаўна Клімовіч, родам з Гомельшчыны. Нарадзілася яна ў 1903 годзе не ў самай беднай сям'і. Скажу так: гэта была сям'я «сераднякоў». Паводле маміных расповедаў трошкі ўяўляю іх дом, хаця сама там ніколі не была. Між Рэчыцай і Лоевам была такая вёсачка — Лесуны, якая хавалася сярод палескіх лясоў. Гэта недалёка ад таго месца, дзе Сож упадае ў Дняпро. Мама мая з тых мясцінаў.

Сям'я была шматдзетная. Раней жа было як? Шанавалі Бога і баяліся граху. Колькі Бог даваў дзяцей, столькі нараджалі і гадавалі.

Маміна мама (мая бабуля) памерла вельмі рана. Зразумела, што доўга заставацца адзін дзед не мог. У дом прыйшла іншая жанчына, якая для маёй мамы стала мачахай. Мама была самая малодшая, дый ростам маленькая. У дзяцінстве перахварэла на залатуху, якая ў Беларусі тых часоў была вельмі распаўсюджанай. Хвароба моцна аслабіла яе здароўе. На хваравітую дзяўчынку не звярталі асаблівай увагі і вельмі здзівіліся, калі яна ператварылася ў прыгажуню. Пра такіх звычайна кажуць — ладна скроеная прыродай. Мама была вельмі зграбнай і прывабнай дзяўчынай.

Для ўсіх гэта было неспадзяванкай. І для сваякоў, і для суседзяў. На яе пачалі заглядацца вясковыя жаніхі. Сярод іх — і сын мясцовага багацея Павел. Маме тады было толькі шаснаццаць гадоў. Ён быў старэйшы гадоў на пятнаццаць. Яна яго амаль не ведала, а таму, калі Павел пасватаўся, гэта стала нечаканасцю. Такі шлюб быў вельмі пажаданы для яе сям'і, дарэчны, бо на той момант раптоўна памерла і мачаха.

Бацька адразу даў згоду сватам Паўла. Хутка ўзялі шлюб, справілі вяселле, што тады пазначалі толькі ў царкве.

Часы былі надзвычай неспакойныя — рэвалюцыі, перавароты, змена ўлады... У глухое Палессе ўсе навіны даходзілі з вялікім спазненнем. Палешукі доўга не арыентаваліся, дзе і калі ў іх мясцовасці ўсталявалася савецкая ўлада, і наогул не ведалі, што гэта такое. Яно і зразумела: для селяніна самае галоўнае — своечасова пасеяць і сабраць ураджай, каб падрыхтавацца да зімы і перажыць яе бестурботна і сыта. А ўсё астатняе яго мала цікавіла.

У чужой сям'і маму сустрэлі прахалодна. Як вядома, свякрухі да нявестак звычайна ставяцца насцярожана. І гэты выпадак не быў выключэннем. Словам, сярод новай радні маме нават не было да каго прытуліцца. Яна амаль не ўспамінала той перыяд жыцця. Узгадвала толькі, што было вельмі цяжка. Мужа свайго яна не кахала, і нават мала ведала. Але падпарадкавалася лёсу. Гэтак яны пражылі год ці два.

У той час шмат хто з вясковага люду імкнуўся да гарадскога жыцця і сыходзіў з вёскі. Мама дазналася, што ў Гомелі жывуць нейкія далёкія сваякі. І яна вырашыла збегчы з сям'і, якая так і не стала ёй роднай. Аднаго разу на досвітку, калі ўсе пайшлі на працу (вярталіся толькі ўвечары), яна пешшу выправілася ў Гомель. Спачатку трэба было дабрацца да Лоева, а там — параходам да Гомеля. Ад Лесуноў да Лоева — 25 кіламетраў. Прабегла іх мама хутка (маладая ж была), а ў Гомелі знайшла прытулак у сваёй траюраднай цёткі Мяланні.

Яшчэ да рэвалюцыі Гомель стаў буйным чыгуначным вузлом, перакрыжаваннем розных дарог. Там былі дэпо і вагонарамонтны завод.

Павел не ведаў, куды збегла яго жонка, а яна хадзіла па дварах, зарабляла тым, што выконвала працу, якую давалі гаспадары. Працавала — і пакрысе ўцягвалася ў гарадское жыццё. Адукацыя ў яе была — чатыры класы царкоўнапрыходскай школы.

На адной вечарынцы мама пазнаёмілася з Сашам Бандарэнкам. Ладны, прыгожы. Толькі на год старэйшы. Ён

быў з сям'і чыгуначніка, вучыўся ў рамеснай вучэльні. Чыгуначнікамі тады называлі ўсіх, хто працаваў на чыгунцы. І не важна, кім працаваў чалавек, — у дэпо, токарам, слесарам, цесляром, ці абходзіў чыгуначнае палатно.

На пачатку трыццатых гадоў у вышэйшых навучальных установах для рабочай і вясковай моладзі былі ўведзены спецыяльныя квоты. Яны распаўсюджваліся і на новага мамінага знаёмага. Аднойчы яго запрасіла начальства (ён пачаў ужо працаваць у дэпо) і пацікавілася, ці не хоча ён паехаць у Мінск вучыцца на доктара. Маўляў, ім даюць адно месца.

Саша параіўся з бацькамі. Яны на хлеб зараблялі фізічнай працай, а тут сыну прапаноўваюць стаць доктарам! Для простага чалавека гэта прафесія была чымсьці недасягальным. Безумоўна, Сашавы тата і мама з радасцю пагадзіліся.

А што мая мама? Яна разумела, што для Сашы такой магчымасці можа больш і не быць, і імкнулася не замінаць. Нічога яму не сказала, а сама доўга плакала. Тады яшчэ маме падумалася, што са сваім каханым яна развітваецца назаўсёды.

Аднак праз некаторы час тата прыслаў маме ліст, у якім напісаў, што сумуе па ёй, не можа жыць без яе, і яна, шчаслівая, паехала ў Мінск. Там яны і пабраліся шлюбам.

Для мамы пачалося новае жыццё: уладкавалася афіцыянткай у рабочай сталоўцы — трэба было працаваць, інакш не пражыць. Не ведаю, атрымлівалі тады студэнты нейкую стыпендыю ці не. Вядома толькі тое, што ў бацькоў Сашы магчымасці падтрымліваць яго фінансава не было.

У 1931 годзе (пасля шасці гадоў чакання гэта было Боскім падарункам) у іх нарадзіўся сын. Назвалі яго Ігарам, а ў 1939-м на свет з'явілася я. Сям'я наша жыла ў інтэрнаце медінстытута на Ленінградскай вуліцы амаль побач з чыгуначным вакзалам. Дарэчы, медінстытут тады быў адным з факультэтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Вучыўся тата вельмі добра. Калі я нарадзілася, ён ужо скончыў ардынатуру, паступіў у аспірантуру і працаваў у

хірургічным аддзяленні ваеннага шпіталя, які сёння знаходзіцца на праспекце Машэрава.

Вайна заспела нас, калі тата быў на дзяжурстве ў шпіталі. Мінск бамбілі ўжо 22 чэрвеня 1941 года. Вакзал гарэў, мама раз-пораз з намі, дзецьмі, і суседзямі бегала ў бамбасховішча на вуліцы Карла Маркса. Тое, што мы бегалі менавіта туды, ужо значна пазней удакладніў наш вядомы паэт Мікола Аўрамчык. Дзесьці раней у інтэрв'ю я ўзгадвала бамбасховішча, насып якога дагэтуль узвышаецца ў Ленінградскім (цяпер Міхайлаўскім) скверыку. А Мікола Якаўлевіч мне патэлефанаваў і выправіў тую гістарычную памылку. Аказалася, што, як рэдактар газеты «Чырвоная змена», ён публікаваў матэрыялы пра акупаваны Мінск і дакладна ведаў: бамбасховішча ў Ленінградскім скверыку пабудавалі для сябе немцы перад самым сыходам з горада.

Увечары 24 чэрвеня са шпіталя прыбегла ўся ў слязах медсястра Марыя Ісакаўна і сказала: «Трымайся, Марыя, твой Саша загінуў. У аперацыйную трапіла бомба. У шпіталі ідзе эвакуацыя, і фашысты вось-вось уварвуцца ў горад. Нам трэба хутчэй уцякаць».

Са слязьмі мама адразу пачала збірацца ў дарогу.

З сабой узяла як мага больш рознай вопраткі — разумела, што давядзецца мяняць яе на ежу. Прымацавала Ігару за плечы торбачку, узяла мяне на рукі, і мы разам з той жанчынай пачалі выбірацца з горада, які ўжо гарэў, у напрамку Бабруйска. Ішлі пераважна начамі. Удзень дарогу бамбілі фашысты, абстрэльвалі з самалётаў, бо па ёй адступалі нашы войскі, рухаліся бежанцы.

Дарогі былі перагружаныя. Мы ішлі па начах, а ўдзень хаваліся ў хмызняку. Часам хтосьці падсаджваў нас на грузавік ці падвозіў на кані. Гэтак мы дабраліся да вакзала Бабруйска. Марыя Ісакаўна засталася ў сваякоў, а мама паспрабавала сесці на цягнік і даехаць да Масквы. У сталіцы жыў з сям'ёй родны брат таты Васіль, і мама спадзявалася на яго дапамогу. Але на вакзале ёй сказалі, што цягнікі да Масквы не даходзяць, за 150—200 кіламетраў пасажыраў

высаджваюць і вяртаюць назад. Масква людзей не прымала.

Тады матуля вырашыла рухацца ў родныя мясціны, на Гомельшчыну. І мы пайшлі далей па ваенных дарогах. Ногі ў мамы і Ігара апухлі. Калі мы дабраліся да Гомеля, то там было адносна ціха, нашы зеніткі адганялі фашысцкія самалёты. Працавалі нават райкамы, пошта. Часовы прытулак знайшлі ў сястры таты Любы.

Як вядома, фашысты рваліся да Масквы. Іх націск стрымліваўся пад Магілёвам. А ў кірунку Гомеля іх яшчэ не было.

У час нашага доўгага шляху ў Ігара пачаліся праблемы са страўнікам. Больш за дзесяць сутак малы не мог схадзіць на двор. А ў ваенным гарадку «Ляшчынец» непадалёку ад дома цёткі Любы знаходзілася ваенная частка. Мама звярнулася па дапамогу да дактароў шпіталя, расказала пра мужа — і Ігара пакінулі там. Праз суткі маме сказалі: «Жанчына, яшчэ некалькі гадзін, і вы страцілі б сына...» Мама плакала і кідалася цалаваць дактарам рукі.

У тыя доўгія гады акупацыі яна не магла змірыцца, што яе Сашы няма. Значна пазней мы даведаліся, што падчас авіяналёту тата сапраўды разам з іншымі хірургамі знаходзіўся ў аперацыйнай. Менавіта ў рог гэтага будынка якраз і трапіла бомба. Няцяжка ўявіць, што там рабілася: грукат, пыл, крыкі, стогны. Высвятляць, хто ўцалеў, а хто загінуў, часу не было. Шмат было параненых. Налёты ішлі бясконца. І пачалася эвакуацыя шпіталю.

Калі ўжо стала тэледыктаркай, мне давялося весці імпрэзу, прымеркаваную да 200-годдзя Галоўнага клінічнага шпіталя Узброеных Сіл БССР у Акруговым доме афіцэраў. Калі рыхтавалася да правядзення юбілейнай даты, папрасіла даць мне кароткую гістарычную даведку пра Вайсковы шпіталь і пералік людзей, пра якіх трэба было расказаць асобна.

З рэкламнага буклета Ваеннага шпіталя чытаю: «22 чэрвеня 1941 года шпіталь быў узняты па трывозе, у 12.00 пачалі паступаць першыя параненыя. 24 чэрвеня ў 11 гадзін

раніцы прамым пападаннем бомбы была ўшчэнт разбурана аперацыйная. Раненых эвакуіравалі ў лазарэт 100-й стралковай дывізіі». Мой тата ў той момант быў якраз у аперацыйнай. Калі я распавядала пра ўсё гэта на сцэне, як быццам бы разам з татам перажыла тую бяду.

Мама разумела, што надалей заставацца ў Гомелі нам нельга, бо ў лазарэце, дзе лячылі Ігара, даведалася, што ўсіх ваенных эвакуіруюць.

Мама напісала свайму роднаму брату Міколу ў вёску Уборак на Лоеўшчыну, і літаральна праз тыдзень ён прыехаў на кані і забраў нас. Па сутнасці, мама выратавала нам з Ігарам жыццё.

Ад Гомеля да Уборка — больш як семдзесят кіламетраў. Сюды да сваёй другой жонкі і перабраўся жыць дзядзька Мікола. Тут пабудаваў добры, досыць прасторны дом. Памятаю яго вялікі падворак з двума хлявамі-кароўнікамі, свінарнікам, у якіх было шмат хатняй жывёлы.

Немцы, калі наязджалі ў вёску, заўсёды спыняліся менавіта ў дзядзькі. Асобнага гарнізона ў вёсцы не было. Бліжэйшы знаходзіўся ў Холмечы.

Запомнілася, як мы з дачкой дзядзькі Ганначкай ляжалі на печы і назіралі, як яго жонка цётка Соня падае абед немцам. Адзін з іх падняўся і даў нам шакаладку. Той смак з 1943 года памятаецца мне па сёння.

Жыхары Уборка сустрэлі нас даволі прыязна, хаця з братам Ігарам адразу, як мы прыехалі, пачаліся непрыемнасці. Тата ў нас быў смуглявы, чорнавалосы. Бацькі яго з вёскі Бабовічы, што за Гомелем у чарнігаўскім напрамку; палова жыхароў вёскі мелі прозвішча Бандарэнка. Ігар надта быў падобны да бацькі — таксама смуглявы і чорнавалосы. Вельмі прыгожы хлопчык. З гэтай нагоды ў вёсцы было шмат плётак. Казалі, што муж Марыі быў камуністам і, мусіць, габрэем, і некаторыя вяскоўцы называлі Ігара «жыдком». Калі немцы ці паліцаі заходзілі ў вёску, то брата адразу хавалі далей ад іх вачэй. Мне ж, блакітнавокай і светлавалосай, нібыта нічога не пагражала. Але мы жылі ў заўсёдным страху.

У нашай вёсцы немцы прызначылі старасту. Канечне ж, ён пра Ігара ўсё добра ведаў і папярэджваў пра прыезд паліцаяў.

Першыя гады вайны я не памятаю, а вось час, бліжэйшы да вызвалення, прыгадваецца добра. Мне было ўжо амаль пяць гадкоў. Асабліва запомнілася ўборкаўская царква. Яна была вельмі прыгожая. Мне здавалася вялікай, прасторнай, велічнай. Яе пазалочаныя купалы былі бачны адусюль. Бліжэй да канца акупацыі прыбегла неяк да мамы жанчына, якая працавала прыбіральшчыцай у камендатуры, і ўсхвалявана сказала, што ў вёску неўзабаве могуць прыехаць карнікі, а яна на свае вочы бачыла ў спісе на знішчэнне прозвішча нашай сям'і як сям'і камуніста і габрэя.

Перад яе прыходам мы чулі страляніну. «Гэта паліцаі», — патлумачыла жанчына. На нашым падворку ў той час гуляла дзяўчынка Тамара Курзіна. Жанчына сказала, што ўсіх Курзіных ужо забралі — нібыта хтосьці ў іх быў у партызанах. Тамара, як пачула гэта, рванула з двара. Мама схапіла яе, нікуды не пусціла, схавала ў нас. Так яна выратавала дзяўчынцы жыццё. Бо потым мы даведаліся, што сям'ю Курзіных зачынілі ў хляве і спалілі.

Дзядзька Мікола, пачуўшы вестку, што мы ў спісе на знішчэнне, вывеў з хлява дзвюх кароў, загадаў маме збірацца ды ісці ў Бурыцкія лясы — самую глухую мясціну паблізу. Тамару Курзіну, а таксама двух сыноў дзядзькі Міколы мы ўзялі з сабой. Сам жа ён з жонкай і дачушкай Ганначкай рушыў у кірунку балота: «Можа, хто і выратуецца», — сказаў на развітанне, прывязаўшы да рукі другую карову.

Па дарозе, памятаю, калі мама несла мяне на руках праз балота, я парэзала аб асаку ручку. Яна была ўся ў крыві, што моцна ўсіх перапужала. Той шрам застаўся ў мяне дагэтуль як напамін пра вайну...

У лесе, пад векавымі соснамі, мы пражылі да глыбокай восені. Зрэшты, якое там жыццё? Пакутавалі. Спалі ў так званым курані — будане з адтулінай уверсе замест коміна. Навокал месціліся ўцекачы з суседніх вёсак. Шмат людзей.

Курані ставілі купкамі ў звыклым парадку, нібы паўтараючы мапу вёсак: Пракісель, Ваўкашанка, Уборак, Ястрабка, Грамыкі...

Дарэчы, карову-карміцельку мама прывязвала на ноч да нагі. Каб тая не адышла, бо партызаны маглі пусціць яе на харчы. Яны часта наведваліся — як з суседняй Украіны, так і свае. Больш за іншых бязлітаснасцю вызначаліся партызаны знакамітай украінскай брыгады Каўпака. Іх баяліся як агню. Забіралі яны літаральна ўсё, што можна есці.

Мясцовыя былі больш чалавечнымі. Аднойчы яны прыйшлі і да нашага кураня. Маці Хрыстом Богам маліла, каб не забіралі карову. Калі ўбачылі малых дзяцей, злітаваліся. А ў каго з уцекачоў мелася па дзве каровы, дык і размовы не было: адну абавязкова рэквізавалі.

Маленькую Тамару ў хуткім часе забраў да сябе яе сваяк, намеснік камандзіра партызанскага атрада.

Фронт набліжаўся, кананада чулася ўсё гучней і гучней. І вось аднойчы сяджу ў курані і бачу — бяжыць мама, ад радасці задыхаецца.

— Дачушка, — крычыць, — нашы прыйшлі!

Я думаю: «Якія нашы? Мо дзядзечка Мікола з цёткай Соняй?»

А яна: «Чырвонаармейцы ў лесе. Глядзі, чым пачаставалі», — і дастае з-пад ватоўкі бохан бялюткага хлеба. На сваёй памяці я такога ў вочы не бачыла. Мама наліла мне малака (карова нас тады выратавала ад галоднай смерці) ды адламала ці не чвэрць бохана. Божа, якая гэта была смаката! Тады ж упершыню адчула і смак солі. Бо там, у лесе, усё елі несалёнае: бульбяное варыва з шалупіння з малачком і тое, што маглі сабраць, — ягады, грыбы...

Тым часам маці тлумачыць: дачушка, Уборак ужо вызвалены, будзем вяртацца ў вёску. З нашай кароўкай да вёскі мы шкандыбалі, напэўна, цэлы дзень, а як падышлі — анямелі. Ацалела толькі некалькі хатаў, астатнія — папялішчы. Памятаю, што па дарозе дамоў ляжала шмат забітых. Мама прыкрывала мне даланёй вочы і загадвала глядзець пад ногі.

А ўшчэнт разбітая прыгожая царква стаіць у мяне перад вачыма і сёння. Распавядалі, што, калі ішоў бой за вёску Уборак, на званіцы засеў фашысцкі кулямётчык. Метка касіў. І наша артылерыя знішчыла не толькі кулямётчыка...

Праз некаторы час завітаў у вёску бацюшка ды пахрысціў усіх уборкаўскіх дзяцей, і нас з Ігарам таксама, на прызбе адной з ацалелых хат. Добра памятаю, як стаяла ў чарзе да бацюшкі. Крыжыкі ўсім надзявалі простыя, самаробныя, на зрэбнай нітачцы. З радасцю яго насіла, але потым, не памятаю ўжо калі, згубіла, пра што дагэтуль вельмі шкадую...

Людзям трэба было перажыць зіму, і вяскоўцы пачалі капаць зямлянкі. Каля нашай зладзіў калодзеж дзядзька Мікола. У яго была цудоўная сям'я. Цётка Соня заўсёды імкнулася даць мне большы кавалачак хлеба. Хаця побач знаходзілася яе родная дачушка. Так яна шкадавала мяне, сірату. Дзеці ўсё заўважаюць. А дзядзька Мікола вельмі любіў нас з мамай, а мы яго. Потым ён часта прыязджаў да нас у Гомель, а я ездзіла да яго на летнія вакацыі.

Пазней гаспадарлівы дзядзька Мікола паставіў хатку. Праўда, ужо не такую прасторную, як была раней. Мама, цётка Соня і дзядзька Мікола шмат працавалі: трэба было ўладкоўваць не толькі сваё жыццё, але і калгаснае. Памятаю, як цётка Соня прынесла пад спадніцай кармавы салодкі бурак з калгаснага поля. Людзі галадалі, але яшчэ ішла вайна, і калгаснікаў саджалі ў турму за прынесеную бульбіну ці бурак.

Перажылі вайну не ўсе нашы аднавяскоўцы. З сям'і Курзіных засталася жывая толькі выратаваная маёй мамай Тамара, усіх яе родных фашысты забілі. Сёння на вясковай плошчы стаіць помнік загінулай сям'і Курзіных. Але толькі адной гэтай сям'і. А колькі іншых сваіх жыхароў недалічылася вёска Уборак... Даволі хутка ў адной з ацалелых хатаў пачала працаваць школа. Ігар там скончыў першыя класы.

Пасля вайны засталося шмат зброі: куляў, гранат, снарадаў... Дзеці знаходзілі іх і даволі часта гінулі ад выбухаў. Ігар рос вельмі няўрымслівым і гарэзлівым, таму мама жыла ў вечным напружанні і хваляванні.

Памятаю, ля нашай вёскі дзеці кінулі ў вогнішча нешта выбуховае — загінулі адразу чацвёра. Мама бегла праз усю вёску. На возе ляжалі крывавыя парэшткі хлопчыкаў. Ігара сярод іх не было...

Аднойчы да нас завітала нейкая жанчына. Папрасіла вады. Мама прапанавала прысесці і пачала расповед пра мужа, пра сваё гаротнае жыццё. Тая ўважліва слухала, разглядала маму, а потым папрасіла яе руку. І раптам выдыхнула: «А муж твой, Марыя, жывы! Толькі побач з ім іншая жанчына».

І пачала мама пісаць лісты ўсім сваякам. І ў Гомель, і ў Маскву — роднаму брату таты. І тут раптам прыходзіць ліст ад самога таты. Ён паведамляў, што знаходзіцца ў Германіі.

А здарылася наступнае. Авіябомба, якая трапіла ў рог аперацыйнай, не ўзарвалася, а толькі нарабіла шмат шуму і пылу, і ўсе засталіся жывыя. Калі шпіталь эвакуіравалі, тата паспеў забегчы дадому, аднак убачыў замест нашага дома вялізную яміну. Вядома ж, першая думка — усе загінулі... Потым ён служыў хірургам у медсанбаце да апошняга дня вайны, дайшоў да Берліна і атрымаў узнагароды.

Неўзабаве замест лістоў пачалі прыходзіць пасылкі. Праўда, ад голаду яны нас не ратавалі, бо тата дасылаў у скрынках дзіцячыя лялькі ды розную бялізну. Але цацкі выклікалі вялікую цікавасць у вяскоўцаў, бо яны нагадвалі некаторых «уборкаўцаў»: «Глядзіце, гэта ж Яўменіха, а гэта Васька Швец...»

Кавалачкі трафейных абрусаў, якія тата дасылаў з Германіі, у мяне захаваліся і па сёння.

Праз некаторы час мама наважылася пераехаць у Гомель, дзе жылі сваякі таты. Пэўны час мы жылі ў яго стрыечнай сястры, цёткі Любы. У яе застаўся вялікі, не разбураны вайной дом на беразе Сожа. Ігар зноў пайшоў у школу. Мы даведаліся, што на ўскрайку Гомеля пачаў працаваць шпіталь для хворых на сухоты. Пасля вайны было шмат людзей з гэтай хваробай. Праз некаторы час да нас дайшлі чуткі, што галоўным урачом шпіталя прызначаны Аляксандр Парфіравіч Бандарэнка. Гэта быў мой тата.

# Маленства без дзяцінства

Адразу нам стала вядома — у нашага таты другая сям'я. З Нямеччыны ён вярнуўся з жонкай і дзіцём. Для нас гэта было трагедыяй. Маці ніяк не адважвалася з ім сустрэцца.

Я тату не памятала, а вось Ігар быў моцна ўзрушаны і не знаходзіў сабе месца — ён жа вельмі-вельмі быў прывязаны да бацькі. Аднойчы да нас прыбегла суседка і расказала, што сустрэла Ігара, які вырашыў, што, каб тата вярнуўся да нас, трэба адрэзаць яго новай жонцы нос. Ён нават паказаў суседцы ножык.

Татаў шпіталь быў размешчаны на другім беразе Сожа. Мама пабегла туды. Мост праз раку быў драўляны, з такімі вялікімі дзіркамі, што я, калі пераходзіла, нават баялася глядзець уніз — там вiравала рака. На гэтым мосце мама і дагнала Ігара, угаварыла яго не рабіць нічога кепскага. Паабяцала сустрэцца з татам.

З першай спробы сустрэча не адбылася. Тата размаўляць не захацеў. Патлумачыў так: «У мяне другая сям'я. Ты была ў акупацыі. Я камуніст і не маю права...» Мама плакала і гаварыла, што з двума дзецьмі з акупацыі не магла нікуды «знікнуць», ішла вайна — і ў яе проста не было другога выйсця.

Дзве бацькавы сястры былі за Кацярыну Іванаўну, новую жонку бацькі. Дзве — цалкам за маму, і ўвесь час настройвалі яе супраць новага выбару таты. Мама ж так і не даравала тату. Яна вельмі доўга не давала яму разводу. І ён не мог аформіць новы шлюб.

Паўтаруся, Ігар быў вельмі прывязаны да таты. Кінуў вучобу ў школе. Штодзень бегаў у бальніцу паглядзець, што тата робіць, як пераходзіць з аднаго корпуса ў іншы. З дапамогай таты Ігара ўладкавалі ў рамесную вучэльню. Тата-

вы сваякі раілі маме не складваць рукі, а змагацца за сваю сям’ю, за сваё шчасце. Недзе з год я жыла ў таты. Так маме параіла адна з яго сясцёр. Маўляў, калі пастаянна буду ў яго на вачах, можа ўсё ж вернецца назад.

Увесь час я параўноўвала маму з яго новай жонкай. Мне падавалася, што мама значна прыгажэйшая. Але Кацярына Іванаўна была мудрай жанчынай. Як толькі яны прыехалі ў Гомель, яна нарадзіла другое дзіця, а неўзабаве — і трэцяе. Была і яшчэ адна прычына майго «пераезду» да таты — жытло. Мама ўгаворвала, што гэта ненадоўга, што цётка Люба не можа нас больш прымаць, бо яе муж Пятро, які быў паранены, таксама вяртаецца з вайны, і мы будзем проста перашкаджаць ім. Паабяцала забраць мяне, як толькі знойдзе пастаянную работу.

Тата жыў у добрым доме побач з будынкам шпіталя. Для мяне наступілі сапраўдныя пакуты. Увесь час я знаходзілася ў страху і трывозе, заўсёды чакала маму, але кожны яе прыход заканчваўся скандаламі. Кацярына Іванаўна ніколі не прымала ў іх удзелу і сыходзіла з хаты. Трэба аддаць ёй належнае — ніколі мне ні за што не наракала. Ставілася ўважліва і па-добраму.

У школе, якая была побач з працай майго таты, я скончыла першы клас. У бальніцы мяне ўсе добра ведалі. Часта бегала па палатах — некаму пачытаю верш, некаму раскажу прыдуманую жыццёвую гісторыю. А яшчэ ў мяне быў абавязак — прыносіць са шпітальнай сталовай дадому на абед апельсінавы сок у маленькім слоіку. Ад яго ішоў такі смачны пах, што цалкам яго не даносіла. Але Кацярына Іванаўна рабіла выгляд, што не заўважала...

Я вельмі любіла трымаць на руках маленькага зводнага брата Сашу і гуляць з ім. Аднойчы Саша вырваўся з рук і ўдарыўся аб табурэтку. Ён вельмі моцна плакаў, а я разам з ім. Тата за гэты ўчынак мяне пакараў тым, што паставіў на калені ў кут.

У дарослым жыцці Саша стаў ваенным лётчыкам, служыў на Новай Зямлі (на вядомым палігоне для ядзерных выпрабаванняў) амаль восем гадоў.

Аднойчы, калі быў на Вялікай зямлі ў чарговым адпачынку, распавёў, што трэба вяртацца раней, бо там нешта здарылася. А праз паўгода я даведалася, што пры тых выпрабаваннях памылкова было знішчана мірнае паселішча. Умовы службы там былі вельмі жорсткія. А гады ў брата былі ўжо не маладыя. Прыйшлося прыкласці намаганні для пераводу ў Беларусь, у Мачулішчы. Заканчваў службу тут. Але сваё здароўе ён пакінуў на Новай Зямлі. Цяпер Аляксандра ўжо няма. А мне не хапае майго добрага і шчырага брата Сашы.

* * *

Але вернемся зноў да майго дзяцінства.

Што да Ігара, то ён заўсёды быў галодны: у вучэльні кармілі кепска. Ён забягаў да нас (да сям'і таты), каб хоць трохі падсілкавацца. Мы з ім елі тое, што гатавалі ў «сухотнай» сталоўцы, — і калі ў школе дзецям рабілі «рэакцыю Пірке», у мяне вызначыўся станоўчы вынік на сухоты.

Мама нарэшце мяне забрала. У другі клас пайшла ўжо ў іншую школу. Пад яе перарабілі звычайны аднапавярховы драўляны дом. Год вучобы ніхто на мяне асабліва не звяртаў увагі, а вось у трэцім класе настаўніца доўга размаўляла са мной, а потым выклікала ў школу маму. Яна ведала гісторыю нашай сям'і і параіла мне вярнуцца ў другі клас, таму што я не заўсёды адказваю на простыя пытанні альбо адказваю недарэчна, як кажуць, лётаю ў аблоках. Давялося мне стаць «другагодніцай».

Пакуль Гомель адбудоўваўся, мы з мамай жылі ў здымным жытле як кватаранты. Плацілі дзесяць рублёў за свой пакой. Нам заўсёды шанцавала на добрых гаспадароў. Яны любілі мяне і вельмі добра ставіліся да маёй ветлівай і добразычлівай мамы.

Працу ў Гомелі знайсці было неверагодна складана. Таму можна толькі здзіўляцца настойлівасці маёй маці, якая пачала працаваць з першага дня жыцця на новым месцы — дэзынфектарам на чыгунцы. Я ёй часта дапамагала, таму добра ведаю, як усё рабілася.

Мы заходзілі ў пасажырскі вагон. Спачатку вокны заклейваліся да поўнай герметычнасці. І я рабіла гэта разам з мамай. Пасля ставіліся металічныя печачкі, у якіх маці падпальвала серу. Потым мы адразу пакідалі вагон, а праз суткі прыходзілі іншыя людзі і ўсё прыбіралі. Пасля такой працэдуры не заставалася ніводнага паразіта. Гэта была вельмі цяжкая і небяспечная для здароўя праца.

Мама імкнулася карміць мяне як мага лепш, хоць ёй было нялёгка — заробак простага дэзынфектара быў мізэрны. Тата рэгулярна нам дапамагаў — прысылаў аліменты.

У гэты ж час у мяне пачаліся прыступы, якія з часам перараслі ў мігрэнь. Неўролаг параіў як мага больш часу праводзіць па-за Гомелем і цалкам адмовіцца ад кантактаў з новай сям'ёй таты.

І з гэтага боку лёс мяне падштурхоўваў да Уборка. Кожны год на ўсё лета мама выпраўляла мяне на летнія вакацыі — папіць малачка. Тым больш, што там заўсёды поруч са мной была мая стрыечная сястра Ганначка, дачка дзядзькі Міколы, якую я вельмі любіла і якая потым стала маёй сапраўднай сяброўкай. Божа, як мне падабалася ездзіць ва Уборак! Вось дзе мне было раздолле!

Аднойчы мы з Ганначкай разам з уборкаўскай дзятвой вырашылі пайсці па чарніцы. Наша вёска была на раўніне, а лясы пачыналіся з боку Лесуноў (таму і назва такая). Ісці было даволі далёка, таму падняліся яшчэ да світанку. Як толькі выйшлі з нашай вёскі, у мяне перад вачамі пачало ўсё дрыжэць. Пачынаўся чарговы прыступ...

Сястра, якой вельмі хацелася сабраць хоць крыху ягад, угаварыла дайсці да лесу. Маўляў, там крыху паспіш. У лесе вырашылі яшчэ крыху прайсці... Потым яшчэ крыху... Раса ўжо сышла. Узыходзіла сонца. Разам з чыстым лясным паветрам яно стварыла сапраўдны цуд. Мы прыселі на белы мох. Выцягнулі свае торбачкі — кавалкі хлеба з салам. А ў бідонах было малако, якое трэба было выпіць, каб было куды збіраць чарніцы. Боль пачаў сціхаць. І не заўважыла, з якім смакам ела і піла разам з усімі. А потым ускочыла, пабегла збіраць ягады. Прыступ раптам скон-

чыўся. Цягнуўся ён менш за гадзіну. Такога ў маім жыцці не было ніколі. І калі ўжо ў дарослым узросце мне падчас выхаду на сцэну даводзілася цярпець боль па некалькі гадзін, я не раз успамінала чароўную палескую прыроду.

Але ўсё гэта засталося ў далёкім дзяцінстве...

Пасля вайны вёска Уборак хутка адбудоўвалася. У калгасе з'явіўся нават свой клуб, дзе адну палову невялікага драўлянага дома займала бібліятэка, а другую — канцэртная зала з маленькай сцэнай.

Згадваецца такі момант. Старшыня калгаса па прозвішчы Бабраўнічы аднойчы сустрэў нас, дзяцей, на вуліцы і сказаў: «Калі б вы замест бессэнсоўнага гойсання папрацавалі б трохі на таку, я правёў бы вас на канцэрт — вечарам у клубе будуць выступаць артысты».

Божачка! Мы ўсе завіхаліся, як пчолкі. А на таку — вялізныя горы зерня. Мы вёдрамі цягалі яго да веялак, засыпалі. Нехта круціў ручкі веялак. Потым зноў беглі па зерне. Я і не заўважыла, як больш чым трэба затрымала вядро над веялкай, і мой чырвоны сарафанік пачало ўцягваць у кола машыны.

Я крычу, мне ўжо няма чым дыхаць. Нарэшце людзі ўбачылі, падбеглі, пачалі адкручваць ручку назад. Стаю ўся ў мазуце. Людзі і спачуваюць, і смяюцца: «Міколаву дзеўку закруціла ў веялку!»

Але мы былі шчаслівыя ў надзеі на вячэрні канцэрт. Сабраліся ля клуба, чакаем старшыню. Ён неўзабаве прыйшоў са сваімі дзецьмі. А іх у яго было, можа, чацвёра, і мы ўсе з імі сябравалі. І што? Ён праходзіць, а нас нібы не заўважыў. Гэта быў першы ў маім жыцці падман з боку так званага дзяржаўнага чалавека.

Уборкаўскія хлопцы кінуліся на мяне з кулакамі: гэта ж я сагітавала ўсю вясковую дзятву на тую працу.

* * *

У 34-ю гомельскую сярэднюю школу я трапіла ў пяты клас. Нас усіх перавялі са старэнькай школы ў новы будынак. Ад яго я была ў сапраўдным захапленні. Мой клас

знаходзіўся аж на другім паверсе. Новая школа была пабудавана ля вялікай царквы. Пяцікупальная, адна на ўсю акругу, цяпер там знаходзіцца Свята-Мікольскі мужчынскі манастыр.

Канешне, праз незачыненыя дзверы мы зазіралі ўнутр, але заходзіць баяліся, бо ўсе былі піянерамі. Мама ж туды хадзіла рэгулярна, а штораніцу і штовечар я чула, як яна моліцца. Наш пакойчык быў маленечкі — ложак, табурэтка і тумбачка. Ад мамы я і вывучыла малітву «Ойча наш».

Добра запомніла свой першы Вялікдзень у новай школе. Класная кіраўніца загадала нам, пяцікласнікам, павязаць чырвоныя гальштукі і прыйсці на ўсяночную службу, каб паглядзець, хто з бацькоў там будзе, а потым расказаць ёй.

Нягледзячы на татальную антырэлігійную прапаганду, людзі працягвалі святкаваць царкоўныя святы. Асабліва Вялікдзень. Паскі пяклі амаль усе.

Царква была літаральна набітая людзьмі. Кожны з нас убачыў сваіх бацькоў і сваякоў, але дзецям было цікавей глядзець на тое, як праходзіць усяночная, чым за некім сачыць.

Да даносаў нас прывучалі з дзяцінства. У панядзелак мы вельмі хваляваліся, бо не ведалі, што трэба казаць, калі прагучыць адпаведнае пытанне. На шчасце, яно не прагучала. Урок нашай класнай кіраўніцы быў апошнім, але, да гонару настаўнікаў, ні яна, ні тыя, хто быў раней, ні адным словам не прыгадалі «загад».

Калі пазней перабралася ў Мінск, імкнулася патрапіць у якую-небудзь царкву, але баялася праблем на працы. Тым больш, што на тыя часы ў Мінску былі толькі два дзеючыя храмы. Але калі даводзілася выязджаць за межы рэспублікі, сітуацыя мянялася. Памятаю, як са знакамітай актрысай Машай Захарэвіч у савецкія часы ў Маскве нас разам пасялілі ў адзін нумар гасцініцы «Космас», што знаходзіцца на ВДНГ. Вокны былі зашторыя. Калі мы рассунулі шторы, то ўбачылі цэлы царкоўны комплекс. Чароўная прыгажосць!

Звычайна было так: раніцай прыязджаеш, вечарам — канцэрт, пасля яго — адразу на цягнік. Чыноўнікі ад культуры эканомілі кожную капейку. А тут раскоша — два дні ў Маскве. Тую царкву мы наведалі двойчы. Адзін раз — перад рэпетыцыяй, другі — перад самым ад'ездам, ужо з рэчамі. Жанчыны, якія сядзелі пры ўваходзе, прапанавалі пакінуць іх побач з імі. Маўляў, ніхто не возьме. Так і адбылося. Я яшчэ тады сказала Машы: «Як добра, калі цябе ніхто не ведае. Заходзіш — і можна нікога не баяцца...»

Толькі на пачатку дзевяностых гадоў я змагла спакойна прыходзіць у праваслаўны храм у Мінску. Якраз пачаліся набажэнствы ў Петрапаўлаўскім саборы. На маіх вачах ад службы да службы дэмантаваліся бетонныя перакрыцці, якія ў савецкі час падзялялі будынак храма на чатыры паверхі і як быццам засланялі ад нас неба. Сёння гэты выдатны велічны сабор радуе вернікаў беларускамоўнымі набажэнствамі, якія я люблю наведваць. Таксама люблю бываць на службах на беларускай мове ў храме Мінскай духоўнай акадэміі, дзе вучыцца мой малодшы сын.

* * *

Аднак вернемся ў Гомель. Пакойчык, у якім мы жылі, быў настолькі маленькі, што нам з мамай даводзілася спаць на адным ложку — «валетам». На тумбачцы стаяў невялікі радыёпрыёмнік. Звычайная радыёкропка. Мне надзвычай падабалася перадача «Тэатр ля мікрафона», якую перадавалі з Мінску. Калі першы раз пачула «Паўлінку», была ў захапленні. Мама сыходзіла на працу вельмі рана, падымалася ў шэсць гадзін раніцы. Я абяцала ёй, што буду слухаць ціха-ціха. «Тэатр ля мікрафона» заканчваўся роўна а дванаццатай ночы — пачыналі біць крамлёўскія куранты. Я нагой дацягвалася да радыё і выключала — там быў спецыяльны рычажок.

Заўсёды гэта атрымлівалася, але аднойчы радыё са страшэнным грукатам звалілася на падлогу. Маці ўскочыла з ложка. Прыёмнік зламаўся. Я заплакала. Мама зразумела, але нічога мне не сказала. Раніцай аднесла яго ў

майстэрню — і хутка ён зноў стаяў на тумбачцы, а я працягвала слухаць тэатральныя пастаноўкі.

Настаўнікі ў новай школе былі цудоўнымі ва ўсіх сэнсах. Фізкультуру вяла сапраўдная прыгажуня. Практыкаванні дзяўчатам і хлопчыкам яна звычайна давала розныя. У сёмым класе яна заўважыла, што некаторыя з дзяўчат пачынаюць сарамліва сутуліцца. Усё зразумела, хлопчыкаў адпусціла, а з дзяўчынкамі мела размову. Як кажуць, ад прыроды нікуды не падзенешся...

# Жыццёвы кірунак

Недзе ў сёмым класе на ўрокі літаратуры, на якіх дзеці звычайна на памяць чытаюць вершы, пачаў прыходзіць кіраўнік школьнага драматычнага гуртка. Ён адразу запрасіў мяне на рэпетыцыі. Памятаю, ставілі спектакль «Юбілей» паводле п'есы Чэхава, мне выпала галоўная роля — Таццяны Аляксееўны. Мама з гэтай нагоды дзесьці прыдбала прыгожую доўгую сукенку. Менавіта тады ўпершыню пачула апладысменты, адрасаваныя асабіста мне.

Да гэтага часу мянушка ў мяне была «Бандароўна», на якую я чамусьці крыўдзілася. Пасля той пастаноўкі яна змянілася на «Артыстку». Першай мяне так назвала настаўніца матэматыкі Ніна Барысаўна Цогліна.

Калі паглядзець мой атэстат сталасці, то там пяцёркі толькі па беларускай літаратуры і прыродазнаўстве. Па прадметах Ніны Барысаўны ў мяне заўсёды былі тройкі. Аднойчы на ўроку геаметрыі таемна чытала кніжку «Мая малодшая сястра» нейкага французскага аўтара. З кнігамі ў тыя пасляваенныя гады ўвогуле былі вялікія праблемы. Іх папросту не хапала. Я шмат чытала і дзеля гэтага пастаянна бегала ў бібліятэку Палаца чыгуначнікаў. Ніна Барысаўна забрала тую кніжку і расказала пра гэты выпадак у настаўніцкай. «Пакаранне» для мяне было знойдзена даволі арыгінальнае. Выкладчыца беларускай мовы і літаратуры сказала: «Хутка мы будзем праходзіць трылогію «На ростанях» Якуба Коласа. Раман толькі выйшаў, кнігу не даюць «на рукі», і прачытаць яе можна выключна ў чытальнай зале бібліятэкі. Не ўпэўнена, што гэта зробіць кожны з вучняў. Калі ты такая аматарка чытаць — прачытаеш трылогію, а потым будзеш пераказваць змест рамана ўсяму класу».

Амаль тыдзень пасля школы бегала ў бібліятэку — і да яе закрыцця чытала раман. А пераказы зместу кнігі ў класе сталі ў маім жыцці першымі публічнымі выступамі... Менавіта з гэтай прычыны Ніна Барысаўна і назвала мяне артысткай. Мы любілі Ніну Барысаўну. Нягледзячы на строгасць і прынцыповасць, яна была вельмі добрым і шчырым чалавекам. І жыла вельмі сціпла, у чым мы пераканаліся, калі прыйшлі да яе дадому віншаваць са святам 8 Сакавіка.

Добра памятаю 9 сакавіка 1953 года, дзень пахавання Сталіна. Першым урокам была матэматыка. Ніна Барысаўна падышла да акна, убачыла прыспушчаны чырвоны сцяг з жалобнай чорнай стужкай на будынку рабочага інтэрната — і пачала гучна рыдаць. Неўзабаве плакаў увесь клас, плакала ўся школа. І гэта не перабольшванне. Многім тады здавалася, што са смерцю Сталіна жыццё заканчваецца. Людзі не думалі, ды проста не ведалі пра тое, колькі гора і слёз пакінуў у краіне гэты чалавек.

Згадваецца таксама «школьная бульба», калі нас накіравалі на працу ў адзін з калгасаў Рагачоўскага раёна — як мы пяклі шарлотку, чым вельмі здзівілі мясцовых гаспадыняў, як беглі ўздоўж чыгуначнага палатна, калі работу закончылі на некалькі дзён раней, а аўтобус па нас прыязджаў толькі ў выходныя.

У Гомелі мы жылі на розных кватэрах, але адна запомнілася больш за ўсё — вуліца Дзяржынскага, 158. У гаспадыні гэтага дома было тры дачкі, усе дактары. Адна з іх выйшла замуж за Героя Савецкага Саюза. На ўсю зіму гаспадыня з'язджала ў Маскву да сваёй сярэдняй дачкі, аднак мы з мамай ніколі не жылі ўдвух. У гаспадыні быў трохпакаёвы дом. У адным пакойчыку жылі мы, адзін яна зачыняла для асабістых мэтаў, а ў трэці пускала яшчэ адных кватарантаў.

Менавіта ў ім і пасяліся маладая пара са сваёй мамай Марыяй Яфрэмаўнай, якія аказалі вялікі ўплыў на маё развіццё і на мой светапогляд.

Сям'я Шчагловых пераехала з Сярэдняй Азіі на працу

пасля заканчэння Ленінградскага электрамеханічнага інстытута. Мы адразу моцна пасябравалі. Я вельмі любіла цётку Таю і дзядзьку Толю. З імі было вельмі цікава. Яны столькі ўсяго распавядалі пра жыццё ў Сярэдняй Азіі. Часта прыязджалі іх родзічы з Кіргізіі, прывозілі самыя розныя няведамыя нам ўсходнія пачастункі. У маладосці Марыя Яфрэмаўна была сакратаркай у Міхаіла Фрунзэ, калі той служыў у Кіргізіі. Яна расказвала шмат цікавага пра наркама, а яшчэ пра тое, як пасля размеркавання яе дзяцей чытала ў старой энцыклапедыі інфармацыю пра беларускі горад Гомель. І дазналася, што большасць насельніцтва складаюць габрэі, і чамусьці перад пераездам у Гомель пачала баяцца такога асяроддзя. Да вайны так і было, але пасля яе ўсё істотна змянілася...

Увогуле ж на нацыянальную прыналежнасць у нас ніколі не звярталі ўвагі. У Гомель, дзе пасля вайны аднаўляліся заводы, будаваліся новыя прадпрыемствы, ехалі людзі з усяго Савецкага Саюза, у асноўным рускія. Напрыклад на адным «Гомсельмашы» працавала каля 20 тысяч чалавек.

* * *

Пасля апошняга званка ў восьмым класе мы гулялі ў парку Паскевічаў на беразе Сожа. Моцнае цячэнне, немалая шырыня ракі. Было даволі цёпла, і хтосьці прапанаваў пакупацца. З дзяўчат ні адна не адважылася. А за мяне гэта вырашылі нашы хлопцы-аднакласнікі. Яны проста падпіхнулі ў ваду. Даплыла да сярэдзіны ракі і адчула, што мяне прабралі дрыжыкі, вярнулася назад. Мусіць, гэтае купанне і стала прычынай таго, што я захварэла на плеўрыт. А неўзабаве быў пастаўлены іншы дыягназ — сухоты. У маім арганізме пасялілася палачка Коха — так мне растлумачыў тата. Для яго мая хвароба стала вялікім перажываннем: у галоўнага ўрача бальніцы для сухотнікаў дзіця хворае на сухоты! Перажывала і я. Праз кожныя чатыры гадзіны (навучыла другая жонка таты Кацярына Іванаўна) мне даводзілася рабіць самой сабе ўколы.

Лячэнне было вельмі сур'ёзным, мяне нават адправілі ў санаторый «Свяцк», які знаходзіўся недалёка ад Гародні. Зачараваная была тымі мясцінамі. Санаторый месціўся ў старым панскім маёнтку ў найпрыгожым парку. Увесь час ён мне нагадваў наш гомельскі палацава-паркавы ансамбль Паскевічаў.

Праз шмат гадоў, калі працавала на рэспубліканскім тэлебачанні, аднойчы зноў трапіла ў тыя мясціны. Пры нашым Дзяржкамітэце быў створаны секстэт домраў Заслужанага артыста БССР Леаніда Смялкоўскага, які ладзіў па ўсёй рэспубліцы канцэрты. Менавіта з гэтым калектывам я і прыехала. Ледзь пазнала ў занядбаным, абадраным будынку той шыкоўны дзіцячы санаторый...

Я лячылася і вучылася — і праз паўтара года (ці крыху раней) у мяне ўжо былі нармальныя аналізы.

У дзясятым класе я спадабалася настаўніку рускай мовы і літаратуры Эдуарду Яўгенавічу Лякерману. Паглядаў ён на мяне з асаблівай цеплынёй, на перапынках часта падыходзіў, задаваў пытанні, расказваў пра сябе, раіў абраць артыстычны кірунак, бо ў мяне ёсць сапраўдны талент. Дзяўчаты такую ўвагу адчуваюць адразу.

Эдуард Яўгенавіч быў сынам вядомага ўсяму Гомелю лекара-неўролага Лякермана, да якога мы з мамай раней хадзілі яшчэ з нагоды маіх частых галаўных боляў. Той паставіў правільны дыягназ і расказаў, як трэба за сабой сачыць.

У 1956 годзе скончыла школу. Паўстала пытанне, кім быць, якім жыццёвым шляхам крочыць далей. Раптам у дом, дзе мы з мамай жылі, завітаў Эдуард Яўгенавіч. Расказаў, што да яго прыехалі сябры з Кіева, людзі даволі ўплывовыя. На наступны дзень яны зайшлі да нас разам. Лякерман пазнаёміў са сваім сябрам, былым галоўным інжынерам ДнепраГЭС Баляславам Даніловічам і яго жонкай Лідзіяй Якаўлеўнай. Аказалася, ён ім расказаў пра мае артыстычныя поспехі і захапленні.

Яны параілі разам з імі ехаць у Кіеў, паступаць у тэатральны інстытут. Маўляў, зрабіць гэта ў Мінску будзе амаль

немагчыма, бо там не хапае месца нават для дзяцей артыстаў. З Кіева яны прыехалі на сваёй «Победе», справа была толькі ў дазволе маёй маці. Вагалася яна нядоўга, і ў той жа дзень мы выехалі.

Даніловічы жылі на Чырвонаармейскай вуліцы, зусім недалёка ад Майдана. Вялікая кватэра, прыгожая абстаноўка, вельмі ветлівая гаспадыня. На наступны вечар яны набылі квіткі ў цырк, на прадстаўленне знакамітай утаймавальніцы тыграў Ірыны Бугрымавай. Гэтага выступу я не магла дачакацца. І тут раптам прыходзіць тэлеграма з Гомеля ад Варвары Анісімаўны (у якой на той момант мы здымалі пакой): «Мама захварэла. Тэрмінова прыязджай!» Эдуард Яўгенавіч у хваробу не паверыў. Зразумеў, што заўважылі яго адносіны да мяне...

Перад ад’ездам мы паспелі схадзіць у тэатральны інстытут. Даніловіч нешта доўга высвятляў. Урэшце мяне чакала моцнае расчараванне. Яго «пратэжэ», то-бок мяне, пагаджаліся дапусціць да іспытаў, але не бачылі ў гэтым ніякага сэнсу — галоўнай умовай вучобы было свабоднае валоданне ўкраінскай мовай...

Увечары мяне адпраўлялі ў Гомель. На цыркавое прадстаўленне Ірыны Бугрымавай я так і не патрапіла. Эдуард Яўгенавіч выкупіў для мяне адной цэлае купэ, скрупулёзна перапісаў усе дадзеныя правадніцы і папрасіў яе ўважліва за мной сачыць. Зразумела, яму хацелася зрабіць так, каб потым не было ніякіх прэтэнзій, аднак усе хваляванні былі дарэмнымі — цягнік адыходзіў напалову пустым.

А мама мая была здаровая...

* * *

У Гомелі ў мяне, акрамя паступлення ў медвучэльню, выбару не было. Нягледзячы на вялікі конкурс, я паступіла без якіх-небудзь праблем. Шчыра кажучы, інакш і не магло быць, бо дырэктар гэтай установы сяброваў з маім бацькам...

Паралельна з вучобай запісалася ў тэатральную студыю пры гомельскім Палацы чыгуначнікаў імя Леніна. Менаві-

та там сустрэла чалавека, які цалкам змяніў мой далейшы жыццёвы шлях, — мастацкага кіраўніка драматычнай студыі, галоўнага рэжысёра Гомельскай тэлевізійнай студыі, Заслужанага дзеяча культуры БССР Сяргея Паўлавіча Астравумава. Менавіта ён першы заўважыў у мяне здольнасці тэлевядоўцы. Гэта дзякуючы найперш яму я стала той, кім стала.

Я займалася ў драматычнай студыі і працягвала вучыцца ў медвучэльні. Там дапамагала рыхтаваць радыёгазету, і многія мае сяброўкі казалі, што мой голас гучыць натуральна, пяшчотна, прыгожа.

Аднойчы ў так званым «чырвоным кутку» нашай вучэльні пачула з маленькага тэлевізара (ён меў назву «КВН»), што Гомельская студыя тэлебачання праводзіць конкурс дыктараў. Гэтай абвестцы я не надала асаблівага значэння. Увечары прыйшла на чарговую рэпетыцыю, і Сяргей Паўлавіч параіў прыняць удзел у конкурсе. Мае пярэчанні пра жаданне далей вучыцца ў медыцынскім інстытуце (маё здароўе не дазваляла мне іншага — парада таты) яго не пераканалі. Маўляў: адно другому не зашкодзіць, паспрабаваць трэба.

І я адважылася. Падрыхтавала расповед пра сябе на беларускай мове — гэта была ўмова конкурсу, а таксама ўрывак з «Княгіні Трубяцкой», першай часткі паэмы Някрасава «Рускія жанчыны», з якім раней перамагла ў абласным конкурсе чытальнікаў. Калідор Палаца чыгуначнікаў, дзе праходзіў конкурс, гуў як пчаліны рой. Людзей — мора. Сярод канкурсантаў было нямала маладых прыгожа апранутых жанчын (пераважна жонак ваенных). І гэта зразумела, бо ў ваколіцах Гомеля ў той час размяшчалася шмат вайсковых частак.

Я была апранутая ў цёмна-сінюю сукенку з белым каўнерыкам. Стаю ля акна, паўтараю тэкст. Раптам каля мяне прыпыняюцца дзве прыгожыя жанчыны, і чую: «Мой сусед Шпанаў, які працуе рэжысёрам на тэлебачанні, сказаў мне, што калі на конкурс прыйдзе Бандарэнка, то нам тут рабіць няма чаго. Праўда, яна збіраецца паступаць у

медыцынскі. Калі не перадумала, то ў нас ёсць шанец». Пачутае вельмі засмуціла. Падумала, што прыйдзе яшчэ нейкая Бандарэнка. Нават і думкі не ўзнікла, што гаворка ідзе пра мяне...

Урэшце я прайшла ўсе туры і перамагла. Заканчвала медыцынскую вучэльню і бегала на вячэрнія праграмы гомельскай студыі, таму што дыктар Валянціна Шышкова пайшла ў дэкрэтны адпачынак.

Абласное тэлебачанне таго часу вяло перадачы ўсяго каля трох гадзін, і праз мяне праходзіла ўсё: навіны, анонсы фільмаў, праграмы для дзяцей.

За першы месяц працы на студыі атрымала 1500 рублёў. Вядома, тагачаснымі грашыма. Калі прынесла заробак дадому, мама расплакалася: мы з ёй такіх грошай ніколі не бачылі.

Мой тата сачыў за маім лёсам вельмі ўважліва. Ён хацеў, каб пасля медвучэльні я паступала ў медінстытут, а калі даведаўся пра іншы выбар, быў катэгарычна супраць. Маўляў, чалавек павінен мець прафесію, якая можа ў любы час даць кавалак хлеба. Як яго ні пераконвала, ён усё роўна хацеў бачыць мяне доктарам. Пазней супакоіўся і ўжо ганарыўся мною. Доктарам, і вельмі вядомым, стала мая зводная сястра Наталля, якая і дагэтуль працуе ў той жа бальніцы для сухотнікаў, дзе наш тата быў галоўным урачом усё сваё жыццё.

* * *

Дарэчы, дзякуючы Сяргею Паўлавічу Астравумаву, я пазнаёмілася са сваім будучым мужам Генадзем Кап'ёвым.

На «Гомсельмашы» праходзіла нейкае заводскае свята, і Сяргей Паўлавіч Астравумаў сказаў, што нам выпала паказаць свой невялікі скетч «Бульба і каханне» (які мы раней паказвалі па Гомельскім тэлебачанні), дзе я выконвала галоўную ролю — прамаўляла, танчыла, спявала. Словам, лётала па сцэне.

Гена сядзеў у трэцім радзе і даволі эмацыйна рэагаваў на тое, што адбывалася на сцэне. Побач з ім выпадкова

аказаўся мой траюрадны брат Аляксей, сын той самай Мяланні Казіміраўны, якая калісьці нас з мамай у Гомелі і прытуліла. Аказалася, Аляксей збіраўся са мной ажаніцца. Гэта і стала прычынай іх спрэчкі. Генадзь не мог зразумець, як такое магчыма. А я нічога не ведала.

Калі скончыўся спектакль, Генадзь палічыў, што з-за прыхільнікаў да мяне не падступіцца, і падыходзіць не стаў. Ад Аляксея ён даведаўся, што я працую на тэлебачанні.

Інтэрнат, дзе жыў Генадзь, быў над гастраномам. Праз некалькі дзён ён зайшоў у гастраном штосьці купіць і ўбачыў дзяўчынку, якая не магла дацягнуцца да тэлефоннага апарата, каб пазваніць свайму бацьку. Гена дапамог ёй і даведаўся, што бацька дзяўчынкі працуе на Гомельскай студыі тэлебачання. Гэта быў наш інжынер Валодзя Новікаў. Валодзя пацвердзіў Генадзю маё месца працы і прапанаваў пазваць мяне да тэлефона, аднак Гена папрасіў гэтага не рабіць.

Лёс вырашыў так, каб наша сустрэча неўзабаве адбылася выпадкова.

Гена стаяў на прыпынку і чакаў аўтобус. І ў гэты момант падышла я. Ён убачыў мяне і адразу ўсміхнуўся. Але яго губы дрыжэлі і быццам пасінелі. Яшчэ тады падумала, што ніколі б з такім хлопцам не пацалавалася. Хаця выглядаў ён вельмі прывабна. У модным ясенінскім стылі. З залатым чубам, у добра адпрасаваных шакаладнага колеру штанах.

Гэта адбывалася бліжэй да вечара, і Генадзь запрасіў мяне ў кіно, сказаў, што будзе чакаць ля кінатэатра імя Калініна. Як толькі села ў аўтобус, адразу забылася і пра яго самога, і пра запрашэнне.

На той час мы з мамай жылі ў доме барачнага тыпу. У ім былі чатыры кватэры, у кожнай свой ганак. У адной з кватэр мы займалі пакой, які атрымала мама, калі пачала працаваць дэзінфектарам. Каля адзінаццаці вечара выйшла на наш ганак, і сутыкнулася на ім з Генам.

Аказалася, прачакаўшы каля кінатэатра некаторы час і зразумеўшы, што я не прыйду, ён звярнуўся па дапа-

могу ў адрасную даведку. З прапанавых пяці варыянтаў выбраў самы падыходзячы. З той кватэры мы ўжо з'ехалі, аднак Гена праявіў небывалыя ўпартасць ды настойлівасць і знайшоў мяне. Яго першым пытаннем было: «Чаму Вы не прыйшлі ў кіно?» Не памятаю, што тады адказала, але на наступны дзень мы сустрэліся зноў, і чымсьці ён мяне зацікавіў.

* * *

Трэба распавесці, што калі надышоў час майму брату Ігару служыць у арміі, мама пайшла да сваяка, памочніка ваенкама, і папрасіла, каб сына далёка не адсылалі. А тата, улічыўшы, што з Ігарам шмат клопатаў, папрасіў самога ваенкама, каб яго паслалі служыць як мага далей ад дому.

І вось з «татавага клопату» Ігар праслужыў тры гады на поўдні Грузіі, і толькі напрыканцы службы яго вайсковую часць перавялі бліжэй да Тбілісі, дзе быў завод танкавага ўзбраення. У Ігаравай часці гэтыя танкі потым выпрабоўвалі.

У Тбілісі Ігар пазнаёміўся з рускай дзяўчынай Надзеяй, якая неўзабаве стала яго жонкай, нарадзіла яму дзвюх дачок. Усё так добра пачыналася. Ігара вельмі любілі ў той сям'і. Чалавек ён быў таленавіты, добра граў на гармоніку, маляваў. Цешча Марыя Іванаўна адразу купіла піяніна. На слых Ігар падбіраў любую мелодыю.

Наша мама працавала на чыгунцы і мела права на бясплатны білет, а ў мяне падчас вучобы таксама былі льготы, таму мы з ёй даволі часта ездзілі ў Грузію. Паехалі туды і праз тыдзень пасля знаёмства з Генадзем. Цягам месяца ён пісаў кожны дзень.

У тым раёне Тбілісі жыло шмат курдаў. Тамтэйшая паштарка таксама была курдкай. Зычным голасам яна крычала на ўсю вуліцу: «Надзін, тваім сваякам ліст!» Канверты былі таўсценныя. Такіх прыгожых слоў мне ніхто раней не казаў. І самыя хвалюючыя для мяне словы: што сумуе і не можа дачакацца.

Па вяртанні мы сустракаліся зноў і зноў. І пасля, можа, двух тыдняў Гена прапанаваў выйсці за яго замуж. Выпадкова чарговая сустрэча адбылася каля будынку, дзе рэгіструюць шлюбы і дзе мяне добра ведалі. Нічога не тлумачачы, я папрасіла ў Гены пашпарт, зайшла ў ЗАГС і вярнулася з адпаведным штампам.

Калі праз паўгадзіны пасля афіцыйнай жаніцьбы мы расказалі пра гэта маёй маці, яна заплакала ад нечаканасці. Мама сказала мне тады: «Дай Бог, дачушка, каб ты не памылілася!» — «Не, матулечка, не памылілася», — адказала ёй тады, ды кажу і цяпер. І доказ гэтаму наша моцная, вялікая сям'я, традыцыі якой, я ўпэўнена, працягнуць нашы ўнукі.

Пасля слёз і абдымкаў, мы паехалі да Генавых бацькоў у Жлобін. Прыехалі апоўначы, усе ўжо ляглі спаць. І для іх наша навіна таксама была нечаканасцю.

Бацька Гены служыў у камендатуры вайсковых транспартных зносін (па-руску «ВОСО»), намеснікам вайсковага каменданта на чыгунцы. Яны жылі амаль ля самага чыгуначнага вакзала Жлобіна. Наша з'яўленне ў якасці мужа і жонкі было для бацькоў Генадзя сюрпрызам. Давялося паказваць пашпарты са штампамі.

А вяселле адбылося праз два месяцы — 8 верасня 1960 года ў Гомелі, у нашым адзіным, але даволі вялікім пакоі. Я запрасіла ўсіх супрацоўнікаў студыі. Прыйшоў галоўны канструктар «Гомсельмаша». Так пачалося наша сумеснае жыццё з Генадзем.

* * *

Як вядома, хвароба на сухоты пэўным чынам уплывае на стан жыцця. Рэнтгенаўскія здымкі мне рабілі даволі часта. І час ад часу яны паказвалі наяўнасць у лёгкіх так званых петрыфікатаў. Тата патлумачыў, што стрэптаміцын (тады гэта быў адзіны прэпарат, якім лячылі сухоты) у нейкім сэнсе падобны да цэменту — не дае хваробе прагрэсіраваць. Завапнаваныя праявы сухотаў і называюцца петрыфікатамі.

Мама тады рабіла мне лёгкія камізэлькі з воўны. А яшчэ перыядычна гатавала народныя лекі. Аднойчы гэта нечакана стала прычынай ледзь не скандалу. Маці прыгатавала знаёмыя тым, хто калісьці хварэў на сухоты, лекі: шакалад, мёд, алоэ, унутраны тлушч, які ў нас называўся здор. Сумесь застывала, і тры разы на дзень перад ежай я павінна была з'есці сталовую лыжку. Ужывалася гэта перыядычна: месяц-другі ясі, а потым — перапынак.

Перад вяселлем я моцна схуднела, праз год зацяжарала — і мама вырашыла зноў падтрымаць арганізм. Па савецкіх часах было распаўсюджанай справай, калі людзі мелі тое, што выраблялі на сваёй рабоце. У выпадку Гомеля — гэта шакалад фабрыкі «Спартак». Як цяпер гандлююць лялькамі ў Жлобіне, так раней у нас гандлявалі вакол цукеркавай фабрыкі. За 3 рублі можна было набыць даволі вялікі кавалак шакаладу.

Суседка працавала на «Спартаку», і па просьбе мамы прынесла шакалад. Калі Генадзь прыйшоў з працы, ён ўбачыў шакалад на стале. Даведаўшыся пра абставіны яго з'яўлення, пачаў раз'юшана крычаць: «Вы крадзеце ў дзяржавы! Разам з суседкай я вас пасаджу ў турму! І сам сяду!»

З неверагоднай цяжкасцю скандал спынілі, на што спатрэбілася нямала нерваў і часу. Калі прыехалі бацькі Гены, яны проста пасмяяліся.

Між іншым, тэлебачанне ў Гомелі арганізавалі крыху раней, чым у Мінску. Ужо ў 1955 годзе ў Гомелі пайшлі першыя пробныя перадачы, а ў Мінску яны адбыліся ў 1956-м. Калі дакладна — 1 студзеня 1956 года выйшла пробная перадача, якую вяла Тамара Паўлаўна Бастун.

У 1959 годзе, калі я скончыла медвучэльню, гомельскае тэлебачанне працавала ўжо на поўную моц — з тэлепраграмай, штатным раскладам і г.д. Нягледзячы на дыплом акушэра (тата настойваў, каб я яго атрымала), я ніводнага дня не адпрацавала ў гэтай сферы. Хаця адзін раз на практыцы нават паспела прыняць роды (у якасці асістэнта, зразумела).

Ніколі не забуду, як мы, дыктары, самі хадзілі ў Аблліт. Хто жыў у савецкія часы, добра ведае пра гэтыя цэнзарскія ўстановы. Наша была пры аблвыканкаме. Тэлестудыя спачатку была ў паддашкавым блоку Палаца імя Леніна, а потым для яе пабудавалі дом на вуліцы Пушкіна. Адтуль праз сквер да цэнзара мы і хадзілі. Спыняліся каля яго кабінета. Аддавалі яму тэчку, а потым сядзелі і чакалі, пакуль ён прачытае. На кожным лісце ён ставіў свой дазвол. Цікава, што праз шмат гадоў гэты цэнзар трапіў на прыём да маёй сястры Наталлі, якая лічылася адным з лепшых пульманолагаў Гомеля і спецыялізавалася на кардыялогіі. Ён эмацыйна ўзгадваў, як я прыходзіла да яго па дазвол, як даваў мне парады па рабоце на тэлебачанні і прадказваў вялікую будучыню.

* * *

Як я трапіла ў Мінск?

У тыя гады не было магутных рэтранслятараў. Гамяльчане не мелі магчымасці глядзець перадачы з нашай сталіцы. І мінчане наўпрост не маглі ўключыць абласныя цэнтры. А тут павінны былі адбыцца Дні Гомельскай вобласці. Дзеля гэтага мне з рэжысёрам неабходна было прыехаць у Мінск і праз рэспубліканскае тэлебачанне расказаць мінскім тэлегледачам пра ўсё добрае, што робіцца на Гомельшчыне. Пасля майго з'яўлення на сталічным тэлеканале на студыю паступіла шмат тэлефонных званкоў кіраўніцтву: тэлегледачы станоўча выказваліся менавіта пра вядучую дзён Гомельскай вобласці. Пра гэта я даведалася значна пазней, а тады мяне запрасіў на папярэднюю размову сам старшыня Дзяржкамітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні Васіль Пятровіч Несцяровіч, які сказаў, што я вельмі спадабалася мінскім гледачам, і прапанаваў пераехаць у Мінск. Аднак я была ўжо замужам і чакала дзіця. Вядома ж, прапанова аб пераездзе была прыемнай нечаканасцю, але, нягледзячы на тое, што цяжарнасць яшчэ была нябачнай, я пасаромелася сказаць праўду, і адмовілася. Сказала, што патрыётка свайго горада і буду раіцца з мужам.

Генадзь працаваў тады інжынерам-канструктарам у патэнтным бюро на «Гомсельмашы», што азначала бясконцыя камандзіроўкі. Трэба было высвятляць, запатэнтаваны іншым прадпрыемствам новы агрэгат камбайна альбо не. Да шлюбу ён жыў у заводскім інтэрнаце, а потым пераехаў да нас. І нам давялося жыць у адным пакоі камунальнай кватэры дома барачнага тыпу. Мама параіла для зручнасці перагарадзіць пакой фанерай.

Неўзабаве ў нас нарадзіўся сынок. Назвалі мы яго Сашачкам. Трэба было падумаць пра больш-менш зручнае жытло. Генадзю, хоць ён і лічыўся маладым спецыялістам, ніякай кватэры не абяцалі: з жыллём на заводзе былі вялікія цяжкасці. Па мамінай парадзе я пайшла да старшыні абласной тэлерадыёстудыі Фёдара Мікалаевіча Нікіфарава, аднак нічога суцяшальнага не пачула. Больш за тое, стала ясна, што чакаць сваё жыллё мне давядзецца не адзін год.

А вырашыў гэтую складаную кватэрную праблему муж. Ён часта ездзіў у Мінск. Аднаго разу зайшоў да Несцяровіча і расказаў, чаму я адмовілася пераязджаць у сталіцу. Старшыня камітэта сустрэў яго не вельмі ветліва, толькі запытаў, у якім я стане і ці ў форме. Генадзь распавёў яму. Несцяровіч сказаў, што я павінна прыехаць у Мінск і паказацца мастацкаму савету. Так я і зрабіла. І ў хуткім часе ўжо працавала на мінскім тэлебачанні.

Яшчэ мушу нагадаць, што ў Гомелі я завочна вучылася на беларускім аддзяленні філфака Гомельскага педагагічнага інстытута, куды паступіла адразу пасля медвучэльні. А па пераездзе перавялася на філалагічны факультэт БДУ. У мяне ўвогуле такое ўражанне, што ўсё жыццё я вучылася. Школа — медвучэльня — БДУ, шматлікія (два-тры тыдні альбо нават месяцы) дыктарскія семінары ў Маскве, дзе сачылі за гэтым надзвычай прынцыпова і пільна.

Літаральна з першых дзён работы на сталічным тэлебачанні пачалі прыходзіць лісты, у якіх гледачы шчыра віталі з'яўленне новага адметнага дыктара, але я ні на што апроч працы не звяртала ўвагі. Памятаю, на трэці дзень маёй

новай работы адбыўся даволі непрыемны для мяне выпадак. Пасля змены я выходзіла з будынку тэлебачання, каля дзвярэй сядзелі вартаўнікі ў валёнках і ватоўках. Яны глядзелі на мяне, калі казаць мякка, не вельмі прыязна. Аказалася, прычынай стала тэлеграма наступнага зместу: «Пакажы ім, як трэба працаваць!» Пад тэкстам не было подпісу, але я адразу зразумела, што яе прыслаў мой муж, які яшчэ заставаўся ў Гомелі. Ён доўга не прызнаваўся, але потым саступіў.

# Нечаканыя выпрабаванні

Пасля гэтай тэлеграмы пэўны час мне было вельмі няёмка перад калегамі. Асабліва перад ужо вядомымі дыктарамі, такімі, як Тамара Паўлаўна Бастун, Давенора Галкіна. Адчувала сябе крыху зацятай, бо звонку магло паказацца, што прыехала маладая зорка з Гомелю, якая лічыць сябе самай лепшай. Насамрэч, усё было зусім не так.

Хаця гомельская дыктарская школа, сапраўды, была для мяне даволі моцнай. За мной сачылі надзвычай уважліва. Кожны выхад у эфір рабіўся прадметам дэталёвага абмеркавання. Як ужо казала, згаданы Сяргей Паўлавіч Астравумаў, галоўны рэжысёр Гомельскага тэлебачання, уважліва адсочваў мае выступы, і калі нешта заўважаў, добразычліва звяртаў на гэта ўвагу. Ён быў маім настаўнікам і педагогам да самага пераезду ў Мінск. Больш за тое, калі потым прыязджала да маці ў Гомель, мы заўсёды сустракаліся з ім і падрабязна размаўлялі пра маю працу ў Мінску. Вельмі ўдзячная рэжысёрам студыі Сяргею Шпанаву і Савелію Замоўскаму.

Кожны, хто выходзіць на сцэну альбо ў эфір, павінен адчуваць, што за ім сочыць прафесіянал, які здольны даць правільную параду. Трэба ўмець самому знайсці такога чалавека. Дзякуй Богу, сярод блізкіх мне людзей (і ў Мінску, і ў Гомелі), заўсёды былі менавіта такія асобы. Шчырыя, з добразычлівымі намерамі.

На жаль, давялося сутыкнуцца і з іншым бокам гэтай з’явы. Аказалася, за ўсімі маімі эфірамі пільна сачыў чалавек, які і перавёў мяне на працу з Гомеля ў Мінск — кіраўнік Рэспубліканскага радыё і тэлебачання Васіль Пятровіч Несцяровіч. Якраз у гэты час у Мінску дабудавалі Дом радыё на Чырвонай, 4. Мы шчыра радаваліся. Умовы там былі

больш камфортнымі, напоўніцу працавалі малыя і вялікія студыі. Адна нават дазваляла размясціць цэлы аркестр, які быў самым прэстыжным у Беларусі, — Эстрадна-сімфанічны аркестр Беларускага радыё і тэлебачання пад кіраўніцтвам Заслужанага артыста БССР Барыса Райскага. Пачала з ім супрацоўнічаць і я, весці яго канцэрты.

Аднойчы ў дыктарскую пазваніў Несцяровіч (ён з усімі быў на «ты») і запрасіў мяне да сябе. Маўляў, трэба нешта абмеркаваць. Без якой-небудзь задняй думкі я накіравалася ў кабінет Васіля Пятровіча. Адзінае, што магло выклікаць пытанні, — насцярожана-ўважлівы погляд яго маладой і прыгожай сакратаркі. Перад гэтым (дзякуючы дапамозе Несцяровіча) мы атрымалі сваю першую кватэру — двухпакаёвую «хрушчоўку» на першым паверсе аднаго з дамоў на вуліцы Арлоўскай. А раней здымалі жытло ў прыватным сектары ля сучаснага Тэатра музкамедыі, якое па газетнай абвестцы знайшоў муж.

Дарэчы, уласную кватэру на Арлоўскай атрымалі не толькі мы. Да прыкладу, у нашым пад'ездзе на пятым паверсе жыў з сям'ёй вядомы журналіст і мастацтвазнаўца Эдуард Варашылаў, які прыйшоў на тэлебачанне з мастацкага музея і працаваў у якасці эксперта. Чалавек інтэлігенты, рэспектабельны, заўсёды добра апрануты. Шмат гадоў мы шчыра сябравалі. Сябруем з яго ўдавой Святланай і цяпер.

Несцяровіч пачаў размову менавіта з гэтага. Стаў цікавіцца абставінамі пераезду, а потым (як бы між іншым) спытаў пра мае адносіны з мужам, чым выклікаў непакой ужо ў мяне. Аказалася, ніякіх падстаў для падобных пытанняў няма, але сам факт узнікнення цікавасці крыху насцярожыў. І нездарма... Бо Васіль Пятровіч выказаў пажаданне мець з майго боку больш увагі да сябе і часам сустракацца. Тут усё стала зразумела. Адказала, што ў мяне шмат працы. Тут трэба адзначыць, што я сапраўды была цалкам занятая працай і абсалютна не цікавілася падзеямі ў так званым закуліссі. Але з гэтага моманту ўсё змянілася.

У дыктарскай працы ў тыя часы, акрамя частых аб'яў перад камерай, бывалі і даволі працяглыя паўзы. Несцяро-

віч пра іх добра ведаў. І пачаліся пастаянныя выклікі мяне ў кабінет Васіля Пятровіча ў Дом Радыё на Чырвоную, 4. Прычым тон значна змяніўся — калі першы раз ён мяне паклікаў, то цяпер гэта стала загадам. Кожны раз ён пытаўся пра магчымую «сустрэчу», і кожны раз я прыдумляла розныя прычыны, каб яна не адбылася. Я расказала пра гэта сваёй свякрусе, якая на той час ужо жыла з намі. Ніна Пятроўна была вельмі прыгожай жанчынай, таму сама не раз сутыкалася з падобнаю з'явай. Параіла трымацца.

Якраз у той момант Цэнтральнае (маскоўскае) тэлебачанне ладзіла вялікую паездку ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку. Паездка была вельмі цікавая. А літаральна на наступны дзень пасля вяртання мяне раптам запрасіў да сябе намеснік дырэктара тэлестудыі Канстанцін Пятровіч Пятніцкі і паведаміў, што мяне выклікаюць у Савецкі райкам партыі. Мяне там нехта будзе чакаць. У мяне было некалькі версій і здагадак. Была нават думка пра тое, што могуць прапанаваць стаць камуністкай. На той момант для абсалютнай большасці людзей гэта была звычайная рэч. І вельмі пачэсная.

Савецкі райкам КПБ знаходзіўся каля тагачаснай «Ленінкі», то-бок Нацыянальнай бібліятэкі. Прыёмная была на другім паверсе. Я прыйшла, калі там яшчэ нікога не было. Мне параілі пачакаць. Маўляў, «па вас зараз прыйдуць». І сапраўды, хутка прыйшла жанчына ды загадала ісці з ёй. Я не ведала, куды яна мяне павядзе. Мы перайшлі дарогу і накіраваліся ў будынак ЦК КПБ. На ўваходзе яна нешта сказала міліцыянту. На ліфце падняліся на чацвёрты паверх. Падышлі да 406-га кабінета. Яна зазірнула туды, зноў нешта сказала — і прапанавала мне ўвайсці. За сталом сядзеў мужчына ў шэрым пінжаку. Мужчына суха павітаўся, аднак з крэсла не ўстаў. У гэтым адчула для сябе нядобры знак. Ён прапанаваў сесці і задаў першае пытанне: «Як Вы ставіцеся да Несцяровіча?» Без імя і імя па бацьку. Я адразу вымавіла тое, што ў нашым атачэнні казалі ўсе: «Вельмі добра. Ён жа столькі робіць для тэлебачання! Ён пабудаваў Дом Радыё...»

Мужчына ў шэрым пінжаку, які ўвесь час імкнуўся глядзець уніз, перапыніў мяне сухім металічным голасам: «Не он, а Центральный Комитет Коммунистической партии». Адразу змоўкла, а ён працягваў: «Через три дня он будет снят с работы. Мы знаем, что он склонял Вас к особым отношениям. И мы знаем, что Вы не дали согласия».

Я такога не чакала. Ад хвалявання задрыжэлі вусны. Ён падышоў да сейфа, адчыніў, дастаў блакітную тэчку і дадаў: «Мы это знаем точно. Все разговоры с дикторской у нас записаны. Вот, например.

25 апреля. Звонок Нестеровича:

— Чем ты сегодня занимаешься?

Ваш ответ:

— А у меня сегодня день рождения.

— Так, может, пригласишь?

— Конечно, Василий Петрович. Мы Вас приглашаем.

— А как на это посмотрит твой муж?

— Он будет очень рад.

Мы знаем, что Нестеровича на вашем дне рождения не было.

А вот другой эпизод.

Во время вашего дежурства, после его звонка в дикторскую вы идете по коридору. Навстречу Вам идет один товарищ, которому мы очень верим.

Вопрос:

— Куда ты идешь?

Ваш ответ:

— Василий Петрович вызывает».

І тут мяне быццам бы халодным потам прабіла. Я ўспомніла тую сустрэчу. Размаўляла тады з Інгай Алфімавай, якая была рэдактарам нашага выпуску. Аказваецца, за мной пільна сачылі.

«На вопрос: "Опять?" — вы ответили: "Опять. Как я устала, но я все равно не сдамся"».

Падумалася, калі яны ўсё ведаюць, дык што ж хочуць ад мяне? Ён быццам бы прачытаў мае думкі і працягнуў: «Нестерович снял квартиру, куда собирались женщины для

ночных времяпровождений, и мы, зная, что Вы поступили честно, хотим быть в курсе, кто ему все-таки уступил, ведь женщин на телевидении работает много?»

Як ужо было сказана, я зусім не цікавілася, што адбываецца навокал. Тэлесуфлёраў не было, таму кожны свой тэкст завучвала на памяць. Папросту — зубрыла. Усё было залітавана цэнзарам, і нават на адно слова нельга было памыліцца. Асабліва ў тэлеперадачы палітычнай накіраванасці. Пра гэта і сказала чалавеку ў шэрым пінжаку. І не назвала ніводнага прозвішча.

Для КДБ я была абсалютна не цікавай, не карыснай крыніцай інфармацыі. І дзякуй Богу... Ён папярэдзіў, што пра нашу размову ніхто не павінен ведаць, і, калі я пра яе некаму раскажу (я адчула метал у голасе і пагрозу), аб гэтым адразу будзе вядома ў КДБ. Так мы і развіталіся. Калі ўжо падыходзіла да дзвярэй, раптам пачула пытанне: «А чаму ў Вашага мужа не ўзнікла жаданне даць яму па мордзе?» Я не знайшлася, што адказаць, і выйшла. Магчыма, ён чамусьці хацеў мяне справакаваць. Яго твар я забылася, як толькі сышла адтуль — напэўна, гэта нешта прафесійнае ў такіх людзей.

Добра, што не трэба было ісці на працу. Дома расплакалася і пра ўсё яшчэ раз расказала сваёй свякрусе. Тая ў адказ: «Дурніца, вельмі добра, што ўсё атрымалася менавіта так». Успомніла шмат падобных выпадкаў са свайго жыцця, калі прыходзілася абараняць не толькі свой гонар, але і кар'еру мужа. На жаль, такія сітуацыі заўсёды былі і будуць. Свякруха параіла нічога не казаць мужу. Маўляў, ён у нас чалавек эмацыйны. Можа ўтварыць нешта кшталту скандалу. Напэўна, гэтая парада была разумнай, але я не вытрымала, і ў той жа вечар пра ўсё расказала Генадзю. На здзіўленне, ён успрыняў непрыемную інфармацыю даволі спакойна. Параіўся толькі з нашым сябрам Юзікам Хайратовічам, які быў кандыдатам гістарычных навук, працаваў у Інстытуце марксізму-ленінізму пры ЦК КПБ і добра ведаў тамтэйшыя парадкі. Юзік прапанаваў нічога не рабіць, а пачакаць, якім будзе развіццё падзеяў. Сапраўды, Несця-

ровіча праз тры дні звольнілі з працы. Без тлумачэння якіх-небудзь прычын. На гэтым усё і скончылася.

Некалькі гадоў таму мне прапанавалі падлячыцца ў адным санаторыі-прафілакторыі. На нейкай медыцынскай працэдуры выпадкова сустрэла тую самую жанчыну, якая некалі вадзіла мяне ў ЦК КПБ, і спытала яе, з кім я тады размаўляла. Аказалася, мяне выклікаў на гутарку Мікалай Фёдаравіч Цішчанка, асабіст, якога кэдэбэшная кар'ера з Расіі закінула ў Беларусь. У ЦК яго не вельмі паважалі — ганарлівы, напышлівы чалавек.

Па накірунку сваёй працы мы ведалі «куратараў» КДБ у твар. На гэтую тэму згадваецца першамайская дэманстрацыя на Кастрычніцкай плошчы. Мы з маім калегам Уладзімірам Шаліхіным павінны былі весці рэпартаж. Ужо стаім на рэпарцёрскай пляцоўцы. Перад самай трансляцыяй раптам чую: «Зіна, Зіна!» Бачу — мастацкі кіраўнік аркестра народных інструментаў імя Жыновіча, Народны артыст БССР Міхаіл Антонавіч Казінец. Яго не прапускаюць на гасцявую трыбуну — пропуск мае, а пашпарт забыўся дома. Трэба спраўдзіць яго асобу. Я хуценька спускаюся і важна кажу маладзенькаму ахоўніку, хто гэта такі, і прыгадваю ўсе рэгаліі Казінца. А ён, гледзячы на мяне, адказвае: «А я вас не ведаю». А на грудзях у мяне імянны пропуск з надпісам «Прэса». У гэты момант падыходзіць самы галоўны «куратар» і кажа: «Сваіх герояў трэба ведаць у твар!»

Словам, за сваімі спінамі подых спецслужбаў мы адчувалі заўсёды.

* * *

Пасля Несцяровіча кіраваць Рэспубліканскім радыё і тэлебачаннем прызначылі Вячаслава Пятровіча Палескага (псеўданім Вячаслава Пятровіча Станкевіча). Гэта быў драматург, адукаваны, нацыянальна арыентаваны чалавек. Родам з Гомельшчыны, з вёскі Астрагляды Брагінскага раёна. Размаўляў ён выключна на беларускай мове.

У канцы сямідзесятых мы ездзілі ў родныя для Вячаслава Пятровіча Палескага мясціны. На жаль, яго самога тады

ўжо не было з намі. Вельмі запамінальная паездка. Глухое Палессе. Больш за чатырыста кіламетраў ад Мінска. Вялікі і цалкам не прыстасаваны для такіх паездак аўтобус «ЛАЗ». Нас было каля шасцідзесяці чалавек, аркестр нашага радыё і тэлебачання, якім тады кіраваў Барыс Іпалітавіч Райскі. Дарога далася вельмі цяжка. Даехалі галодныя, стомленыя. Канцэрт пачынаўся пасля дзесяці вечара. Звычайная практыка, бо ў гаспадарках працавалі дацямна, і толькі потым прымалі артыстаў.

З намі была ўжо добра вядомая салістка нашага аркестра Тамара Раеўская — яе любілі ўсе. Цудоўны голас, спявала ўсёй душой. Цяпер такое бывае вельмі рэдка. Памятаю, ужо было за поўнач. Тамара праспявала адну песню, другую, трэцюю, чацвёртую... А гледачы ўсё выклікаюць «на біс». Яна на сцэне выдыхнула, што стамілася. І тут у поўнай цішыні пачуўся голас нейкай бабулі: «Дзіцятка маё, ты стамілася спяваючы? А я сёння столькі кароў выдаіла...» Смех і апладысменты... Тамара Раеўская спявала яшчэ доўга.

Пасля канцэрта была смачная вячэра, якая зацягнулася амаль да раніцы, а потым нас «разабралі па хатах». Мяне з салісткай радыё Ганнай Стрыжаковай запрасіў да сябе завуч мясцовай сярэдняй школы.

У дом завуча мы патрапілі толькі пад раніцу. Гаспадыня не дачакалася і легла спаць. Мы чулі, як яна шэптам выказвала прэтэнзіі да мужа. А на яго словы: «Я ж прывёў да цябе саму Зіну Бандарэнка», прагучала гнеўнае: «Ды пайшоў ты на ... са сваёй Зінай Бандарэнка!» Ганна хацела адразу сысці, аднак я прапанавала паспаць, бо ісці ў такі час нам не было куды.

Прачнуліся ад паху ежы. Гаспадыня ўжо напякла аладак, а на пліце шкварчэла яечня. За сняданкам яна папрасіла прабачэння і са слязьмі расказала пра свой боль: «Ну гэта ж няма моцы. Мужык п'е і п'е. Ён жа завуч, у школе працуе. Кожны дзень скандалы».

Раніцай нас запрасілі па грыбы. Такой колькасці баравікоў не бачыла ніколі. Праўду кажуць — хоць касой касі. Там упершыню збірала сапраўдныя баравікі — з белымі,

цёмна-вішнёвымі і жоўценькімі капялюшыкамі. А куды збіраць?! Хлопцы з аркестра збіралі ў свае модныя тады балоневыя плашчы. І нават у завязаныя на вузлы калашыны штаноў.

З болем успамінаю тую паездку. Цяпер тыя прыгожыя мясціны накрыў Чарнобыль...

Шмат вельмі цікавых падарожжаў было ў нас. Звычайна, зраблю аб'яву на сцэне — і за кулісамі слухаю цудоўныя галасы спевакоў: Якаў Навуменка, Юра Смірноў, Толечка Падгайскі, Валера Кучынскі, светлая ім памяць, Тамара Раеўская, Тамара Пячынская... Бывала, нават мікрафоны не трэба было ім ставіць, такія маленькія былі залы...



**Мае тата і матуля: Аляксандр Парфіравіч Бандарэнка
і Марыя Піліпаўна Клімовіч. 1929 г.**



**Маленькі Ігар. 1939 г.**

**Мне адзін годзік.**





**Другі клас** *(трэцяя злева ў ніжнім шэрагу)*. **1948 г.**



**Чацвёрты клас «Г»** *(крайняя справа ў другім шэрагу)*. **1950 г.**



З матуляй. 1950 г.



З маёй стрыечнай сястрой Ганначкай. 1953 г.



З матуляй. 1955 г.





Тбілісі. З Ігарам
і яго жонкай Надзеяй. 1957 г.

Санаторый «Свяцк»
на Гродзеншчыне. 1957 г.



У нас гасцюе дзядзечка Мікалай. 1956 г.



**У дзявятым класе «А» сярэдняй школы № 34**
*(другая справа ў першым шэрагу)*. **1955 г.**



**На практыцы ў паліклініцы** *(у цэнтры, над малым)*. **1958 г.**




**Я ў ліку студэнтак медвучэльні. 1957 г.**



**На суботніку.**



На рэпетыцыі драматычнай студыі. 1959 г.



У нас на ўваходзінах сям'я Шчагловых і суседзі. 1958 г.



Гомель. З маімі калегамі: Валянцінай Шышковай і Маяй Мярзляк.



Мая першая навагодняя перадача. Гомель. 31 снежня 1959 г.



Разам з Іванам Тарасюком і Валянцінай Шышковай прадстаўлялі ў Мінску Гомельскую вобласць.



Мае першыя крокі на тэлебачанні. Гомель. 1959 г.



**Я ў Мінску на вучобе** *(трэцяя злева ў другім шэрагу)*.
**Рэспубліканскі семінар праводзіў дыктар Усесаюзнага радыё Эмануіл Тобіяш** *(трэці злева ў першым шэрагу)*. **1959 г.**



**Госці з Мінска: Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, Народны артыст БССР кампазітар Юрый Семяняка, музыказнаўца Ізідар Нісневіч і Народны артыст БССР оперны спявак Віктар Чарнабаеў. 1959 г.**




**З Вадзімам Гесем. Перадача да дня Канстытуцыі СССР. 1959 г.**



**Пасля вяселля выйшлі на жыццёвы старт.**
**Крым. Сімеіз. 1960 г.**



**Генадзь ляціць да мяне.**



**На нашым вяселлі. 8 верасня 1960 г.**



**Другі дзень вяселля.**



Рыхтуемся
стаць
бацькамі.
Жлобін.



Наш першынец Саша. Гомель.



З Сашанькам. Мінск.



Генадзь
з сынам Сашам.
Сімеіз.



Зноў у Сімеізе. З бабуляй мужа Надзеяй, якая заўсёды нас прымала. 1961 г.



Толькі частка сваякоў, якія гасцявалі ў крымскім Сімеізе ў бабулі Надзеі: мы, цётка Ганна з бабуляй, родзічы з Казані і Літвы.



Велізарная колькасць адпачывальнікаў у Сімеізе. Мы — з маленькім Сашам. 1968 г.



На галоўным бульвары Сімеіза.



Са свёкрам Мікалаем Пятровічам у Сімеізе.

# Шлях да прызнання

Калі пачала працаваць на тэлебачанні ў Мінску, адразу стала вядучай многіх праграм рознага кірунку. Аднойчы ў перадачы для моладзі прымала ўдзел паэтка-пачатковец Святлана Каробкіна. На развітанне яна падаравала мне верш і не пакінула свайго адрасу. Хоць з таго часу прайшло амаль паўстагоддзя, я бязмежна ўдзячная той дзяўчыне. Часта прыгадваю верш, як быццам бы напісаны пра мяне.

*Быць добраю вучуся ў людзей,*
*Быць шчодраю ў сонейка вучуся,*
*Каб летуценням мар маіх, надзей*
*Мне зноў ісці па сцежках Беларусі.*

*Быць шчыраю і вартаю заўжды*
*Мяне з дзяцінства навучыла маці.*
*Руплівай, як прайшоўшыя гады,*
*Што спадчынай пакінуты ў хаце.*

*Я сквапнаю ніколі не была,*
*І не шкадую сэрца добрым людзям.*
*Мая сцяжынка роўна пралягла,*
*І праз жыццё такою ж роўнай будзе.*

Кожны год цэнтральнае тэлебачанне рыхтавала спецыяльную перадачу да Дня савецкай Канстытуцыі, які адзначаўся 5 снежня. Ужо ў верасні ў Маскву запрашалі дыктараў усіх пятнаццаці рэспублік СССР. Мяне там добра ведалі, таму іншых варыянтаў адносна таго, хто будзе весці праграму ад Беларусі, яны нават не разглядалі. Прыходзіў тэлетайп з просьбай накіраваць Зінаіду Бандарэнка на запіс урачыстай праграмы.

У 1979 годзе здымкі праходзілі ўжо ў Астанкіна, у вялікай студыі. На экран выводзіліся цітры: «Широка страна моя родная». Кожнаму з нас раздавалі па сцэнары, кожнаму быў прапанаваны верш нацыянальнага паэта яго краіны ў перакладзе на рускую мову. Мне выпаў верш Пятруся Броўкі ў перакладзе Якава Хелемскага. Калі сказаць вельмі мякка, была не ў захапленні ад таго, што трэба было агучыць...

Думка ўнесці пэўныя карэктывы ўзнікла адразу, але сапраўдным штуршком да такога ўчынку стаў прыклад вядомай эстонскай артысткі, дыктара Аліс Тальвік. У яе сцэнары былі такія радкі:

*Страна моих отцов, эстонская земля!*
*Всё больше я люблю твои леса, поля,*
*В напевах золотых звучанье слов родимых.*
*И в грозных бурях ты стоишь непобедимо,*
*Эстония — советская земля!*

На першым тракце яна прачытала, як было напісана, а на другім — апошні радок прагучаў так: «Эстония — моя земля!» Ніхто гэтага спачатку не заўважыў.

Запіс працягваўся дзён дзесяць. Тлумачыўся такі працяглы тэрмін агульнай работы даволі проста. Вядучым быў абаяльны дыктар ЦТ Юрый Кавеленаў, які ніяк не мог запомніць прозвішчы 15-ці дыктараў: Рано Талібава, Вінертэ Зайга, Розэ Рыскельдзінава, Кетэно Сакарыядзэ, Агульдзінара Ніязбердзінава, і гэтак далей. І Юра зноў і зноў памыляўся. А тэлесуфлёраў тады не было.

Гэта цяпер мы добра ведаем, што такое мантаж і «рэдактарскія нажніцы», што з усяго запісу можна ўзяць самае неабходнае. А першыя запісы мала чым адрозніваліся ад прамога эфіру. Таму і было патрачана аж 10 дзён. І калі нехта з 15-ці дыктараў дапускаў памылку, прыходзілася пераздымаць ледзьве не ўсю праграму.

Вядома, «памылку» эстонкі таксама заўважылі. Музычны рэдактар нашай праграмы Нона Данілаўна Насілоўская з апаратнай па гучнай сувязі гаворыць: «Алис, это не "твоя

зямля", а "советская земля"». Тая ў адказ: «О, да-да. Хорошо. Хорошо. Скажу, как нужно!»

Але і надалей яна перыядычна працягвала «блытаць» і на апошнім запісе зноў прагучала: «Эстония — моя земля!» Ды яшчэ з такім пафасам і гонарам, які заўсёды ўласцівы жыхарам Прыбалтыкі! Так і пайшло ў эфір.

Я ж зубрыла рускі пераклад верша Пятруся Броўкі:

*Земля Беларуси — леса и дубравы*
*Да шелковый клевера в поле платок,*
*Ручья разговор неумолчный, лукавый.*
*По веткам рябины — закат величавый,*
*Шуршащие ленты шуршащих дорог...*

Мне падалося, што ў рускім варыянце верша словы не надта адпавядалі сутнасці нашай прыроды і нашага жыцця. Перад самай здачай праграмы я асмелілася прапанаваць Ноне Данілаўне замяніць гэты верш іншым. Маўляў, ён у мяне ёсць, але напісаны па-беларуску. Спачатку яна адмаўляла, аргументуючы тым, што ніхто не зразумее беларускай мовы. Я адказала, што яна нават не ўяўляе, якія там прыгожыя і зразумелыя словы. Нона Данілаўна нечакана пагадзілася паслухаць. Пры гэтым папярэдзіла, што, калі тэкст не будзе зразумелым, мне давядзецца чытаць пераклад верша Пятруся Броўкі.

У тыя часы ў нас у філармоніі працавала літаратурным рэдактарам паэтка, светлая ёй памяць, Анэля Тулупава. Амаль на ўсе канцэрты яна рабіла мне, як мы кажам, цудоўныя падводачкі, то-бок у вершаванай форме дапамагала прадставіць наступны канцэртны нумар. На гледачоў яны псіхалагічна ўплывалі моцна. Людзі, так бы мовіць, ужо ўспрымалі выступ па іншаму. І я тады прачытала:

*Беларусь мая, маці ласкавая,*
*Сінявокая азярніца,*
*Дай да рук тваіх прытуліцца,*
*Да тваіх ласкавых далоняў.*

*Ці ж маглі яны быць у палоне,*
*У няволі, за кратамі,*
*Гэтыя рукі твае крылатыя,*
*Гэтыя вочы празрыстыя?*
*Дык глядзіце ж у іх, глядзіце —*
*У іх столькі цяпла і волі,*
*Яны столькі шчырасці гушкаюць,*
*Што ніхто, нідзе і ніколі*
*Іх святла не парушыць!..*
*Беларусь мая сінявокая,*
*Васілёчак мой дарагі,*
*Узляцела ты ясным сокалам,*
*Над табою ляцяць сцягі!*

Нона Данілаўна паслухала верш і спытала, дзе я яго чытала? Адказала, што ў Мінскім Палацы спорту на імпрэзе з нагоды 90-годдзя Уладзіміра Ільіча Леніна. Так яно і было. Апошні радок верша гучаў як плакатны заклік, таму гэты верш я часта чытала на розных партыйных урачыстасцях.

На запісе ў Астанкіна пасля майго чытання верша павінна была выступаць вядомая салістка Беларускай оперы, Народная артыстка СССР Святлана Данілюк з песняй Юрыя Семянякі на верш Уладзіміра Карызны «Люблю цябе, Белая Русь».

Дарэчы, першай выканаўцай гэтай песні была Заслужаная артыстка БССР Тамара Раеўская. Можна сказаць, што гэтая песня была напісана менавіта для яе. І яна, на мой погляд, была лепшай выканаўцай. Па беларускім радыё песня гучала штодзень і па некалькі разоў. Валодзя Карызна распавядаў, што пры нечаканай сустрэчы пасля аднаго ўрадавага канцэрта Пётр Міронавіч Машэраў пацiснуў паэту руку і сказаў, што гэта яго любімая песня.

Але вернемся да запісу ў Астанкіна. Зразумела, што апошні радок верша Анэлі Тулупавай трэба было крыху змяніць. Замест «Над табою ляцяць сцягі», я прачытала: «Над табою песня ляціць». Усё так добра лягло, што Нона Данілаўна мне сказала: «Слушай, так понравилось, что вся

апаратная рыдала. Давай — читай!» Гэта і пайшло ў эфір. Адзінае — папрасіла не аб'яўляць назву песні, бо Масква яе не прымала. Доўгі час назву песні «Люблю цябе, Белая Русь» не аб'яўлялі наогул.

Нягледзячы на тое, што ўсё спадабалася і тэлегледачам, Насілоўская атрымала вымову. Маўляў, усе чыталі на рускай мове, а я адна на беларускай.

Прыгадаю адзін расповед Лілі Давідовіч, светлая памяць гэтай цудоўнай актрысе. Тэатр імя Янкі Купалы, дзе яна працавала, вярнуўся з гастроляў у Злучаных Штатах Амерыкі. Пасля спектакляў яны там часта сустракаліся з тымі, каго лёс закінуў далёка за межы радзімы — тамтэйшай беларускай дыяспарай. І акцёры падчас нефармальных размоў пераходзілі на звыклую для Мінска рускую мову. Гэта выклікала ў беларусаў Амерыкі літаральна абурэнне: «Пакуль вы не пяройдзеце на беларускую мову, мы ніколі не паверым, што вы — беларусы. Няўжо ў Беларусі наогул няма сваёй мовы?»

Да сказанага дадам толькі, што тэатр імя Янкі Купалы заўсёды лічыўся культавым у справе нашага нацыянальнага адраджэння.

У жыцці бываюць сітуацыі, якія самі падштурхоўваюць цябе да нейкага кроку. Напэўна, калі б не было таго запісу, магла б і не абраць беларушчыну. Я ж па характару даволі настойлівы чалавек. Была ідэйнай камсамолкай, потым камуністкай. І вось цяпер адбыўся адзін з першых крокаў на маім «шляху да Беларусі», як трапна напісаў пра шлях беларусаў наш Народны паэт Ніл Сымонавіч Гілевіч. Савецкі патрыятызм саступаў месца нацыянальнаму.

Менавіта тады ў маёй самасвядомасці адбылася яшчэ адна змена жыццёвых арыенціраў. На многія рэчы я стала глядзець па-новаму. Вельмі добра, што ў той момант кардынальную трансфармацыю майго светапогляду падтрымаў і муж Генадзь Мікалаевіч. Хаця для яго гэта было надзвычай няпроста. Як аднаму з кіраўнікоў Вышэйшай партыйнай школы, яму заўсёды давалі пуцёўкі ў самыя элітныя санаторыі Савецкага Саюза — Есентукі, Кіславодск,

Сочы. Калі ў 1980 годзе трагічна загінуў Пётр Міронавіч Машэраў, мы былі ў Есентуках. Выразала з газеты фота з жалобнай чорнай стужкай і паставіла ў нашым пакоі. Да нас падыходзіла шмат людзей са спачуваннямі, шмат хто казаў, што гэта смерць была невыпадковай, бо Машэраў з'яўляўся прэтэндэнтам на месца нямоглага Брэжнева. І склалася ўражанне што на Машэрава, на Беларусь была надзея на змены у «вялікім і непарушным» СССР.

А ў тэмы таго лёсавызначальнага запісу быў нечаканы працяг.

Калі на наступны год мяне запрасілі зноў, Нона Данілаўна Насілоўская сустрэла словамі: «Конечно, ты смотрелась лучше всех, но мне не только объявили выговор, а лишили премии и вообще хотели уволить с работы. Спрашивали, почему ваша республика отличается от всех остальных? Теперь будешь читать то, что дадут, и только на русском языке. Лучше всего — прошлогодний перевод стихотворения Петруся Бровки».

Як ужо было сказана, пераклад быў мне не да сэрца. На той момант я ўжо была Заслужанай артысткай БССР і жыла не з усімі ў інтэрнаце, а ў беларускім гандлёвым прадстаўніцтве, дзе мне выдзялялі асобны пакойчык. «Мабільнікаў» тады не было. Купіла талончык і тэлефаную ў Мінск Анэлі Тулупавай. Муж адказаў, што яна цяпер у Маскве, у літінстытуце, які ў розныя часы прайшлі Леанід Дранько-Майсюк, Уладзімір Някляеў і шмат хто яшчэ з нашых паэтаў.

Тэлефаную туды і без праблем трапляю на Анэлю. Распавяла ёй пра жорсткае патрабаванне адносна рускай мовы. Яна цяжка ўздыхнула, прапанавала хоць канцоўку зрабіць на беларускай, спытала, хто будзе выступаць пасля мяне і як хутка патрэбен тэкст? Я адказала, што ансамбль народнай музыкі «Свята» і што ў нас ёсць час толькі да раніцы. У адказ прагучала: «Добра, пасяджу ноч».

Раніцай яна мне прадыктавала:

*Над тропинкой васильками вышитой*
*Солнце красной ягодой алеет.*

*«Белоруссия!» — и сразу вы услышите*
*Жаворонка звонкую жалейку.*
*Ясный день — над полем, над борами,*
*Солнца луч купается в воде.*
*Называем мы друзей своих «сябрами»,*
*Говорим мы всем при встречах: «Добры дзень!*
*Добры дзень вам, людзі! Шчасця ў хату!*
*Калі ласка, запрашаем вас на СВЯТА!»*

І ў нацыянальных строях і вышыванках пад гуллівую музыку выходзяць артысты.

Рускі пераклад верша Пятруся Броўкі я так і не прачытала. Калі мы сустракаліся з Петрусём Іванавічам у час адпачынку ў санаторыі «Сосны» на беразе возера Нарач, мы не раз размаўлялі. Але ў мяне не хапіла смеласці расказаць непрыемны, як мне тады здавалася, для паэта выпадак.

Дарэчы, санаторый «Сосны» на беразе Нарачы — самае любімае места адпачынку для ўсёй нашай сям'і. Як часта ўспамінаю тыя прыгожыя казачныя мясціны. А колькі добрых і цікавых людзей там сустрэла. Можа гадоў пятнаццаць запар кожную восень у самы грыбны сезон мы з мужам адпачывалі там. Вельмі любілі збіраць грыбы. Разбяжымся ў розныя бакі, а пасля, ужо з поўнымі кошыкамі, сустракаемся. Аднойчы бягу па белым імху сасновага дробналесся, і бачу здалёк, як па паляне прабіраецца невялікі статак кароў. І раптам ззаду вясёлы голас: «Во, і Зінка наша тут!» Паварочваюся — бабулька з пугай у руках. «Ой, Божачка, як вы мяне пазналі?» — «Дык у нашых Гатавічах казалі, што ты прыехала адпачываць у "Саўмін"».

Санаторый «Сосны» лічыўся тады домам адпачынку і належаў Савету міністраў БССР. Мясцовыя называлі яго «Саўмінам». Вялікая колькасць гатаўцаў працавала ў «Соснах». Мяне лічылі там за сваю. А з той бабулькай мы так добра пагаманілі. Колькі добрых парад дала яна мне па збіранні і па саленні грыбоў! Цяпер у санаторый «Сосны» не паедзеш, дорага каштуе. Але мы можам паехаць да сваіх сяб-

роў. Прыязджаем з Надзеяй Лось, маёй добрай сяброўкай. І нам заўсёды радыя мясцовыя жыхаркі Зоя Ліхач і Людміла Грышкевіч. І сёлета ўжо атрымалі ад іх запрашэнне.

А калі завітаем па дарозе на Нарач у Вілейку да Людмілы і Анатоля Сяргей, вырвацца ад іх немагчыма. Любілі наведаць у мястэчку Ілья і маю ўнучатую пляменніцу Валянціну ды яе мужа Пятра Мядвецкіх. Гэта ж усё па дарозе на Нарач.

Але значна раней уся наша вялікая сям'я кожнае лета ездзіла на адпачынак у крымскі Сімеіз. Прымала нас бабуля мужа Надзея Кап'ёва, наша «бабуля-прабабуля», якая жыла там са сваёй дачкой. Цётка Генадзя, Ганна Пятроўна, працавала начмедам вялікага санаторыя імя Сямашкі. Улетку з'язджаліся Кап'ёвы з розных гарадоў Саюза. Незабыўныя тыя нашы вясёлыя вячоркі.

І, вядома ж, любім мы сваё лецішча ў «Сябрах» паблізу Астрашыцкага Гарадка. Цудоўнае лясное атачэнне, чысцюткае возера з прыгожымі гарлачыкамі і чаротам. Насельніцтва «Сяброў» — мастакі, артысты, скульптары, кампазітары, музыканты. На жаль, сяброў тых гадоў становіцца ўсё меней...

Мая сям'я пасялілася тут дзякуючы Народнаму артысту Савецкага Саюза Мікалаю Яроменку, Заслужанаму артысту БССР Юрыю Смірнову і намесніку старшыні Рэспубліканскага тэлебачання і радыё Віталю Дзмітрыевічу Чаніну, светлая ім памяць.

У 80-х гадах, калі беларусы атрымалі дазвол, і пачалася кампанія пабудоў дачных «дамкоў», прафсаюз нашага камітэта прыгледзеў даволі вялікі зямельны надзел у раёне Вязынкі. Вядучай праграмы «Запрашаем на вячоркі» дыктару Кацярыне Несцяровіч, журналісту Людміле Бандарэнка і мне кіраўніцтва даручыла пахадайнічаць: зачараваць і папрасіць дазвол на пабудову «дамкоў» для супрацоўнікаў тэлебачання і радыё. Мы гэта зрабілі.

Але калі дзялілі зямельныя надзелы, мне адмовілі. Віталь Дзмітрыевіч пры сустрэчы выбачаўся, тлумачыў, што такая там здарылася сітуацыя, а я яго супакойвала, ве-

даючы тую сітуацыю. Казала, што рашэнне было абрана правільнае. Адносіны з Віталем Дзмітрыевічам у нас былі сяброўскія, дый жылі мы з ім у адным доме. І вось неяк выходзіла з Дома радыё ды сустрэла спевака, саліста Беларускага радыё Юрыя Смірнова, як заўсёды, з ветлівай усмешкай на твары. Я рассмяялася, калі ўбачыла яго. Параспавядалі адзін аднаму пра свае справы, і раптам Юра мне: «А табе патрэбна так далёка ездзіць на лецішча ў Вязынку? Зараз жа зайдзі да Мікалая Мікалаевіча Яроменкі, у Саюзе тэатральных дзеячаў столькі ўчасткаў, не ведаюць, каму даваць. Я толькі што адтуль».

Офіс Саюза тэатральных дзеячаў быў побач з Домам радыё. Заўсёды рада была сустракацца з вядомым Народным артыстам. Пасля прыемнай размовы Мікалай Мікалаевіч расклаў карту будучых лецішчаў, сярод сарака незанятых выбрала сабе і я. Можа гадоў праз дзесяць па падказцы сяброў з Міністэрства абароны купілі дом, калі зносілі старыя фінскія баракі ў ваенным гарадку ў Гомельскім раёне, разабралі і перавезлі ў «Сябры». Узялі пазыку. Дапамагалі ўсе сябры, асабліва вілейскія, мой брат Аляксандр Бандарэнка, сям'я маёй стрыечнай сястры Ганны, калегі мужа, суседзі па лецішчы, сярод якіх былі і Народны артыст БССР кінарэжысёр Міхаіл Пташук, светлая яму памяць, і проста майстар на ўсе рукі Уладзімір Цярлецкі. Муж пайшоў на пенсію, дабудоўваў сам з дапамогай сыноў і сяброў. Мой сын Саша вельмі любіў там бываць. А я вельмі люблю гуляць там з унукамі па лесе, вучу іх збіраць грыбы, размаўляць з раслінамі. Яны ў мяне гарэзы.

* * *

Але вяртаю вас да ўспамінаў тэлезапісаў у Маскве. Я ўжо згадвала, што яны заўсёды спрыялі кантактам, шчыраму сяброўству і абмену нефармальнай інфармацыяй.

Адну з такіх урачыстасцяў вёў дыктар Цэнтральнага тэлебачання Яўгеній Суслаў. Цікава, што Жэня быў адзіным мужчынам у тым запісе. Чамусьці ўсе астатнія 14 рэспуб-

лік былі прадстаўленыя выключна дыктарамі-жанчынамі. Пасля запісу вырашылі наведаць адзін з цудоўных рэстаранаў Астанкінскай вежы. Як вядома, там іх тры: бронзавы, сярэбраны і залаты.

Каб паказаць панараму Масквы, дзве гадзіны рэстаранная зала рухалася па колу. Гэтага часу хапала не толькі для таго, каб убачыць прыгожыя краявіды Масквы, але і расказаць пра жыццё ў рэспубліках, адкуль прыехалі дыктары.

Тады і пачула шмат пранізлівых, жудасных расповедаў сваіх калег. Асабліва з Сярэдняй Азіі.

Пра гэта не пісалі ў газетах. Там людзі жылі цяжэй за ўсіх. Мясцовыя ўлады камунізм будавалі такім, якім яго бачылі самі. Іншадумцаў і проста незадаволеных жыццём кідалі ў турмы, білі, катавалі альбо проста знішчалі — жыўцом закатвалі ў асфальт пры будаўніцтве новай дарогі. Расказалі і пра сумна вядомую «бавоўняную справу», калі арыштавалі, а потым судзілі многіх кіраўнікоў, і ў тым ліку зяця Брэжнева Чурбанава. Аказваецца, раскрыццю яе паспрыялі касманаўты, калі з арбіты зрабілі здымкі бавоўняных палёў і перадалі ў Крэмль, а там параўналі з афіцыйнымі ўзбекскімі і кіргізскімі лічбамі. Пасля судоў на «бавоўняныя» краіны так моцна пачалі ціснуць, што там людзям не было чаго есці. Не хапала нават хлеба...

Дыктары тых часоў атрымлівалі шмат лістоў з усіх канцоў Савецкага Саюза. Яны былі абсалютна нечаканымі па змесце. На ўсе старалася адказаць асабіста. Памятаю, пасля чарговага «Блакітнага агеньчыка» мне прыйшоў ліст з Уралу. Жанчына пісала, што памірае ад раку, а ў адной газеце прачытала, што ў Беларусі пачалі выпускаць вітаміны-антыаксіданты, якія моцна супрацьстаяць хваробе. Я звярнулася па дапамогу да дырэктара аднаго з фармацэўтычных заводаў.

У той жа дзень пытанне было вырашана, і лекі накіравалі на Урал. Божа, якой шчаслівай была тая жанчына! Праз некаторы час яна даслала мне ліст падзякі. А пазней пасылку з пакетамі салёных белых груздоў.

* * *

У Народнага артыста СССР кампазітара Ігара Лучанка, светлая яму памяць, у 1986 годзе было шэсць аўтарскіх канцэртаў пад назвай «И пока на земле существует любовь...» у суперпрэстыжнай канцэртнай зале гасцініцы «Расія». У якасці вядоўцы ён запрасіў мяне. Рэжысёр гэтай залы Любоў Грачышнікава знайшла для мяне вельмі прыгожую ролю і цікавыя выхады. Першы мой выхад на сцэну быў абстаўлены так: я сядзела ў нацыянальным строі з верацяном у руках, перад пралкай-калаўротам. Нагой круціла кола: прымушала нітку бегчы паміж пальцамі. Калісьці ў дзяцінстве, калі прыязджала на Уборак на летнія вакацыі, цётачка Соня вучыла прасці, спраўляцца з калаўротам, і нават з кроснамі. Вось мне і спатрэбіліся дзіцячыя веды. Адначасова я прамаўляла першыя радкі знакамітага верша Янкі Купалы, які стаў песняй Ігара Лучанка: «Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына...»

Журналіст Павел Якубовіч напісаў аб гэтым у газеце «Знамя юности» так: «Строгая і выразная рэжысура зрабіла адной з галоўных дзеючых асобаў Зінаіду Бандарэнка, дыктара беларускага тэлебачання, вядучую гэтых канцэртаў. Я быў у зале, і на ўсіх канцэртах чуў ад гледачоў: "Беларуская Мадонна"».

Вельмі цікавая сустрэча ў мяне адбылася з Юрыем Гагарыным.

Я вучылася ў Маскве на чарговых курсах. Сярод кіраўнікоў нашай вучобы быў рэдактар «Эстафеты навін» Мікалай Мітрохін. Аднойчы ён абвясціў пра магчымасць запрасіць да нас першага касманаўта СССР. Калектыў быў цалкам жаночым, таму гэтыя словы сустрэлі з вялікім захапленнем. Здаецца, нас тады было 15 чалавек. Але ён паабяцаў узяць з сабой каго-небудзь аднаго для папярэдніх перамоваў.

Падчас абеду (на Шабалаўцы была сталоўка, дзе можна было харчавацца танна і надзвычай смачна) ён падышоў да мяне і прапанаваў з’ездзіць да Гагарына разам. Шчыра ўзрадавалася і падзякавала за выбар.

Вечарам мы паехалі ў Таварыства савецка-кубінскай дружбы. Гагарын быў першым яго прэзідэнтам. Пасля канцэрта адбылося традыцыйнае частаванне, дзе мяне і пазнаёмілі з Юрыем Аляксеевічам. Ён быў заўзятым паляўнічым, таму, калі пачуў маё запрашэнне прыехаць у Беларусь і наведаць Белавежскую пушчу, вельмі ўзрадаваўся. І нават па-добраму ўсхваляваўся. Мы танчылі не адзін танец. Я была на даволі высокіх абцасах, таму Гагарын падаваўся значна ніжэй ростам, але яго гэта ні на хвіліну не засмуціла. Абаяння, вабнасці — мора! Асабліва калі ўсміхаўся.

У Беларусь ён так і не патрапіў...

Не патрапіў Юрый Аляксеевіч і да нас, хаця просьбу прыехаць на нашы курсы сустрэў вельмі пазітыўна і даў адпаведнае абяцанне. Асабліва ўразіўся магчымасцю ўбачыць 15 прыгажунь з усіх рэспублік.

Кіраўнік нашай вучобы патлумачыў гэта даволі празаічна. Аказваецца, перад тым, як ехаць да нас, Гагарын завітаў на ткацкую фабрыку, дзе яго таксама чакалі. Улічваючы, што такога кшталту сустрэчы заўсёды заканчваліся гарачымі пачастункамі, Юрый Аляксеевіч даехаць да нас быў ужо не ў стане. Аднак касманаўты — людзі абавязковыя, і замест Гагарына прыехаў на сустрэчу з намі Герман Цітоў. Дарэчы, ён таксама маленькага росту. На той час гэтага патрабавала савецкая касманаўтыка.

* * *

Яшчэ крыху пра пастаянныя камандзіроўкі ў сталіцу СССР.

Як толькі чалавек у нас пачынаў працаваць дыктарам, яго адразу накіроўвалі на вучобу ў Маскву. Беларускае кіраўніцтва імкнулася, каб там навучалася як мага болей людзей. На першых часах вучылі ў розных месцах Масквы, нават у гатэлях. Пасля пабудовы новага тэлецэнтра Астанкіна заняткі праходзілі толькі на Шабалаўцы, дзе зрабілі вучэбны цэнтр, якім пазней кіраваў Уладзімір Познер. Выкладчыкі там былі проста выдатныя. Напрыклад, Зоя Салілава са знакамітага Дзяржаўнага інстытута тэатраль-

нага мастацтва (па-руску — ГИТИС). Яна выкладала тэхніку і культуру мовы. Гэта артыкуляцыя, пастаноўка голасу. На заняткі прыязджалі дыктары з Сярэдняй Азіі, Каўказа, Прыбалтыкі, што спрыяла сяброўству паміж дыктарамі ўсіх рэспублік.

У Маскву на семінары неаднаразова ездзіла і я. Адзін семінар мне запоўніўся асабліва. І не толькі таму, што працягваўся два месяцы.

Гэта быў пачатак васьмідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. Адбывалася ўсё на Шабалаўцы. Да абеду выкладаліся лекцыі, а пасля абеду былі практычныя заняткі, дзе рабіліся пробныя запісы, кансультацыі, вучылі працаваць над тварам, макіяжам, адзеннем і г.д. Паліталогію ў нас чытаў малады выкладчык МДУ імя М.В.Ламаносава, зараз доктар філасофскіх навук, прафесар А.М. Ушкоў. Дзіўна, але паліталогія была амаль кожны дзень. Першымі словамі Ушкова былі: «Дакладна ведайце, што камунізм нам ніколі не пабудаваць». Мы сядзелі моўчкі, а ён дадаў: «Не бегайце і не скардзіцеся на мяне ў дэканат. Вы не думайце, што я нейкі здраднік краіны, дысідэнт альбо на ўліку ў КДБ. Усё, што вам кажу, я вылічыў па дадзеных з дзвюх галоўных партыйных газет «Правда» і «Известия». На сённяшні дзень усе сусветныя багацці размеркаваныя цалкам. На Савецкі Саюз выпадае ўсяго шэсць адсоткаў іх. Усё астатняе — Амерыка, Японія, Германія, Францыя. А наша краіна толькі вядзе размовы пра пабудову камунізму, ці робіць выгляд, што яго будуе. Мы ніколі яго не пабудуем. Максімум, што маем, — некалькі добрых прадпрыемстваў на ўвесь Савецкі Саюз. А багацце ёсць толькі ў нашых дыпламатаў, якія за мяжой больш турбуюцца не пра краіну, а пра свой асабісты дабрабыт. Замест ведаў пра новыя і карысныя тэхналогіі, яны прывозяць для сябе адтуль залатыя ўнітазы».

Мой муж працаваў тады ў Вышэйшай партыйнай школе, і мы сябравалі з яе рэктарам, былым партызанам, Мікалаем Іллічом Пахомавым. Калі мы прыйшлі да яго ў госці, гаворка зайшла пра мой семінар у Маскве. Ён выслухаў

пачатак майго расповеду, і нават не даў дагаварыць: «Зинаида Александровна, (звычайна ён называў мяне проста па імені), никогда, нигде и никому этого не рассказывайте. Это был предатель нашей партии, нашего народа и всего того, к чему мы стремимся».

Яго сын Сяргей, які таксама сядзеў за тым сталом, ахвотна падтрымаў мае словы: «Менавіта пра гэта табе, тата, я ўвесь час і тлумачу, а ты называеш мяне "ворагам народа"».

Такую ж думку, калі распавяла ў дыктарскай пра меркаванні выкладчыка з Масквы, выказаў і палітычны аглядальнік нашага тэлебачання Леанід Васільевіч Ларуцін. Сказаў, што пра гэта ведаюць усе. У тым ліку і тыя, хто працуе на Карла Маркса, 38, то-бок у ЦК КПБ. Толькі афіцыйна, услых, ніхто не кажа.

Я заўсёды з радасцю чакала ўдзелу ў канцэртах у Цэнтральнай залі «Расія». Мы заўсёды жылі ў гэтай гасцініцы, там было ўтульна і камфортна. Калі цяпер у каторы раз пераглядаю мастацкі фільм «Міміно», чамусьці хвалююся, убачыўшы знаёмыя інтэр'еры «Расіі», знятыя рэжысёрам Георгіем Данэлія. Калі ўдзельнічала ў гала-канцэртах, яны абавязкова суправаджаліся цікавымі сустрэчамі, размовамі са знакамітымі артыстамі. Ды і сам гатэль «Расія» — гэта было шматнацыянальнае асяроддзе, увасабленне таго вялікага сяброўства, якое існавала паміж людзьмі, і якое хутка знікла з развалам Савецкага Саюза. Некалькі гадоў таму была ў Маскве, у гасцях у маёй даўняй сяброўкі, дыктара Мурманскага тэлебачання, Людвігі Клем і яе мужа, спартыўнага рэдактара Першага канала ЦТ, Барыса Гульцяя. Зноў захацелася наведаць менавіта тыя мясціны. Гасцініца была ўжо знесена, а новы парк яшчэ не пачалі будаваць. Падышла да агароджы, у шчыліну ўбачыла вялізную пустэчу з рэшткамі будматэрыялаў. Вось і ўсё, што засталося ад таго непарушнага, як нам здавалася, Савецкага Саюза...

# Сям’я — лад жыцця

Мой муж, Генадзь Мікалаевіч Кап’ёў, нарадзіўся ў Новасібірску, а рос у Іркуцку, Краснаярску, іншых сібірскіх гарадах. Яго маці, Ніна Пятроўна, — украінка, бацька, Мікалай Пятровіч, — рускі, сібірак. Даслужыўся да маёра чыгуначных войскаў.

Дзяды Генадзя былі даволі цікавымі асобамі. Адзін, па лініі таты, Пётр Кап’ёў, служыў на вайсковым крэйсеры «Святлана» і прымаў удзел у Цусімскай бітве. Маракі змагаліся гераічна. Але карабель быў моцна пашкоджаны агнём японскіх гармат. І калі скончыліся снарады, камандзір загадаў затапіць крэйсер. Дзед трапіў у палон. Японцы асабліва высока цанілі яго майстэрства слесара. Потым ён вярнуўся ў Расію і далучыўся да бальшавікоў. У 1929 годзе Пётр Пятровіч стаў членам УЦВК РСФСР XIV склікання, і нават сустракаўся з М.І. Калініным.

Другі дзед, па лініі маці, Пётр Корж, служыў чыгуначным жандарам, але таксама сімпатызаваў бальшавікам. Калі начальства загадвала правесці ў нейкага чалавека вобыск, ён вечарам прыходзіў да яго і казаў: «З раніцы прыйду да вас з вобыскам». Але пасля кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года ён меў шмат праблем з-за свайго месца службы.

Ніна Пятроўна нарадзілася ў сібірскім Канску. Іх сям’я трапіла туды з Украіны, уцякаючы ад голаду ў пачатку XX стагоддзя. У Краснаярску Ніна Пятроўна пазнаёмілася з Мікалаем Пятровічам, які ўжо быў вайсковым афіцэрам. Пабраліся шлюбам, і ў іх нарадзіўся сын Генадзь, мой будучы муж.

На Мікалая Пятровіча пастаянна ішоў ціск. Яго, сына дэпутата УЦВК, прымушалі кінуць сваю жонку, дачку царскага жандара. Неяк на чарговым разборы яго справы Міка-

лаю Пятровічу сказалі: «Ці кінеш жонку, ці пакладзеш партыйны білет!» На што ён адказаў: «І партбілет не пакладу, і жонку вам не аддам». І паказаў кукіш. А назаўтра атрымаў загад адправіцца на службу ў Манголію без сям'і. Але потым яны ўсё роўна былі разам.

Лёс сям'і ваеннага ўсім вядомы — бясконцыя пераезды. У час Другой сусветнай вайны сям'я Кап'ёвых апынулася ў Беларусі, у Брэсце. Потым жылі ў Лунінцы і Жлобіне.

На сённяшні дзень у нас столькі родзічаў: у розных гарадах Сібіры, у Санкт-Пецярбургу, у Літве, у Крыме, у Маскве, у Кіеве (дзе жыве і працуе мой малодшы брат па бацьку Леанід Аляксандравіч Бандарэнка, чалавек ваенны, палкоўнік) і, вядома ж, у Беларусі. Вялізная мапа былога Савецкага Саюза.

Мой муж Генадзь скончыў Сталінградскі сельскагаспадарчы інстытут. Яго накіравалі ў Ноўгарад, а адтуль — выкладчыкам сельскагаспадарчага тэхнікума ў правінцыю. Там Генадзя і знайшла прапанова «стаць чэкістам», пра што ён напісаў ліст дадому. Бацька адразу ўзрадаваўся і параіў даць згоду, а маці сказала: «Толькі праз мой труп!» Яна нямала пражыла ў Сібіры і шмат разоў бачыла, як ішлі цягнікі з «палітычнымі», як праз вокны выкідвалі целы памерлых, як людзі прыносілі хлеб, як намагаліся перадаць яго зняволеным. Бегала да цягнікоў і сама Ніна Пятроўна. Генадзь адказаў бацьку, што не хоча быць ваенным, і пытанне назаўсёды было вырашана. А потым прыехаў працаваць на «Гомсельмаш».

* * *

Але вернемся да нашага пераезду ў Мінск. Бацькі Генадзя таксама перабраліся ў сталіцу. Жлобінскае жытло яны фактычна падаравалі дзяржаве. Працай кажучы — пакінулі. Галоўная прычына — дапамагчы нам выхоўваць малога Сашачку. Мяне дома з-за працы амаль не было. Генадзь таксама шмат працаваў. Выклікаць з Гомеля маю маму было рызыкоўна: адносіны з зяцем так і не скласіся. Ужо праз шмат гадоў Генадзь змяніў сваё стаўленне да це-

шчы. І калі я пачала збіраць архіў, свае ўспаміны да гэтай кнігі, Генадзь Мікалаевіч прапанаваў прысвяціць яе маёй маме.

Свёкар, Мікалай Пятровіч, вельмі мяне любіў. Гэта быў незвычайны чалавек, з талентам бачыць самае асноўнае ў людзях альбо абставінах. Усім ён даваў дасціпныя добрыя мянушкі. Жонку нашага суседа і сябра, мастацтвазнаўцы Эдуарда Варашылава, Святлану (калі пабываў у іх музейна-мастацкага тыпу кватэры), называў «хозяйкой медной горы», а мяне «Эдзітай П'ехай» альбо «княгіняй». Свёкар навучыў шмат чаму карыснаму і мяне, і сваіх унукаў. Напрыклад, хадзіць па лесе і знаходзіць грыбы там, дзе для многіх іх не можа быць па вызначэнні. Гэта цэлая навука, таму не магу пагадзіцца з тымі, хто лічыць «ціхае паляванне» звычайнай справай.

Міма нашага дома праходзіла шаша, па якой у вёску Дзяніскі Лагойскага раёна, дзе будавалася новая дарога, самазвалы вазілі пясок. У тых мясцінах вельмі шмат грыбоў. Шафёры добра ведалі Мікалая Пятровіча, і нават спаборнічалі паміж сабой, хто яго будзе падвозіць у лес, бо той быў цудоўным расказчыкам і ведаў безліч смешных анекдотаў.

Я таксама ездзіла з ім некалькі разоў — такой колькасці рыжыкаў я нідзе не бачыла. Грыбныя запасы ў нас былі заўсёды. У першую чаргу таму, што мая свякруха Ніна Пятроўна была надзвычай умелай гаспадыняй. У нас заўсёды было чым пачаставаць гасцей. Апроч гэтага на ёй цалкам ляжала выхаванне нашых дзяцей.

Спачатку ўсе мы жылі ў маленькай «хрушчоўцы» на Арлоўскай (28 квадратных метраў на пяць чалавек), потым перабраліся ў больш прасторную трохпакаёўку. А затым пераехалі ў чатырохпакаёвую кватэру на вуліцы Максіма Горкага, якую цяпер мінчане ведаюць як вуліцу Максіма Багдановіча.

Адразу да нас пачало прыходзіць больш гасцей, маіх і Генавых калег па рабоце. Часта завітвалі і вельмі вядомыя людзі: Народная артыстка БССР Ліля Давідовіч, Народны

мастак СССР, акадэмік АМ СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Міхаіл Савіцкі, рэктар Медыцынскага інстытута (цяпер універсітэта) Аляксандр Ключароў, начальнік ВІЗРУ генерал-лейтэнант Юрый Кулікоў, доктар медыцынскіх навук, фтызіятр прафесар Яўгеній Мэве, трохразовы алімпійскі чэмпіён Аляксандр Мядзведзь, сям'я мастака па мэблі і інтэр'еры Леаніда і гукаінжынера Беларусьфільма Элечкі Піхоцкіх, падпалкоўнік Уладзімір Вяткін, сям'я Мікалая Чаргінца (з якой мы доўга і моцна сябравалі, але потым разышліся па палітычных поглядах) і шмат іншых.

Часцей мы збіраліся пасля святочных парадаў і дэманстрацый. Дома нас заўсёды чакаў смачны, прыгатаваны Нінай Пятроўнай, абед.

* * *

Некалькі словаў пра майго старэйшага брата Ігара. Як ужо казала, лёс пакінуў яго ў Грузіі. Там ён асеў на сталае жыццё. Але яно не склалася. Пасля службы брат працаваў газаэлектразваршчыкам. Паслугамі яго працы шмат хто карыстаўся, а за працу звычайна разлічваліся віном. З часам Ігар прызвычаіўся да спіртнога. Яго нават лячылі. Я спецыяльна ездзіла ў Грузію. З маёй дапамогай яго ўладкавалі на прымусовае лячэнне.

Але лепш бы я тое не рабіла. Як распавядаў потым Ігар, гэта была сапраўдная турма і здзек з людзей, яму там проста зламалі жыццё. Жонка не вытрымала, хоць у іх было двое дзетак, — аднаго разу пасадзіла Ігара на самалёт і выправіла ў Мінск, бо ў Гомель самалёты з Тбілісі не лёталі. Так Ігар зноў апынуўся ў Беларусі. Мы з Генадзем у той момант адпачывалі ў Друскінінкаі. Сустракала Ігара свякроў Ніна Пятроўна. Яна дала тэлеграму маёй маме ў Гомель. Прыйшоў адказ: «Прыязджай сынок, чакаю». Паводле расповеду Ніны Пятроўны, Ігар, калі прачытаў, не па-мужчынску заплакаў.

Таты нашага ўжо не было ў жывых. Мама разумела, што Ігара нельга пакідаць аднаго. Так яны ўдваіх і жылі-дажывалі. Я пастаянна да іх прыязджала ў Гомель. Мы з Гена-

дзем дапамагалі пераехаць у двухпакаёвую кватэру, якую нарэшце мама атрымала ў сувязі са зносам барака, у якім жыла раней.

Спачатку памерла мама, потым — Ігар.

Калі Ігара не стала, менавіта мачаха, старэнькая Кацярына Іванаўна, перажывала, завіхалася на яго пахаванні. Потым не стала і яе.

Як выпадае, езджу на іх гомельскія могілкі. Усе мае родныя пахаваны побач — мама, Ігар, тата, Кацярына Іванаўна. У зямным жыцці было так шмат перажыванняў, непаразуменняў, а смерць усіх прымірыла. Цяпер нам застаецца толькі пераглядаць старыя дакументы, узнагароды, ордэны і медалі нашага таты капітана медыцынскай службы Аляксандра Бандарэнкі: за абарону Масквы, фарсіраванне Одэра і Віслы, узяцце Берліна, за вяртанне ў баявы строй савецкіх салдат і афіцэраў. Усё гэта беражліва захоўвае мая родная сястра па бацьку Наталля Аляксандраўна.

* * *

Наш старэйшы сын Саша марыў стаць лётчыкам. У Беларусі рыхтавалі толькі тэхнічных спецыялістаў для авіяцыі, а не лётчыкаў. Ён абраў Бугуруслан, што знаходзіцца ў 170 кіламетрах ад Куйбышава (цяпер зноў перайменаванага ў Самару). Адміністрацыйна гэта ўжо Арэнбургская вобласць.

Пасля заканчэння лётнай вучэльні Саша вярнуўся дадому. Накіравалі ў сельскагаспадарчую авіяцыю, апрацоўваць палі рознымі хімічнымі вадкасцямі. Але ў Беларусі яны працавалі мала. Больш — у Краснадарскім краі. А потым пачалася Сярэдняя Азія з іх бясконцымі бавоўнавымі палямі. Словам, маладых хлопцаў кінулі ў шкоднае для здароўя экалагічнае пекла. Мы лічым менавіта так, бо з васьмі чальцоў іх эскадрыллі ў жывых застаўся толькі адзін...

Зразумела, і ў нас усё адбылося не адразу. Саша ажаніўся і жыў у сваёй кватэры. Калі ён да нас прыходзіў, заўважыла, што сын часта бегае ў прыбіральню, і пацікавілася прычынай. Ён адказаў, што не ведае. Я адразу прапанавала здаць

аналізы. Сын не бачыў у гэтым нічога добрага, бо аналізы за яго, як стала вядома пазней, ужо здавалі калегі. На той час сын скончыў завочна Кіеўскі авіяцыйны інстытут.

Пачатак дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя быў надзвычай складаным. Айчынная авіяцыя амаль развалілася, і на яе руінах стваралі «Белавія». Трэба было хутка перавучвацца на новыя самалёты.

Аналізы паказалі, што цукар у сына перавышае норму ў некалькі разоў. У такіх выпадках — толькі інсулін, і толькі ўколы. Саша яшчэ хацеў працягнуць змагацца за месца ў авіяцыі, але ўсё гэта было дарэмна. Выглядаў сын, мякка кажучы, не вельмі добра, пачаў набіраць вагу, што пры дыябеце — звычайная справа. У 28 гадоў яму давялося адмовіцца ад мары, камісавацца і шукаць новую працу. Тады гэта было надзвычай цяжка. Месца ў структурах «Белавія» для яго не знайшлося. Спачатку працаваў у фірме, якую стварыў яго школьны сябар, а потым перайшоў у адзін з банкаў.

У той дзень з раніцы я паехала на споведзь і літургію ў Ратамку, дзе ў мяне ёсць духоўны настаўнік протаіерэй Аляксандр Міхейчык. Раней у Маладзечне ён адрадзіў надзвычай прыгожую царкву, а потым перабраўся бліжэй да Мінска. Здолеў пабудаваць царкву і тут. Усе абразы ў ёй упрыгожаныя вышыванымі ручнікамі! Утульнасць і дабрыня ад бацюшкі адчуваюцца адразу, як туды заходзіш. На службы беларускамоўнага святара айца Аляксандра прыязджаюць вернікі з усёй акругі, і з Мінску таксама. Дарэчы, вельмі ўдзячная Галіне Васільеўне Сіўчык за тое, што першы раз у Ратамку на службу да святара Аляксандра запрасіла мяне яна.

Вярнуўшыся з Ратамкі, я толькі зайшла дадому, як патэлефанаваў муж, параіў мне прысесці і раптам: «Сашы нашага ўжо няма...» Сыну было толькі 42 гады...

Увечары я даведалася, што мой малодшы сын Уладзімір таксама ў гэты дзень быў у храме (святога князя Аляксандра Неўскага) і прычасціўся. Так ён вырашыў адсвяткаваць свой дзень нараджэння, не ведаючы, што ў гэты час назаўсёды пакідае гэты свет яго родны брат Аляксандр...

Дачка Сашы, мая старэйшая ўнучка Марыя, час ад часу нас наведвае. Яна скончыла Беларускі інстытут правазнаўства ў Мінску. Замужам за добрым прыстойным маладым чалавекам з Браслава.

Праект помніка на магілу старэйшага сына я выпакутавала сама. Дапамог мне скульптар Аляксандр Кострыкаў. А рабілі яго ў Камбінаце архітэктуры і помнікаў. Менавіта там убачыла ў двары гэтай установы былы герб Беларускай ССР. Яго замянілі «Пагоняй», але не ведалі, што рабіць з савецкім гербам, і проста кінулі ля будынку камбіната. Змена сімвалаў тады пратрымалася нядоўга. А мне падумалася: пройдзе час — і зноў вернецца «Пагоня».

Калі Саша захварэў, мне патрэбна была інфармацыя пра захворванне. Я пазнаёмілася і пачала супрацоўнічаць з беларускай няўрадавай гуманітарнай арганізацыяй «Дзіцячы дыябет», якую ўзначальваюць два вельмі добрыя чалавекі, у якіх дачка таксама хворая на дыябет, — Святлана Аляксандраўна і Павел Міхайлавіч Захаравы. Вельмі карысную справу робяць гэтыя людзі. Шкада, што з-за інфаркту Павел Міхайлавіч крышку адышоў ад працы. Чальцы гэтай арганізацыі — не толькі дзеці, але і людзі без абмежавання ўзросту. На ўсе нашы мерапрыемствы прыязджаюць людзі з розных куткоў Беларусі. А ў Мінску мы праводзім «Дні прафілактыкі дыябету». Круглыя сталы, у час якіх праводзяць кансультацыі і адказваюць на пытанні вядучыя эндакрынолагі Баларусі: Клаўдзія Арсенаўна Радзюк, прафесары і дактары медыцынскіх навук Алена Аляксееўна Холадава, Ларыса Іванаўна Данілава, Таццяна Васільеўна Мохарт і іншыя. Тут жа можна змераць узровень цукру ў крыві.

На самым пачатку праблем з лячэннем дыябету было зашмат. І я, як маці, гэта адчувала. Не было ачышчаных прэпаратаў. Было вырашана падключыць самыя высокія інстанцыі і замежныя арганізацыі. Разам са Святланай Аляксандраўнай і з сынам Сашам, які здымаў на відэакамеру, мы зрабілі некалькі сюжэтаў на гэтую тэму. Ніколі не забуду здымкі ў адной даволі абмежаванай матэрыяль-

на сям'і. Васямнаццацігадовая дзяўчына, такая прыгожая, што вачэй не адвесці, якая зусім страціла зрок, маючы дыябет, распавядала, што працуе на заводзе, дзе вырабляюць розныя разеткі, выключальнікі, і што прызвычаілася выконваць тыя працоўныя аперацыі. Яна казала, што дагэтуль памятае колеры, святло і марыць зноў убачыць усё гэта па-сапраўднаму: і сіняе неба, і белыя аблокі. Чула, што ў Амерыцы ўжо вырабляюць электронныя вочы. І раптам проста ў камеру сказала: «Дапамажыце...» І ў гэты момант я павярнулася да сына — у яго вачах стаялі слёзы. Гэта быў 1993 год...

Зараз гэтай дзяўчыны ўжо няма. А ў той час якраз стала вядома, што ў Беларусі запасу інсуліну засталося на тры дні, і я звярнулася да сваіх калег. Дыктары Беларускага тэлебачання на працягу некалькіх дзён чыталі аб'яву пра гэтую бяду і таксама заканчвалі словам: «Дапамажыце!» Дзякуй Богу, раптам знайшлі інсулін «на нейкім складзе». А потым была аб'яўлена сапраўдная барацьба супраць кітайскага інсуліну, які не даваў ніякай гарантыі. Святлана Аляксандраўна абвясціла SOS-праграму «Дапамажыце — інсулін». Арганізацыя «Дзіцячы дыябет» з'яўляецца сябрам Міжнароднай дыябетычнай федэрацыі, прымае ўдзел у самітах кіраўнікоў дыябетычных арганізацый краін СНД.

Тут, у Мінску, і Дні дыябету, і некаторыя ўрачыстасці мы праводзілі ў Доме ветэранаў, у Доме міласэрнасці, у Доме літаратараў, бо аўдыторыя наша вялікая. І, што цікава, раней можна было дамовіцца — і залы давалі без аплаты, а цяпер гэта каштуе вялікіх грошай. Праз некалькі гадоў мяне ўключылі ў савет арганізацыі, і я стала адказнай за мастацкую частку нашых мерапрыемстваў. Шчыра ўдзячная нашым артыстам, спевакам, якія працавалі за «дзякуй», і ніхто ніколі не адмовіў: Якаву Навуменку і Аляксандру Ціхановічу, светлая ім памяць, Ядзе Паплаўскай, Насце Ціхановіч, , Ларысе Грыбалёвай, Наталлі Тамела, Таццяне Молчан, Галіне Грамовіч, Уладзіміру Кап'ёву.

Святлане Аляксандраўне Захаравай жадаю заўсёды заставацца такой жа чулай і спагадлівай да людзей.

* * *

Пасля смерці сына для мяне наступілі вельмі цяжкія часы. Заўсёднае пытанне: чаму так здарылася? Лічыцца, што гэтае захворванне перадаецца ў спадчыну. Але ў нашым родзе з такім дыягназам нікога не было. У Беларусі цяпер колькасць хворых на дыябет усё павялічваецца.

Шмат людзей падтрымалі маю сям'ю ў тыя трагічныя гады. Здавалася, што боль гэты не сціхне ніколі.

Літаральна праз некалькі тыдняў прыехаў кіраўнік Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька і распавёў пра тое, што ў партыі ёсць магчымасць з дапамогай урада Літвы, які бярэ на сябе выдаткі, адпраўляць беларусаў, што пацярпелі ад рэжыму, на адпачынак. Выказала сумнеў: я нібы не пацярпела — не бітая, у турму мяне не кідалі, як іншых, на што атрымала тлумачэнне, што многія ўжо скарысталіся такой магчымасцю.

І вось пачалося наша падарожжа ў складзе Вольгі Рыгораўны Завадскай, маці зніклага аператара ЦТ Зміцера Завадскага, маці Генадзя Карпенкі Веры Міхайлаўны Розум і журналіста Аляксандра Тамковіча. А адвозіў нас у Літву сябра АГП і вельмі добры чалавек Ігар Шынкарык.

Гэтую акцыю дапамогі з боку Літвы праводзіла дэпутат парламента, па адукацыі доктар, якая пазней стала міністрам абароны Літвы Раса Юкнявічэне. Яна вельмі спрыяла партыі АГП і яе кіраўніку Анатолю Лябедзьку. І сапраўды, скарыстацца такой магчымасцю паправіць здароўе ў санаторыі «Драугістэ-Дружба» ў Друскінінкаі змаглі многія.

Нас размясцілі з Вольгай Рыгораўнай Завадскай у адным нумары. Мы перажывалі з ёю адзін мацярынскі боль, нашыя раны былі яшчэ свежыя, але боль Вольгі Рыгораўны быў невымерна большы, балюча было на яе глядзець: хаця знешне як быццам і не заўважна, але вочы... Іншым разам я проста выходзіла з пакоя, не магла стрымаць слёзы. Дзіма ўвесь час стаяў перад вачыма. Мы, тэлевізійшчыкі, яго вельмі любілі, любаваліся яго постаццю — ён поўнае падабенства сваёй прыгожай мамы.

Не згаворваючыся, штодзень мы выходзілі з Вольгай Рыгораўнай з будынка санаторыя і накіроўваліся ў розныя бакі. Санаторый знаходзіцца ў прыгожым сасновым бары, іншым разам доўга ў час прагулкі не сустрэнеш ніводнага чалавека. Адзінота таксама лечыць. І калі вярталіся ў нумар — толькі адно пытанне: «Усё нармальна?» Так хацелася заплакаць, але трымаліся. Мая мужная, гераічная і вельмі сціплая суседка Вольга Рыгораўна... Колькі выпала гора на яе долю і долю іншых маці зніклых палітыкаў. Мацярок Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, а таксама маці Генадзя Карпенкі, якія так і не дачакаліся сваіх сыноў. Пра ўсё гэта гаворана-перагаворана з Вольгай Рыгораўнай Завадскай.

Праз паўгода пасля сыходу Сашы — раптам тэлефонны званок з Прагі: кіраўнік Беларускай службы «Радыё Свабода» Аляксандр Лукашук запрашае правесці майстар-клас з журналістамі «Свабоды». Божа! Разгубілася. Не да гэтага зараз. Не спраўлюся. Не адразу дала згоду. Але муж пераканаў. Тым больш, што ён быў запрошаны таксама.

Прага ўразіла сваёй прыгажосцю, даўнінай, нейкай казачнай архітэктурай. На заняткі, трэнінгі прыходзілі ўсе, нават сталага ўзросту журналісты. Некаторым патрабавалася проста прафесійная парада. Сама ўцягнулася ў тыя штодзённыя сустрэчы. Дзякуй Аляксандру Лукашуку. Ён дапамог мне перанакіравацца ў маім далейшым творчым жыцці. І цяпер, калі слухаю «Радыё Свабода» ці гляджу «Зону Свабоды» на «Белсаце», радуюся прафесіяналізму журналістаў «Радыё Свабода». Усе яны асобы — і гэта галоўнае. Цікава слухаць іх і сачыць, як яны робяць аналітыку палітычных сітуацый у Беларусі і ў свеце.

* * *

Няпросты лёс і ў майго малодшага сына Валодзі.

Скончыў мінскую школу № 64 з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы, адзін курс Мінскага радыётэхнічнага інстытута, але зразумеў, што электроніка — гэта не яго. Два гады служыў у войску. За яго плячыма — філалагічны

факультэт БДУ і амаль трыццаць гадоў працы акцёрам і педагогам Тэатра-студыі юнацкай творчасці.

Акцёрская праца з выдатнымі творамі сусветнай літаратуры, як класічнай, так і сучаснай, сфарміравалі Валодзеў светапогляд. А шматлікія знаёмствы і сяброўства з цікавымі людзьмі творчых прафесій Беларусі, блізкага і далёкага замежжа дапамаглі яму сфарміравацца як асобе. Піша вершы і музыку да іх, выступае, як выканаўца, з музычным калектывам.

Амаль ва ўсіх справах і пачынаннях я падтрымліваю сына. Хаця мы часта з ім спрачаемся, і кожны з нас адстойвае свой погляд, сваю ідэю. Гэта не перашкода для таго, каб мы любілі і паважалі адзін аднаго. Наогул, пачуццё любві ў нашай сям'і адчувае кожны, і гэта — вялікае шчасце.

Аднакласнік і лепшы сябар Валодзі Гена Міхеткін служыў святаром у старадаўнім храме ў прыгожай вёсцы Лоск Валожынскага раёна. Прыхаджане яго вельмі любілі. Беларускае тэлебачанне не аднойчы здымала сюжэты пра тое, як сельскі святар дапамагае сялянам выкапаць бульбу альбо пакасіць траву.

Валодзя ездзіў да сябра, прымаў удзел у некалькіх місіянерскіх праектах айца Генадзя. Аднак раптоўна айца Генадзя не стала...

А Валодзя дыстанцыйна скончыў маскоўскі Праваслаўны Свята-Ціханаўскі гуманітарны ўніверсітэт, а цяпер, скончыўшы магістратуру, вучыцца ў аспірантуры Мінскай духоўнай акадэміі. Прыемна, што да расійскай духоўнай адукацыі можа яшчэ дадавацца і наша.

«У яе вочы, як спелая вішня, глядзіш у іх, і не хочацца адрывацца», — так напісала пра маю нявестку Ксенію Кап'ёву (у дзявоцтве Мінчанка) Эла Дзвінская ў газеце «Наша слова». Вельмі трапна, на мой погляд, падгледзела журналістка. Так бывае ў жыцці. Даволі доўгі час, каля дзесяці гадоў, і Уладзімір, і Ксенія працавалі побач, сустракаліся, віталіся. Але прафесійныя кірункі ў кожнага з іх былі свае. І калі час ад часу прыходзіла ў Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, нават і не чакала, што будзе

такі шчаслівы фінал. Аднойчы, калі ўбачыла Ксенію на Валодзевым канцэрце, паслухала, як гучыць голас, як грае на скрыпцы гэтая хударлявая дзяўчына, запыталася ў сына: «Што за скрыпачка?» — Адказаў: «Хормайстар з ансамбля "Зорачка"». Потым дазналася, што яна з дзяцінства спявала ў Заслужаным ансамблі песні і танца «Зорачка», пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў вярнулася туды працаваць хормайстрам, грала і спявала ў гуртах: «Без Білета», «Happy3friends», «Кумалёнтрэ» і «WZ-Orchestra» Зміцера Вайцюшкевіча.

Уладзімір і Ксенія ўзялі шлюб і павянчаліся. У нашу сям'ю ўвайшла такая светлая і прыгожая асоба. Ксенія спявае ў царкоўным хоры, а Уладзімір — алтарнік у адным з мінскіх храмаў. Калі ёсць час, яны разам ладзяць канцэрты і выконваюць свае песні. У іх трое дзетак: Марыя і двайняткі Ціхан і Афанасій. Двайняткі нарадзіліся ў дзень памяці новапакутнікаў і вызнаўцаў зямлі Беларускай і названыя ў гонар беларускіх святых.



Адзін з першых маіх выхадаў у эфір
у Мінску. 16 верасня 1962 г.



Пробы да фільма
«Лявоніха на арбіце»
на Беларусьфільме. 1963 г.



Масква. Дні Беларусі на ВДНГ.
З Заслужаным артыстам БССР Іосіфам Лакштанавым. 1964 г.



**Адзін з першых «Блакітных агеньчыкаў» на Маскву. З артыстамі маскоўскага тэатра імя Маякоўскага.**



**«Блакітны агеньчык» на Маскву. З народным артыстам СССР Зіновіем Бабіем. 1964 г.**



Мінская эстафета навін на Маскву. Бераг Свіслачы. Амаль ноч. З каментатарамі ЦТ Леанідам Залатарэўскім, Юрыем Фокіным і каментатарам БТ Леанідам Ларуціным. 1964 г.



Чарговы мінскі «Блакітны агеньчык». З Уладзімірам Паначэўным.

Інтэрв’ю з карэспандэнтам часопіса «Огонёк» Валянцінам Панамаровым. 1964 г.





«Блакітны агеньчык», прысвечаны Дню Савецкай арміі.
Злева — дыктар беларускага тэлебачання Давенора Галкіна
і пісьменнік Сяргей Смірноў. 1964 г.




Фрагмент гэтага ж «Блакітнага агеньчыка».
З Народным паэтам БССР Максімам Танкам.



**Гастролі Кіеўскай оперы ў Мінску.**
**Народныя артысты СССР**
**Лізавета Чаўдар і Юрый Гуляеў. 1965 г.**



**Музычная праграма «Эстрада ГДР». 1964 г.**




**На «Блакітным агеньчыку» ў 1964 г. Злева — Народная артыстка Беларусі Бэла Масумян і Заслужаны артыст БССР, мастацкі кіраўнік Белдзяржцырка Анатоль Шаг-Наважылаў, справа — Заслужаная артыстка Беларусі, дыктар радыё Галіна Яроменка.**



**Дзед мужа Пётр Кап'ёў, матрос крэйсера «Святлана».**




**Пётр Кап'ёў, дэлегат Усерасійскага з'езда Саветаў** *(чацвёрты злева ў трэцім шэрагу)*. **У цэнтры** *(у другім шэрагу)* **— Міхаіл Калінін. 1931 г.**



Другі дзед мужа Пётр Корж.
Новасібірск, 1932 г.



Бацькі мужа Мікалай Пятровіч
і Ніна Пятроўна Кап'ёвы. Брэст, 1946 г.



Мой тата ў гасцях у Ігара ў Тбілісі. 1966 г.



**Дыктары ўсіх саюзных рэспублік на семінары ў Маскве. Сустрэча з другім касманаўтам Германам Цітовым. Трэцяя злева ў другім шэрагу. 1965 г.**



**На летняй сесіі БДУ. Наш сябар з Кубы студэнт БДУ Сэльса.**



**Наведванне Чырвонай плошчы падчас семінара** *(чацвертая злева).*



**Чарговы семінар дыктараў у Маскве.**
**У цэнтры — мастацкі кіраўнік дыктараў ЦТ Юрый Сямёнавіч Ярцаў. 1966 г.**



Першы Усесаюзны фестываль тэлевізійных фільмаў у Кіеве. 1966 г.



Здымак для польскага часопіса «Przyjaźń». 1966 г.



Эфір «Запрашаем на Вячоркі». Рэжысёр — Саша Дудзін.



**Каля ўваходу ў будынак Беларускага тэлебачання.**
**Сустракаю герояў святочнай праграмы. Дзень Перамогі. 1967 г.**



**Міліцэйскі «Блакітны агеньчык». У ролі капітана міліцыі. 1969 г.**



З Народнымі артыстамі БССР Сцяпанам Бірылам і Паўлам Кармунінам. 1968 г.



З калегам дыктарам Уладзімірам Бузуком у перадачы «У святле танца». 1969 г.



Рэпетыцыя перадачы «Запрашаем на вячоркі». Побач Народны артыст БССР Генадзь Цітовіч. 1969 г.



Семінар дыктараў у Мінску праводзіць дыктар ЦТ Віктар Балашоў. 1967 г.




Юбілей газеты «Чырвоная змена». 1971 г.



5 мая 1971 года. Дзень друку. Справа ад мяне паэт Анатоль Грачанікаў
і пісьменнік Леанід Прокша.



Возера Нарач. З сынам Сашам. 1970 г.



Праграма ЦТ «Горад майстроў» з Мінска.
Вяла з «кавээншчыкам» Юрыем Радзіеўскім. 1971 г.



Праца ПТС (перасоўнай тэлевізійнай станцыі). У полі. 1971 г.



Чацвёрты Усесаюзны фестываль тэлевізійных фільмаў у Мінску. З Заслужаным артыстам РСФСР Яўгенам Суславым. 1971 г.




За кулісамі акруговага Дома афіцэраў: Заслужаны артыст БССР, лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя П.І. Чайкоўскага Валерый Кучынскі, Народны артыст СССР кампазітар Ігар Лучанок, рэжысёр-пастаноўшчык канцэртаў Юрый Ужынцаў. 1970 г.



Секстэт дамраў Заслужанага артыста Беларусі Леаніда Смялкоўскага, а я — у тым самым строі. 1969 г.



На канферэнцыі тэлегледачоў у Маладзечне.
Побач галоўны рэдактар БТ Юрый Новікаў. 1973 г.



З Заслужаным артыстам БССР Уладзімірам Рагаўцовым. Заключны канцэрт Усесаюзнага фестывалю савецкай песні. 1973 г.



Вядзенне па закулісным мікрафоне Рэспубліканскага конкурсу з Палаца спорту «Мінскі баль». 1974 г.



Падрыхтоўка да эфіру.



**Эстафету «Горада майстроў» прымае Тбілісі. 1972 г.**



**На запісе «Блакітнага агеньчыка» на ЦТ. Паміж дыктарам Грузінскага тэлебачання Кетэно Гварамія і дыктарам Украінскага тэлебачання Тамарай Страціенка. 1973 г.**



**Генадзь з маленькім Валодзем. 1973 г.**



**Мой маленькі Валодзечка першы раз на тэлебачанні.**


У Мінску гасцюе сям'я брата Ігара. 1974 г.


Знаёмства з родным братам Юрыя Гагарына Барысам і іх мамай Ганнай Цімафееўнай. На руках — маленькая Вольга Чаргінец. 1974 г.



**Пасля трансляцыі з Кастрычніцкай плошчы і атрымання некаторых заўваг, наша каманда задаволеная. Злева ад мяне — паэт Пятрусь Макаль, справа ад мяне — рэжысёры Валерыя Гарабей і Галіна Корсік.**



**Дні культуры Рэспублікі Польшча на БТ. Дыктар Варшаўскага тэлебачання Ян Сужын. 1974 г.**




**Дзякуй Богу, едзем дадому пасля гастроляў у Варшаве. Злева направа: Народныя артысты БССР  Людміла Златава, Міхаіл Казінец, будучы дырэктар філармоніі Георгій Загародні, Заслужаныя артысты БССР Вольга Шутава, Валерый Кучынскі, Міхаіл Зданевіч, Аляксандр Лявончык. 1974 г.**

# Станаўленне

Хачу прыгадаць вельмі папулярную і любімую гледачамі ўсяго Савецкага Саюза праграму «Блакітны агеньчык», якая спачатку выходзіла кожную суботу і ў святочныя дні.

Адзін з першых беларускіх «Блакітных агеньчыкаў» быў прысвечаны тэатру імя Уладзіміра Маякоўскага, які тады быў у Мінску на гастролях. Калі не памыляюся, гэта было лета 1964 года. Спектаклі ішлі ў нашым акруговым Доме афіцэраў. Жывы эфір я цалкам (амаль паўтары гадзіны) вяла адна. Перадачу транслявалі на ўвесь Савецкі Саюз. Зразумела, асноўнымі героямі былі артысты тэатра, але ўдзельнічалі і нашы беларускія знакамітыя людзі, ветэраны. Шматразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў, свету, Еўропы і СССР па вольнай барацьбе Аляксандр Мядзведзь літаральна ўнёс у студыйны павільён на руках мініяцюрную актрысу тэатра Веру Арлову. З гэтага кадра і пачынаўся «Блакітны агеньчык» з Беларусі. Рэжысёрам першых беларускіх «Агеньчыкаў» быў Марк Міхайлавіч Моін.

Аднойчы «Блакітны агеньчык» трансляваўся проста са Свіслачы, дзе зрабілі спецыяльны плыт. Нягледзячы на тое, што здымкі праходзілі летам, пачало цямнець. Асвятляльную тэхніку прыгналі з усіх вайсковых частак Мінска, але і гэтага для чорна-белага тэлебачання аказалася недастаткова. Вось такія слабыя на той момант былі тэхнічныя магчымасці.

Адзін «Блакітны агеньчык» з Шабалаўкі ў прамым эфіры я вяла з Народным артыстам СССР Міхаілам Жаравым. На рэпетыцыях ён памыляўся, калі мяне прадстаўляў. І перад эфірам я на ўсялякі выпадак нагадала яму сваё прозвішча яшчэ раз. Ён засмяяўся і гучна сказаў: «Не хвалюйся, Зінуля, скажу, як трэба. Да маразму мне яшчэ далёка». А яму

ўжо было далёка за семдзесят. Вельмі прыгожы і прыцягальны мужчына.

Апошні раз паехала на Шабалаўку на прамы эфір «Блакітнага агеньчыка» (потым ужо з'явілася тэхнічная магчымасць рабіць відэазапісы). Той «Агеньчык» быў прысвечаны палёту ў космас адразу чатырох касманаўтаў. Там я прадстаўляла Беларусь, уручала чамусьці не нашу традыцыйную «Белавежскую», а нейкі каньяк і вышываныя беларускія ручнікі кожнаму. Пасля там жа, на Шабалаўцы, адбыўся банкет з удзелам многіх касманаўтаў, але толькі зайшла — і прымусіла сябе выйсці. Спяшалася да сям'і роднага дзядзькі майго мужа, дзе мяне заўсёды чакалі. Дзядзька Міця — ветэран Вялікай Айчыннай вайны, кандыдат філалагічных навук, вельмі цікавая асоба. У маладыя гады быў накіраваны ў ліку іншых настаўнікаў спачатку на Чукотку, а потым у Чачню, дзе вучыў рускай мове і дзяцей, і дарослых. Шмат цікавага распавядаў. Асабліва пра Чачню: гэты добры і горды народ ніколі нікому не скарыцца, ён заўсёды будзе свабодным як птушка, — такія назіранні чалавека ў пачатку 60-х гадоў. З цягам часу дзядзька Міця пераехаў жыць у Мінск, у нашу сям'ю. Так склалася яго жыццё. Пахаваны тут, на Паўночных могілках.

* * *

Як я ўжо казала, кіраўнік Рэспубліканскага радыё і тэлебачання драматург Вячаслаў Пятровіч Палескі быў вельмі адукаваным чалавекам. Па яго п'есе паставіў спектакль адзін беларускі тэатр. Паўтару, размаўляў Вячаслаў Пятровіч толькі па-беларуску, але ад іншых гэтага не патрабаваў. Калі праходзілі нейкія імпрэзы па прадстаўленні тэлебачання саюзных рэспублік, мы з ім разам шмат дзе пабывалі. У той жа Грузіі, напрыклад.

Цікавая сітуацыя адбылася там, калі мы прадстаўлялі нашу рэспубліку на Грузінскім тэлебачанні. Акрамя Вячаслава Пятровіча і мяне, у складзе дэлегацыі былі каментатар Леанід Ларуцін і галоўны рэжысёр дзіцячага вяшчання Канстацін Георгіевіч Пельтцэр, дарэчы, стрыечны брат

Народнай артысткі СССР Таццяны Пельтцэр. Вельмі інтэлігентны, добразычлівы, сталага ўзросту чалавек. Пасля трох дзён маіх выхадаў у эфір нам вырашылі падарыць цікавую паездку па Грузіі. Па ваенна-грузінскай дарозе, якая ў тыя часы яшчэ не была адноўлена. Мы павінны былі даехаць з Тбілісі да Сухумі з заездамі ў адметныя мясціны. І вось ужо пад ноч пад'язджаем да горнага паселішча. На вуліцы снег, хаця ўнізе — да сарака градусаў цяпла. Нас хуценька вядуць у старэнькую школу, а там сталы ломяцца ад пачастункаў. Гучыць грузінская мелодыя. І ні адной жанчыны — толькі грузіны-мужчыны — і тосты, тосты...

Калі нас правялі на начлег у невялікі гасцявы дом на высачэзных слупах, мы зразумелі, што спаць нам не дадуць, бо збаны з віном былі паўсюль. І тады Вячаслаў Пятровіч узяў сітуацыю ў свае рукі. Голас у яго быў басавіты і гучны. Па-беларуску прызваў да парадку, папрасіў цішыні. Ласкава запрасіў да выхаду. І, калі мы засталіся адны, звярнуўся да нас: «Усе нашы пакоі не зачыняюцца на замок. Я пайду да сябе, а вы ўсе павінны быць у адным пакоі з Зінай, каб чаго не здарылася».

Пажадалі Вячаславу Пятровічу дабранач, са смехам прысунулі пісьмовы стол да дзвярэй, і, вядома ж, яшчэ доўга размаўлялі...

Калі раніцай нас запрасілі на сняданак, грузінскі кіраўнік сказаў: «Упершыню мы бачылі, каб так ахоўвалі сваю жанчыну». А я і тады, і значна пазней неаднаразова дзякавала Вячаславу Пятровічу Палескаму. Светлая памяць гэтаму мудраму чалавеку!

Начальства не толькі ахоўвала, але і выхоўвала нас (часам па-рознаму), агароджвала ад неадэкватнай рэакцыі на поспехі. За сваё жыццё не раз была сведкай таго, як «зорнасць» літаральна ламала людзей. Яны мяняліся, не маглі спакойна прымаць любую аб'ектыўнасць. Часта гэта прыводзіла да прафесійнага выгарання.

Дагэтуль захаваўся ў мяне тэлекс, які атрымала наша тэлебачанне з ЦТ: «Прошу командировать в Москву в дирекцию программ Первого канала Останкино с 10 по 23

марта Бондаренко З.А. Другие дикторы, указанные в вашем телексе, будут приглашены дополнительно.

С уважением, первый заместитель директора программ ТВ А. Забаркин».

Гэта быў адказ ЦТ на прапанову нашага кіраўніцтва паслаць на той відэазапіс іншага дыктара. Зноў паехала я. Але для мяне гэта быў напамін — не губляць павагі да сваіх калегаў.

* * *

Напачатку я прыгадвала першы Усесаюзны фестываль тэлевізійных фільмаў, які праходзіў у Кіеве. А вось чацвёрты фестываль тэлевізійных фільмаў праходзіў ужо ў Мінску ў 1971 годзе. Журы ўзначальваў знакаміты рэжысёр Марлен Хуцыеў, а канцэрт закрыцця фестывалю мы вялі з дыктарам ЦТ Яўгеніем Суславым у акруговым Доме афіцэраў. Марлен Мартынавіч, калі ўбачыў мяне на сцэне, сказаў: «О, Беларусь мае сваю Джульету!» Пасля гэтага шмат жартаў пачула ад сваіх калег.

Праз некалькі гадоў, у 1975-м, ва Украінскай ССР праходзілі Дні літаратуры і мастацтва БССР. У Кіеў з Мінска накіравалі цэлы цягнік з беларускімі артыстамі. Ехалі мы доўга, бо незапланаванаму рэйсу прыходзілася пастаянна прапускаць рэгулярныя. У Кіеве я, канечне ж, пачала весці канцэрты на беларускай мове. У ім прымалі ўдзел усе лепшыя на той час мастацкія калектывы. Дастаткова сказаць, што пачынаў канцэрт Дзяржаўны народны хор пад кіраўніцтвам Народнага артыста СССР Генадзя Іванавіча Цітовіча.

Па завядзёнцы, для вядоўцы заўсёды ставяць два мікрафоны. Адзін на сцэне, другі — за кулісамі. Па першым на сцэне ты прадстаўляеш калектыў, а ўсе яго далейшыя песні анансуеш па закулісным. Пасля свайго першага выхаду на сцэну, за кулісы, дзе я рыхтавала абвяшчэнне другой песні хору, нечакана прыбег усхваляваны дырэктар нашай філармоніі Анатоль Іосіфавіч Каландзёнак. Ён быў у складзе нашай дэлегацыі і ўзбуджана, нервова пачаў выгаворваць: «Кто Вам дал право говорить на белорусском языке?» Я

не магла зразумець, як можна было зрабіць інакш, бо ўсе ўдзельнікі таго канцэрта былі з Беларусі. Як і я, усе ў нацыянальных строях. Ён працягваў, што ў зале сядзяць расіяне, якія нічога не разумеюць. Я разгубілася. Раптам да пульту падыходзіць маленькая жанчынка, якая была асістэнтам рэжысёра гэтага канцэрта і з якой я павінна была ўзгадняць усё па сцэнару. Яна стала паміж намі і абурана сказала: «Паслухайце, шаноўны! Як вы можаце такое казаць? Ды, калі вашая вядоўца пачне гаварыць па-руску, яе ў нас проста слухаць не стануць, закідаюць памідорамі».

Такіх пераўтварэнняў ад Анатоля Іосіфавіча я не чакала. Па адукацыі ён піяніст, і нават падаваўся добразычлівым чалавекам, таму для мяне гэта было вельмі нечакана. І тут ён раптам сцішыўся, апусціў вочы, ціха-ціха рушыў да выхаду з-за куліс. А рашучая ўкраінка пераможна сказала: «Працуй далей, дзіцятка!» А для мяне гэта быў яшчэ адзін маленечкі крок па шляху да Беларусі.

Прыгадваецца таксама гісторыя, якая шмат гадоў таму адбылася ў расійскім Краснадары. Там таксама праходзілі Дні беларускай культуры. На канцэрце закрыцця беларускія выступы ішлі разам з песнямі кубанскага казацкага хору, якім кіруе яго знакаміты стваральнік Віктар Гаўрылавіч Захарчанка. Пасля заканчэння канцэрту ён падышоў да мяне, пацалаваў руку і сказаў: «Я ведаю ўкраінскую мову, аднак не думаў, што беларуская яшчэ больш прыгожая. Колькі бываю ў Беларусі, ніколі яе не чуў. Размаўляйце толькі па-беларуску». Потым пачаўся банкет, ён сядзеў насупраць. Нехта нешта ў мяне запытаўся па-руску, і я пачала адказваць на рускай мове. Ён пачуў гэта і сказаў: «Гаварыце на беларускай мове, у вас яна лепш гучыць!»

Дзе б пазней ні праходзілі беларускія канцэрты: на Далёкім Усходзе, Маскве альбо ў Арменіі, я заўсёды прамаўляла па-беларуску. Трэба аддаць належнае Міхаілу Фінбергу, з якім я тады працавала, — на ўсіх канцэртах з маіх вуснаў гучалі толькі беларускія словы. І ўсюды мяне добра разумелі. І ў Петрапаўлаўску-Камчацкім, і ў Ніжнім Ноўгарадзе, і ў Кемерава, і ў Новасібірску.

Пасля таго, як адпрацавалі ў Кіеве канцэрт-адкрыццё, нас адправілі па ўкраінскіх абласцях. Разам з ансамблем цымбалістак пад кіраўніцтвам Заслужанай артысткі Беларусі Таццяны Сцяпанавай на Мікалаешчыну, Херсоншчыну і ў Адэсу.

Спецыяльна для такіх выступаў Анэля Тулапава напісала мне новы верш:

*Паслухайце — сатканая з праменняў*
*Песня пад аблокамі плыве.*
*Адразу птушкі змоўклі ў здзіўленні,*
*Зачаравана сціхнуў салавей.*
*Сасонка песню гэтую спаймала,*
*І песня засталася з ёй навек.*
*Сюды прыйшоў аднойчы чалавек,*
*Паслухаў песню — і зрабіў цымбалы!*

Пасля гэтых слоў я паказвала на цымбалы і дзевяць цымбалістак, якія стаялі за маёй спінай. Усе прыгожыя дзяўчаты, у нацыянальных строях! Канцэрты пачыналіся і заканчваліся апладысментамі. Часта яны праходзілі ў рыбацкіх калгасах. Памятаю, прыехалі ў адзін, якім кіраваў Герой Сацыялістычнай працы Мікалай Рабашапка. Спецыяльна да нашага прыезду яны пафарбавалі сцэну. А піяніна не было. Абысціся без яго немагчыма, бо з намі ездзілі Народны артыст Беларусі спявак Віктар Чарнабаеў, спявачкі Людміла Шамчук і Вольга Шутава. Інструмент знайшлі ў настаўніцы музыкі. Прыйшлося цягнуць яго на возе праз усю вёску. Свежую фарбу на сцэне садралі...

Было лета. Цёпла. Кветкі нам неслі пастаянна. Я выйшла, абвясціла чарговы нумар. Павярнулася, яшчэ не дайшла да куліс, і раптам чую за спінай усклік залы: «Алёша!» Падумала, нешта здарылася. Што я ўбачыла? Маленькі хлопчык нёс мне кветкі з дальніх радоў, дабег да сцэны і заплакаў, бо я ўжо сышла. Я гэта ўбачыла і рванула праз усю залу яму наўздагон. Узяла яго на рукі і прынесла на сцэну. Надалей усе нумары мы прадстаўлялі разам.

Падобных кранальных здарэнняў было вельмі шмат. І ўсе яны ўспамінаюцца з такой цеплынёй і хваляваннем!

* * *

Пляцовак, дзе мы працавалі для эфіру, тады было вельмі мала: Дом афіцэраў, Палац спорту і Оперны тэатр. Усё астатняе не транслявалася і мела збольшага ведамасны характар — прадпрыемствы адзначалі свае юбілеі альбо прафесійныя святы, якія праводзілі мы, дыктары. Мы гэта любілі рабіць. Бо, па-першае, удасканаленне прафесійнасці. А па-другое, дададковая да заробку, невялікая, але капейчына. Канцэртныя стаўкі ў нас былі вельмі маленькія: ад 6.50 — 3-я катэгорыя, да 15 рублёў — вышэйшая. Па ўсіх тэлестудыях Савецкага Саюза, і ў Маскве таксама, канцэртныя стаўкі былі аднолькавыя.

Валянцін Георгіевіч Панамароў — масквіч, чалавек адукаваны і інтэлігентны. Калі мы пазнаёміліся, ён быў карэспандэнтам часопіса «Огонёк» у Мінску. Жонка яго, Клаўдзія Сяргееўна, выкладала рускую мову ў БДУ імя Леніна. Яны не аднойчы бывалі ў нас у гасцях. Потым Валянцін Георгіевіч атрымаў запрашэнне ад Машэрава і стаў яго памочнікам. Аднойчы пасля майго вядзення ўрадавага канцэрту ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета Валянцін Георгіевіч пацікавіўся, колькі атрымліваю грошай за такі канцэрт. Адказала, што 4 рублі 50 капеек, таму што на той час у мяне не было яшчэ ніякай канцэртнай стаўкі. Ён быў вельмі здзіўлены, сказаў, што Клаўдзія Сяргееўна, якая прысутнічала на тым канцэрце, выказала меркаванне: 50 рублёў. Многія лічылі, што мы атрымлівалі вельмі вялікія грошы.

У сувязі з гэтым успамінаецца цікавая сітуацыя з Народным артыстам Савецкага Саюза Анатолем Папанавым. Ён разам з Маскоўскім тэатрам сатыры быў на гастролях у Мінску. Беларускае тэлебачанне выкарыстала гэта, Папанаў быў запрошаны ў студыю, і я на працягу гадзіны мела з ім гутарку. Гэта запісалі, потым павінен быў адбыцца мантаж з устаўкамі фрагментаў з кінастужак, у якіх прымаў удзел папулярны кінаартыст. Пасля запісу наша бухгалтэ-

рыя павінна была разлічыцца з Анатолем Дзмітрыевічам, і я правяла яго туды. Калі яму выклалі ў акенца 12 рублёў 50 капеек (такая ў яго была канцэртная стаўка), ён не зразумеў, спытаў: «А што гэта такое?», пачаў паказваць усе свае пасведчанні, узнагароды, казаць, што ваяваў і быў паранены. Я прасіла прабачэння, дзяўчаты з бухгалтэрыі таксама. Ён нават не хацеў браць тыя грошы. Як магла, я супакойвала Анатоля Дзмітрыевіча, але ўсё было дарэмна. Развіталіся мы ўжо ў іншым настроі. Пэўна, Масква ўсё ж знаходзіла больш спрыяльныя варыянты аплаты артыстам. Таму і была такая рэакцыя ў Анатоля Папанава.

Праз некаторы час усё кардынальна змянілася. Цяпер артысты атрымліваюць зусім іншыя грошы — так прымусіў шоу-бізнес. І розніца паміж заробкамі расійскіх і беларускіх артыстаў вельмі вялікая.

Мы адчувалі заўсёдную залежнасць ад Масквы. А тэхнічных магчымасцяў у нас заўсёды было менш.

У той час суперпапулярнай была праграма «Ад усяе душы», якую па-майстэрску артыстычна вяла Народная артыстка Савецкага Саюза Валянціна Лявонцьева. Гэта была першая ў СССР тэлеперадача, дзе займаліся пошукам людзей. У нейкім сэнсе яна стала правобразам для «Чакай мяне».

У Мінску тады таксама спрабавалі зрабіць нешта падобнае, толькі ў нас гэта назвалі «Савецкі лад жыцця». Як і цяпер, копія атрымалася не вельмі добрай, і яе ціха закрылі. Размах і грошы тут заўсёды былі не такія, як у Маскве.

Калі ў Беларусі, а дакладней, у Любані Мядзельскага раёна, здымалі праграму з Валянцінай Лявонцьевай «Ад усяе душы», беларускія ўлады імкнуліся дапамагаць ва ўсім. Тэксты ў яе былі вялізныя. І яна ўсё вывучвала напамяць, як і мы таксама. У нас тады суфлёраў не было. Значна пазней цэнзары паслабілі свае патрабаванні. І можна было імправізаваць.

Я не паспела пакарыстацца тэлесуфлёрам. Дыктары-вядоўцы таго часу больш любілі працаваць, як кажуць, вочы ў вочы. На гэты конт успамінаюцца мне канцэрты майстроў

мастацтва «Беларусь сінявокая», якія адбываліся ў Маскве ў 1984 годзе ў спартыўным комплексе «Алімпійскі». Тыя канцэрты ладзіў Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, народны артыст Рэспублікі Валянцін Дудкевіч. Глядзельная зала ўмяшчала каля 20 тысячаў гледачоў. Хвалявання не перадаць. Табе як быццам хочацца адарвацца ад зямлі. А галоўнае — еднасць, еднасць з гэтай вялікай канцэртнай залай, ты адчуваеш яе подых, як бы кіруеш яе настроем. Радкі верша Эдзі Агняцвет вельмі трапна дапамагалі перадаць пачуцці, твой настрой гледачам. Вось некалькі радкоў з яго.

*Я ў сэрцы ўсю цябе ўвабрала,*
*І міла слухаць кожны раз*
*Гул Беларускага вакзала —*
*Сталіца сустракае нас.*
*Паклон вам ад зямлі крынічнай,*
*І хлебаробнай, і лясной,*
*Ад Беларусі будаўнічай,*
*Ад Беларусі баявой!*

Канцоўка вельмі трапна прагучала б і сёння. А ў тыя васьмідзясятыя гады масквічы прымалі прывітанне ад Беларусі партызанскай. Таму што тыя канцэрты былі прысвечаныя саракагоддзю вызвалення Савецкага Саюза ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Два тыдні мы знаходзіліся ў Маскве. Хачу тут падзяліцца сваім адчуваннем ад развітання з Радзімай. Толькі ад'еду, хоць заўсёды рвалася на гастролі, — і адразу такі сум падбіраецца да сэрца. А ўжо калі пад'язджаем да свайго роднага вакзала ці падлятаем да Мінска, стрымаць слёз на вачах немагчыма. І гэта не толькі ў мяне адной. З многімі артыстамі, калегамі дзялілася, — усе перажываюць тое ж самае. Можа, гэта і ёсць той самы шлях, які мы шукаем.

І калі пасля апошняга з тых канцэртаў мы прыехалі на Беларускі вакзал, расселіся па вагонах, раптам пранеслася пагалоска: «Масквічы скралі адзін ручнік». Сцэна «Алім-

пійскага» была аформлена двума вялікімі ручнікамі памерам 2 на 20 метраў. Яны былі вытканы беларускімі ткачыхамі на адной з фабрык і доўгі час упрыгожвалі сцэну мінскага Палаца спорту на розных імпрэзах — і вось адзін ручнік знік. Так нам «аддзячылі» за нашы канцэрты.

* * *

Ганаровае званне Заслужанай артысткі БССР у пэўным сэнсе я атрымала дзякуючы Расіі. Дакладней, вядомаму творчаму маскоўскаму дуэту — кампазітару Аляксандры Пахмутавай і яе мужу паэту Мікалаю Дабранрававу. У СССР тады праходзілі фестывалі савецкай песні, ініцыятарам і арганізатарам якіх заўсёды быў Ігар Міхайлавіч Лучанок. Мы з ім шмат супрацоўнічалі. У рамках аднаго з такіх фестываляў адбываўся канцэрт у Палацы спорту. Фінальны. Разам са мной яго вёў акцёр Купалаўскага тэатра Валодзя Рагаўцоў. Журы конкурснай праграмы ўзначальвала Аляксандра Мікалаеўна Пахмутава.

Яшчэ з часоў Машэрава на святочныя банкеты (у адрозненне ад таго, як робіцца гэта цяпер) ніколі не запрашалі ўдзельнікаў і вядоўцаў канцэртаў, таму перакажу тое, што мне расказвалі іншыя. Быццам бы Аляксандра Мікалаеўна сказала аднаму з высокіх беларускіх кіраўнікоў (цікавіўся ходам фестывалю), што ўпрыгожваннем заключнага канцэрта была вядоўца. Не ведаю, так гэта было альбо неяк па-іншаму, але факт застаецца фактам. Літаральна на наступны дзень Мікалай Гаўрылавіч Братушэнка запрасіў мяне да сябе. Афіцыйна ён быў памочнікам старшыні тэлерадыёкампаніі, але многія лічылі яго «асабістам». Мікалай Гаўрылавіч павіншаваў з паспяховым канцэртам, а для прысваення звання Заслужанай артысткі БССР удакладніў некаторыя біяграфічныя дадзеныя.

А вось прысваенню звання Народнай артысткі БССР паспрыялі ўжо не расіяне, а беларусы. У 1985 годзе дні культуры Украіны праходзілі ў Палацы чыгуначнікаў. З Украіны да нас прыехалі калектывы, а вядоўцамі былі Народныя артысткі Украінскай ССР дыктары ўкраінскага тэлебачання

Таццяна Цымбал і Тамара Страціенка. Атрымалася, што я на ранг ніжэйшая — яны «народныя», а я «заслужаная». На тэлебачанне і ЦК КПБ пачаліся званкі і лісты: «Няўжо наша горшая?» Кажуць, гэта падштурхнула да адпаведнага рашэння. Чула, што, калі па кабінетах ЦК КПБ хадзіў адпаведны апытальны ліст (так рабілася даволі часта), усе без выключэнняў выказаліся за прысваенне мне звання «Народная артыстка». Такой аднагалоснасці не было амаль ніколі.

Мы, дыктары, вельмі любілі ездзіць на вучобу ў Маскву. Але і да нас таксама прыязджалі праводзіць майстар-класы вядомыя тэлевядоўцы. Мінск наведвалі дыктар усесаюзнага радыё Вольга Высоцкая, знакаміты Юрый Левітан, дыктары Цэнтральнага тэлебачання Ніна Кандратава, Ігар Кірылаў, Віктар Балашоў, Людміла Сакалова.

Памятаю, на першых занятках з Ігарам Кірылавым ён зрабіў мне вельмі карысную заўвагу: «Усё ў вас ёсць: голас, абаяльнасць. Але вам не хапае творчай нахабнасці. Вазьміце крышку, толькі крышачку, ад нашай Святланы Маргуновай». Ну вельмі трапная заўвага! Гэта нашая нацыянальная рыса: лепш я ціхенька пасяджу, каб нікому не перашкаджаць, не замінаць. І я пачала сачыць за сабой, выхоўваць у сабе ўпэўненасць і рашучасць. Тваё гледачы павінны верыць табе — верыць кожнаму твайму слову.

Дарэчы, дзякуючы той жа Святлане Маргуновай я не пераехала працаваць у Маскву. Пасля маіх паспяховых «жывых» выхадаў і запісаў мне раптам прапанавалі працу на ЦТ. Спачатку была размова пра мае кватэрныя ўмовы. Даведаўшыся, што ў нас трохпакаёўка, было сказана, што за яе ў Маскве можна атрымаць адзін пакой у камуналцы. А потым кіраўніцтва ЦТ падключае Массавет, і нам па колькасці членаў сям'і даюць нармальную кватэру ў Маскве. Якраз у той час толькі-толькі пераехала з Мінска дыктар БТ Вера Шыбека. І яна ўжо прайшла такі шлях, які прапаноўвалі мне. Але Вера была тады не замужам, і ёй было прасцей. Вера вельмі добра ўпісалася ў калектыў дыктараў ЦТ.

Яе прынялі і палюбілі гледачы ўсяго Савецкага Саюза. З цягам часу ёй прысвоілі званне Заслужанай артысткі РСФСР. А я ўсё прыглядалася. Хаця мой муж актыўна падключыўся да абмену кватэры.

Аднойчы пасля аднаго запісу затрымалася ў дыктарскай ЦТ, з кімсьці размаўляла. І якраз там сядзела Святлана Маргунова. Раптам тэлефонны званок. Святлана бярэ слухаўку, пытае: «Каго, каго?.. Валянціну Пячорыну?.. Такое г... у нас не водзіцца». У дыктарскай была нямая сцэна. Гэта адразу стала вядома кіраўніцтву. А на Святлану ўжо былі адпраўлены дакументы на прысваенне звання «Заслужанай». Дакументы вярнулі. На некалькі гадоў затрымалі прысваенне звання. А для мяне гэта было, нібы аблілі халодным душам: стала параўноўваць свой калектыў і калектыў масквічоў. Убачыла розніцу ў адносінах паміж калегамі. І тую ініцыятыву Дырэкцыі праграм ЦТ сама і прыпыніла. Дарэчы, дыктар-прыгажуня Валянціна Пячорына ў хуткім часе з'ехала ў ЗША, арганізавала там для рускамоўных дзетак папулярную праграму АБВГДэйка, і дагэтуль, як кажуць, працуе.

Наконт пераезду ў Маскву нашых вядомых артыстаў можна распавесці крышку яшчэ. У 80-х гадах мінулага стагоддзя ў нашай рэспубліцы і былым СССР быў вельмі папулярны спявак Народны артыст БССР Яраслаў Еўдакімаў. Жаночая палова гледачоў яго літаральна на руках насіла — не перабольшваю. Калі вяла канцэрты ў Маскве, на свае вочы бачыла, як ірваліся на сцэну жанчыны з кветкамі і падарункамі.

Аднойчы абвясціла Яраслава, і стаю за кулісамі, слухаю. Раптам са спіны падышоў Іосіф Кабзон і, калі да яго павярнулася, сказаў: «Очень красивый голос, да и сам красавец. Но если надумает переехать в Москву — ничего не получится». — «А почему?» — «А потому, деточка, что здесь есть я». І калі Яраслаў надумаў пераязджаць, я пераказала яму тую размову. Не паслухаў. Шоу-бізнес на той час быў у руках Іосіфа Кабзона, і Яраслаў Еўдакімаў у Маскве так і не «раскруціўся».

Падчас вядзення канцэртаў за кулісамі ўзнікалі самыя розныя сітуацыі. Канцэрт майстроў мастацтваў у Мінскім палацы спорту. З-за кулісаў на другім баку бачу Іосіфа Кабзона. Павіталіся здалёк, памахалі адзін аднаму, бачу — бяжыць на гэты бок. Непрыемна здрыганулася, ведала яго заляцанні да нашых салістак. Падрыхтавалася адбіваць атаку. Адначасова бачу з гэтага боку ўжо рыхтуецца да выхаду народны артыст БССР Віктар Вуячыч. Ён імгненна вылічыў сітуацыю, і, як толькі падляцеў Кабзон, стаў паміж намі: «Не трожь, Ёся. Эта моя женщина». Як я была нечакана ўражаная і ўдзячная Віктару Лук’янавічу. Ён павёў сябе як сапраўдны мужчына.

* * *

Сярод тых, хто працуе на радыё і тэлебачанні, заўсёды шмат розных прафесійных «анекдотаў». Прыгадаю некаторыя і я.

Дыктар беларускага тэлебачання, мой калега і напарнік, Валодзя Шаліхін быў унікальным чалавекам. Музычны аглядальнік, крытык, вядоўца, выпусціў кнігу сваіх успамінаў. Шкада, што заўчасна сышоў праз цяжкае анкалагічнае захворванне. Мы з ім разам вялі безліч розных праграм і заўсёды адчувалі плячо адзін аднаго.

Аднойчы мы з Валодзем распачыналі ранішні эфір, і я сказала: «Добры вечар, сябры!» Валодзя па-добраму шчыра рассмяяўся: «Зіна, хоць я вас і люблю, але вымушаны паправіць. Усё ж такі — добрай раніцы, таварышы!»

Альбо яшчэ адзін выпадак. Дыктар Усесаюзнага радыё Уладзімір Герцык аднойчы прадставіў чарговую песню так: «Послушайте старинный русский романс "Я на кумушке сидел"», — потым ён зрабіў паўзу: «О, простите. "Я не на кумушке, я на кАмушке сидел"».

Часцей за ўсё дыктары чытаюць падрыхтаваныя імі самімі тэксты, але бываюць моманты, калі даводзіцца чытаць тэкст, які дыктар раней не бачыў, як мы называем гэта, «з ліста». Яшчэ пры Сталіне быў выпадак, які потым доўга распавядалі.

Дыктару радыё Іллі Кургану падрыхтавалі тэкст: «Сталін — прычына бяздольнасці Савецкай арміі». Ён імгненна зразумеў памылку і прачытаў у эфіры: «Сталін — прычына бАяздольнасці Савецкай арміі».

Калі потым Ілля Львовіч паказаў напісаны тэкст рэдактару праграмы, тая заплакала: «Дзякуй, Ілюша, што выратаваў маіх дзяцей...»

На жаль, так шчасліва заканчвалася далёка не заўсёды. У Маскве мне неаднойчы прыходзілася сустракацца з Віктарам Балашовым. Мала хто ведае, што ён пачынаў сваю кар'еру на радыё ў Хабараўску і там жа ледзьве яе не скончыў назаўсёды.

А было так. Балашоў вёў першамайскі рэпартаж. Належала сказаць: «А теперь к трибуне приближается задрапированная красным кумачом машина...» Дыктар спатыкнуўся на слове і замест «задрапированная» сказаў «задрипанная»... За яго, канечне ж, напоўніцу ўзяліся «органы». Але і там часам працуюць сумленныя людзі. Адзін капітан КДБ шэптам параіў хутчэй з'ехаць з Хабараўску ў Маскву. Маўляў, у сталіцы лягчэй схавацца. Балашоў так і зрабіў. Некалькі гадоў быў у ценю, а потым стаў адным з самых вядомых дыктараў Цэнтральнага тэлебачання, Народным артыстам былога Савецкага Саюза.

Што да мяне, то да любога эфіру я рыхтавалася надзвычай скрупулёзна. Нас заўсёды вучылі, што трэба працаваць перад камерай з максімальнай аддачай. Выпадак, які адбыўся са мною, не назвала б анекдатычным. У 1982 годзе ў Беларусі шырока адзначалася стагоддзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Да нашага святкавання спрычынілася і Масква. Быў дадзены дазвол на трансляцыю ўрачыстасцяў — асноўная сцэна Вялікага тэатра Саюза ССР. Усе нашы знакамітыя нацыянальныя калектывы выехалі ў Маскву. Трансляцыя вялася толькі на Беларусь. Мяне ў нацыянальным строі пасадзілі ў бакавую ложу першага яруса. Тэлевізійная камера, якая трымала мой буйны план, стаяла праз усю залу насупраць у такой жа ложы. Я яе добра бачыла і павінна была пачаць

гаварыць, як толькі запаліцца чырвоная лямпачка ў 18.55. У зале стаяў лёгкі гул, як звычайна перад пачаткам. Мой тэкст ішоў толькі на эфір, зала яго не чула. Пачынаю гаварыць, сказала можа 5—6 сказаў, і раптам знізу чую моцны мужчынскі голас: «Зіна, Зінуля!» Бакавым зрокам заўважаю Юру Папова, карэспандэнта газеты «Советская Белоруссия», які жыў і працаваў у асноўным у Маскве. Ён паволі прасоўваецца па радзе між крэсламі, набліжаючыся да краю ложы. Разумею, што Юра не бачыць камеры і думае, што я проста сяджу. Мала таго, чую моцны жаночы голас з акцэнтам: «Она вас нэ хочэт!» Але Юра ўпарта прабіваецца, кладзе галаву на край ложы — і тут да яго даходзіць, ён чуе мой тэкст. А я тэрмінова скарачаю свой тэкст і перадаю слова сцэне, дзе сядзеў увесь беларускі ўрад. Юра ледзьве не плакаў, але ён сапсаваў мне мой выхад. У эфіры беларускія тэлегледачы бачылі мой напружаны твар і нейкую чорную мужчынскую галаву, што, набліжаючыся, закрывае мой твар. Аператар імкнуўся памяняць кадр, але ў яго не было магчымасці. Гэтую сітуацыю абмяркоўвалі ў Беларусі вельмі доўга.

А вось творчае жыццё ў дыктара Цэнтральнага тэлебачання Віктара Ткачэнкі скончылася драматычна. Ён меў рэдкую здольнасць перадаваць галасы і манеру знакамітых людзей, асабліва Л. І. Брэжнева. Ніхто не мог адрозніць, калі ён тэлефанаваў каму-небудзь ад імя Леаніда Ільіча. Аднойчы па ОРТ ішла перадача «Клуб кінападарожжаў», якую любіла ўся краіна. Віктар набірае Цэнтральную апаратную і голасам Брэжнева пачынае: «Уважаемые товарищи. Смотрю вашу передачу. Сердце радуется. Я молодею, когда смотрю вас. Спасибо вам за вашу работу». У апаратнай ЦТ заўсёды ёсць адданыя чэкісты. Улічваючы, што Віктар раней часта гэтым займаўся, за ім ужо сачылі. Папрасілі рэжысёра, які ўзяў слухаўку пацягнуць размову. А раніцай, калі Віктар Ткачэнка прыйшоў на працу, ужо вісеў загад: звольніць за непрафесіяналізм.

Запомніліся дні беларускага тэлебачання ў Македоніі. Тады гэта была агульная Югаславія, у складзе якой было

пяць рэспублік, у тым ліку і Македонія. З журналістам нашага тэлебачання Ігарам Рудамётавым мы даляцелі да Бялграду. Сустрэў нас рэдактар югаслаўскага тэлебачання Зоран Вангелаў, які і суправаджаў нас у час гэтай паездкі. З Бялграду да Скоп'е мы таксама даляцелі самалётам. На працягу трох дзён я выходзіла на экран, распавядала пра Беларусь, пра яе эканоміку, пра прыгажосць нашай прыроды, пра нашых людзей.

У 1963 годзе горад Скоп'е ўшчэнт быў разбураны землятрусам, але адбудаваны з дапамогай Савецкага Саюза. Вуліцы, у залежнасці ад таго, хто будаваў, называліся Маскоўская, Мінская, Ленінградская, Тбіліская і г.д. Дамы — звычайныя 4-5-павярховікі хрушчоўскага тыпу. Спальныя раёны. Горад гістарычнай каштоўнасці ўжо не меў.

Але калі нас павезлі ў горныя раёны — Божа, якая прыгажосць! У паездку да горада, дзе знаходзіўся македонскі жаночы манастыр, мы выехалі з самай раніцы. Ехалі даволі доўга, і калі дабраліся да старадаўняга горнага паселішча, былі вельмі стомленыя. Размясціліся ў гатэлі, наведаліся ў госці да мясцовага вучонага-этнографа. А потым рэстаран. Я ледзьве трымалася на нагах. Кажу Зорану, што, можа, не пайду. А ён так падазрона бадзёра: «Не хвалюйся, праглыні гэты вітамін, і будзеш як новая». Вядома ж, я праглынула тую маленечкую, блакітнага колеру таблетку. У рэстаране — смачная ежа, размовы, і раптам загучала музыка любімага на той час па ўсім Савецкім Саюзе грэчаскага танца «Сіртакі». І тут нейкая моц мяне падхапіла. Літаральна ўліваюся ў вялікі агульны карагод, нешта спяваю, перамаўляюся з іншымі, рагачу. Адначасова бакавым зрокам назіраю за нагамі тых, хто танчыць. І ніводнага разу не збілася. Калі музыка сціхла, менавіта на мой адрас пачуліся апладысменты і скандаванне: «Брава, брава рускай!» Калі з бялградскага аэрапорта мы выляталі дадому, Зоран, вядома ж, забыўся і не захапіў з сабой абяцаныя мне «вітаміны».

# Бураўкін

Пачну з кур'ёзу. Часам яны бывалі такія, што нават здзіўляешся, як у нашае жыццё часам уплятаюцца рознага кшталту чуткі.

Яшчэ падчас кіраўніцтва папярэдніка Генадзя Мікалаевіча Бураўкіна сакратаркай у прыёмнай працавала Станіслава Станіславаўна Плешакова. У нас былі вельмі прыязныя адносіны, доўгі час мы нават сябравалі сем'ямі. Мой муж Генадзь Мікалаевіч і яе муж Мікалай Іванавіч, былы ваенны, вельмі прадстаўнічы чалавек, разам ездзілі на рыбалку і паляванне. Улічваючы, што мой муж быў прызначаны прарэктарам ВПШ, ён забраў Станіславу да сябе сакратаркай. Пасля прыходу ў наш камітэт Генадзя Мікалаевіча Бураўкіна, тэлефаную сваймý Генадзю Мікалаевічу. Слухаўку бярэ Станіслава. «Гэта прыёмная? А як там мой Генадзь Мікалаевіч? Ці магу яго пачуць?» — кажу я. У гэты момант у дыктарскай сядзелі не толькі мае калегі дыктары. І гэтага было дастаткова, каб папаўзлі плёткі наконт маіх стасункаў з Бураўкіным...

Генадзь Мікалаевіч Бураўкін прыйшоў кіраваць на тэлебачанне замест Сямёна Пуцылева. Кіраўніцтва гэтага неадукаванага ў галіне мастацтва і культуры чалавека было самым горшым за час маёй працы. Адразу ўсе ўбачылі, якая вялікая розніца. Бураўкін ад прыроды быў надзвычай дыпламатычным, разумным і вельмі прыцягальным чалавекам. Ён унутрана адчуваў, што робіцца вакол. Як кіраўніку, яму даволі часта даводзілася адбіваць розныя ўдары і адстойваць сваю пазіцыю. Яна ў яго была вельмі моцнай. Калектыў гэта адчуў адразу ж. Усе ведалі, што Бураўкіна асабіста прызначыў П.М. Машэраў, і тое, што галоўны кіраўнік ставіцца да яго надзвычай прыязна.

На першай жа лятучцы Генадзь Мікалаевіч папрасіў усіх без выключэнняў перайсці на беларускую мову, бо мы працуем на НАЦЫЯНАЛЬНЫМ тэлебачанні. Прычым папрасіў, каб родная мова гучала як у эфіры, так і ў паўсядзённым жыцці. Ён умеў размаўляць з людзьмі, пераканаць суразмоўцу, зрабіць яго сваім аднадумцам.

Беларускасць прыйшла разам з ім з першага дня. Без перабольшвання можна сказаць, што з 1978 года пачалася эпоха Бураўкіна. Тады ж наладзілі заняткі па беларускай мове для дыктараў тэлебачання, якія праводзіў бліскучы мовазнаўца, будучы амбасадар Беларусі ў Нямеччыне, Пётра Садоўскі. Часова рабілі абмен паміж дыктарамі тэлебачання і радыё. На радыё з'явіліся новыя галасы, на тэлебачанні — новыя твары, а дыктары напрацавалі сапраўдны прафесіяналізм.

Узначаліўшы Дзяржтэлерадыё, Бураўкін адразу распачаў рэарганізацыю пэўных рэдакцый, каб больш часу аддавалася ў эфіры нашай гісторыі, спадчыне, культуры. Для ўсіх рэдакцый пашырылася сетка і аб'ёмы вяшчання, а неўзабаве з'явіўся і другі канал.

Пры Бураўкіне пачалі будаваць новы будынак тэлебачання на Макаёнка, 9. Між іншым, першапачаткова задумвалася, што на яго апошнім паверсе будзе стылізаванае пад чатыры экраны шкло, якое б атаясамлівалі з тэлебачаннем. Быццам бы ў Фінляндыі было замоўлена адпаведнае шкло. Нават яго памеры туды перадалі. Але будавалася ўсё вельмі доўга. І раптам з Саўміна прыйшло паведамленне, што грошай няма. Спонсараў тады ніякіх не было, а Машэраў ужо загінуў. І верх будынка атрымаўся зусім не такім, якім мы тады сабе яго ўяўлялі. Студыйныя павільёны для здымак ужо былі там, а рэдактарскі корпус вельмі доўга дабудоўваўся. Прыходзілася нагрыміраванымі, са зробленымі прычоскамі і ў парадных строях ездзіць з аднаго месца ў другое. Улічваючы, што тады рабілі першую лінію метро і раскапалі ўвесь праспект, дабіраліся мы нейкімі вакольнымі доўгімі маршрутамі.

Генадзь Мікалаевіч значна пашырыў колькасць гадзін перадач літаратурна-культурніцкай накіраванасці. Сталі больш увагі надаваць дзіцячым, моладзевым рэдакцыям, і на тэлебачанні пачалі з'яўляцца новыя твары. Літаратурна-мастацкую рэдакцыю ўзначаліла Вольга Іпатава, а Валодзя Содаль напоўніцу змог разгарнуцца ў рэдакцыі навукова-пазнавальных праграм. І нават пра сельскую гаспадарку стала больш цікава глядзець дзякуючы Валодзю Субату.

Наспела неабходнасць абнавіць і дыктарскую групу. У гэты час Генадзь Мікалаевіч прызначыў мяне кіраваць дыктарскай групай і каардынаваць яе работу. Сапраўды, мяне «разрывалі»: работа на тэлебачанні, канцэрты, камандзіроўкі па Беларусі, выезды за мяжу. Да таго ж дыктары былі ў большасці жанчынамі — мужчын у нашай прафесіі заўсёды было мала.

Аднойчы Генадзь Мікалаевіч запрасіў да сябе мяне і Галіну Феліксаўну Сідзельнікаву, якая была мастацкім кіраўніком дыктараў Беларускага радыё. Прапанаваў пагаварыць, параіцца наконт кадраў. Маўляў, трэба іх узмацніць і амаладзіць. Абвясцілі конкурс, аднак амаль нікога не знайшлі. Тады Бураўкін прапанаваў нам самім праехаць па абласцях. У райцэнтрах падобныя мерапрыемствы праводзіліся самастойна, а ў абласныя цэнтры з Галінай Феліксаўнай мы ездзілі асабіста. Так прыкмецілі брэсцкага дыктара Валянціна Аксенцюка, у якога была сям'я: жонка і двое дзетак. У выніку пераводу ў Мінск ён у хуткім часе атрымаў двухпакаёвую кватэру, а неўзабаве і трохпакаёвую.

У астатніх абласцях не знайшлі нікога, аднак у Гомелі ўпершыню ўбачылі Анатоля Сыса. Ён адразу звярнуў на сябе ўвагу: высокі, хударлявы, крыху нязграбны, і вельмі непасрэдны. Калі ён пачаў гаварыць, я яго спыніла. Патлумачыла, што нічога са сказанага мы не зразумелі, з дыкцыяй былі праблемы.

«Спадарыня Зінаіда, тады я больш нічога не буду гаварыць, а лепш пачытаю свае вершы...» І вось тут мы ўбачылі — перад намі таленавіты чалавек. І мы прапанавалі прыехаць на апошні тур конкурсу дыктараў у Мінск.

Сапраўды, пачуўшы ягоныя вершы, Генадзь Мікалаевіч меў з ім доўгую гутарку. А потым па яго просьбе я прывяла Анатоля да Ніла Сымонавіча Гілевіча, які тады ўзначальваў Саюз пісьменнікаў і дапамог яму выдаць першую кнігу «Агмень».

Анатоль скончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт і адслужыў у войску два гады. Добра памятаю яго ліст да мяне з роднага Анатолю Гарошкава, куды ён прыехаў пасля вайсковай службы: «Паважаная спадарыня Зінаіда! Я ў Гарошкаве. Ляжу на печы і думаю пра Вас...»

Бураўкін пасля доўгіх ваганняў узяў яго на працу, але толькі ў якасці рабочага-кабельмайстра, бо іншых вакансій тады не было. Анатолю далі пакой у нашым інтэрнаце, і ўсё было б добра, бо Генадзь Мікалаевіч амаль адразу хацеў перавесці яго ў літаратурную рэдакцыю. На жаль, не атрымалася.

Сёння цяжка сказаць, што канкрэтна стала штуршком да бяды. Пра дрэнную звычку Анатоля ўсе ведалі. Яна не раз даводзіла яго да рызыкі звальнення. Анатоль прасіў прабачэння і яшчэ нейкі час працягваў працаваць на тэлебачанні.

У тыя часы на карысць працы ў беларускім парламенце Ніл Гілевіч сышоў з пасады кіраўніка Саюза пісьменнікаў. Анатолю Сысу трэба была нейкая дапамога, і мы разам з ім прышлі ў Саюз пісьменнікаў да Леаніда Гаўрылкіна. Анатоль застаўся ў прыёмнай, а я зайшла ў кабінет. Калі Гаўрылкін даведаўся, каму трэба дапамагчы, ён пачаў мне выгаворваць: «Каму ты дапамагаеш? Мне сорамна чуць, што пра яго кажуць іншыя пісьменнікі...» На гэтым размову спыніла і выйшла з кабінета. Аказалася, Анатоль стаяў пад дзвярыма і чуў усё. Яго вочы былі поўныя слёз.

* * *

Але ж Генадзь Бураўкін быў не толькі старшынёй Дзяржтэлерадыё — ён быў і праз усё жыццё заставаўся паэтам. Часта выступаючы на канцэртах майстроў культуры, кожнага разу я імкнулася прадстаўляць беларускую паэзію. У паэтычнай жа анталогіі Бураўкіна лёгка было адшукаць

верш ці чатырохрадкоўе, якія сваім настроем былі вельмі прыдатныя для гэтых канцэртаў. Калі, напрыклад, выступаў Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Г.І. Цітовіча пад кіраўніцтвам Міхаіла Дрынеўскага, нават рэдактар філармоніі прасіў: «Будуць дні культуры, пачынай з верша Бураўкіна». Гэты верш безназоўны, але я прадстаўляла яго як «Беларуская песня»:

*Не была ты ніколі пры знаці,*
*Не стаяла ў чарзе да стала.*
*Не прасілася слёзна: «Прызнайце...»*
*Проста з людам тутэйшым жыла.*
*Лёс ягоны цярпліва дзяліла,*
*Не падсмейвалася з-за вугла,*
*Галасіла на ранніх магілах,*
*Гулкі рэй на вяселлях вяла.*
*Не прымала маны і прынукі,*
*Не сцірала загару са шчок*
*І хавала сялянскія рукі*
*Пад сатканы самой хвартушок.*
*Засталася прывабнай і годнай,*
*Абудзіла маўклівы абшар*
*Непрыкметная споведзь народа,*
*Васількавага краю душа.*

Пры Бураўкіне працаваў на тэлебачанні Уладзімір Някляеў. Запісала некалькі перадач Святлана Алексіевіч. І адну з таго цыкла — перадачу, прысвечаную Пятру Міронавічу Машэраву.

У 1990 годзе Генадзь Бураўкін на тры гады з'ехаў узначальваць беларускае прадстаўніцтва пры ААН, але ў 1993 годзе вярнуўся і кароткі час быў намеснікам міністра культуры і інфармацыі. Потым да 2001 года кіраваў часопісам «Вожык». Менавіта ў тыя гады адбылася адна даволі цікавая сітуацыя.

Яго дачка Святлана скончыла інстытут замежных моваў. Генадзь Мікалаевіч нечакана патэлефанаваў мне і сказаў:

«Зінаіда Аляксандраўна, не ведаю, як вам сказаць... На тэлебачанні будзе праходзіць конкурс дыктараў, а наша Света хоча паспрабаваць сябе ў гэтым кірунку. Я вас пра адно прашу: пастаўцеся да яе не як да дачкі Бураўкіна, а як да звычайнай канкурсанткі. Калі ў яе ёсць здольнасці, дык рашэнне застаецца за вамі, калі ж не — дык ні ў якім разе не рабіце нічога, каб прыняць яе».

Але пратэкцыя і не спатрэбілася. Святлана вылучалася сярод усіх канкурсантаў не толькі паводзінамі і знешнасцю — у яе была свая адметная, мяккая жаноцкая манера гаварыць. Камісія аднагалосна вырашыла прыняць яе на работу.

Нам патрэбныя былі дыктары інфармацыйнага плану. Яна адразу пачала чытаць інфармацыйныя выпускі і вельмі спадабалася гледачам. Ведаю гэта дакладна, бо ў нас існавала такая завядзёнка: не браць адразу чалавека ў штат, а каб месяц-другі папрацаваў дыктарам-практыкантам. Мы нават абвяшчалі ў эфіры, што, маўляў, з сённяшняга дня пачынаюць працаваць новыя дыктары, і прасілі выказваць сваю думку пра іх. І тэлегледачы сімпатызавалі Святлане больш за астатніх практыкантаў.

Усё было добра, пакуль Генадзь Мікалаевіч выразна не абазначыў сваю пазіцыю. Перш за ўсё адносна беларускай мовы. І ўлада пачала яго моцна біць. У тым ліку і з дапамогай беларускага тэлебачання. Святлана адпрацавала на тэлебачанні толькі год.

Аднойчы прыходжу ў дыктарскую, а яна раптам мне падае заяву і кажа: «Зінаіда Аляксандраўна, я буду звальняцца, бо не магу так больш. Тое, што я бачу на тэлебачанні, абсалютна непрыстойна. Я здрадзіць свайму тату не магу. Як я магу чытаць інфармацыю, дзе перакрэсліваецца пазіцыя майго таты».

Некаторы час яна была беспрацоўнай, а потым мне патэлефанавалі з амерыканскай амбасады. Патлумачылі, што да іх на работу ўладкоўваецца Святлана Бураўкіна. Аднак без рэкамендацый (такое правіла) яны не прымаюць. Папрасілі напісаць. Я ахвотна пагадзілася, і сказала

пра Свету столькі добрых слоў, што на наступны дзень яны патэлефанавалі зноў: «Нічога пісаць не трэба. Нам дастаткова таго, што вы ўжо сказалі!»

А ў другой палове 1990-х гадоў пачаліся зусім іншыя часы, калі Бураўкіну ўжо не давалі магчымасці выступаць са сваімі вершамі. Памятаю, я вяла ў Маладзечне фестываль беларускай песні, дзе мы выпадкова сустрэліся з Генадзем Мікалаевічам, які з вялікай цяжкасцю патрапіў на канцэрт. Ён распавёў, як дзяжурная ледзь не таемна пасяліла яго ў гатэлі, папярэдзіўшы: «Я вельмі добра ведаю і вас, і вашу паэзію, і даю вам месца ў гатэлі пры ўмове, каб ніхто вас не заўважыў». Гаварыў гэта Генадзь Мікалаевіч з тугою ў вачах... Запрашэнне на той фестываль ён атрымаў як звычайны глядач, а не як паэт і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, не як аўтар многіх папулярных песень і ўвогуле чалавек высокага кшталту.

Калі ж набліжалася ягонае 75-годдзе, мне здавалася недаравальным не адзначыць яго, і я ўзялася за арганізацыю — сама дамаўлялася з артыстамі і выступоўцамі. Вечарына адбылася ў канцэртнай зале Палаца мастацтваў. Праўда, не ўсе тады здолелі быць, хто абяцаў. Не прыйшлі без тлумачэнняў некаторыя кампазітары, чые песні на словы Генадзя Бураўкіна гучалі на гэтым канцэрце. Абяцалі быць таксама Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч (яны ж не толькі «Калыханку» спявалі, але і «Белы снег»), аднак перад самым канцэртам Ядзя патэлефанавала: «Прабачце, мы не зможам быць...» Але я ўдзячная ім за тое, што дапамаглі тады з апаратурай і асвятленнем ды прыслалі свайго гукарэжысёра Генадзя Ксяндзова, светлая яму памяць, з усёй апаратурай і фанаграмамі. Перад самым канцэртам пачаліся перашкоды: у канцэртную залу доўга не пускалі, а потым папярэдзілі, што нібыта ў сувязі з рамонтам будзе адключана святло. Аднак людзі сказалі: «Выйдзем на прыступкі і вечарыну будзем праводзіць там».

Тым не менш, хоць і з сумным адценнем, але ўсё прайшло добра. Гучалі вершы паэта і песні на яго словы, любімую ж Бураўкінскую «Калыханку» спявала ўся зала.

Знакамітая перадача для дзетак «Калыханка» дэбютавала ў 1981 годзе. Словы песні напісаў Генадзь Бураўкін, а музыку — Васіль Раінчык. Гэта быў выбух на ўсю краіну! Перадачу і песню ўпадабалі ўсе, ад немаўлятак да дарослых. У 2008 годзе песню Бураўкіна паспрабавалі замяніць калыханкай у выкананні спявачкі, а зараз дэпутаткі Ірыны Дарафеевай, але гэта выклікала такую хвалю людскога абурэння, што тэкст Бураўкіна праз год давялося вярнуць.

Мы, дыктары, кожны з нецярплівасцю чакалі сваёй чаргі, каб правесці «Калыханку». Пашанцавала і мне прыняць у ёй удзел у якасці «цёці Зіны». Больш за тое, аднойчы гэта словазлучэнне нават крыху «мадэрнізавалі». Маленькі хлопчык убачыў мяне на вуліцы і закрычаў: «Мама, глядзі! Цётка Буслік ідзе!»

Вельмі, трапна пра Генадзя Мікалаевіча Бураўкіна напісаў паэт Павел Саковіч:

*У Генадзя ў Бураўкіна*
*Вочы — вострыя бураўчыкі!*
*Бачыць ён усіх наскрозь,*
*Яго ж — не заўважаюць штось.*
*А ён не крыўдзіцца, ані,*
*Пласты жыццёвыя буравіць,*
*І пройдуць дні —*
*Фантан паэзіі ўдарыць.*



**9 мая 1975 года. Прамая трансляцыя з плошчы Перамогі.**



**8 мая 1975 года. Праграма да Дня Перамогі. У цэнтры — генерал-лейтэнант авіяцыі Леанід Бяда, які пазней трагічна загінуў.**



Плошча Перамогі. Ідзе прамая трансляцыя.
Злева — рукі Пятра Машэрава. 1975 г.



Здымак атрымала
з Югаславіі пасля выхаду
на Інтэрбачанне. 1976 г.



Запіс на ЦТ вакальнага квартэта «Купалінка». Масква. 1975 г.



**З Народным пісьменнікам Беларусі Іванам Чыгрынавым. Першамай. 1975 г.**



**Хлебам-соллю сустракалі чарговых гасцей у вялікай радыёстудыі. Злева ад мяне — дыктары БТ Галіна Сямёнава і Кацярына Несцяровіч, справа ад мяне — намеснік старшыні Міхаіл Суша, невядомы, сакратар партыйнай арганізацыі Валеры Скварцоў, старшыня Дзяржтэлерадыёкампаніі Генадзь Бураўкін.**



**Дыктары на рэпетыцыі. Працоўны момант. 1975 г.**



**Гомель. Мы з мамай у гасцях у Шчагловых. 1977 г.**



**Наша сямейнае фота: муж, сыны, свякроў Ніна Пятроўна. 1977 г.**



**З маімі сынамі Аляксандрам і Уладзімірам.**



**Здымак для часопіса «Работніца і сялянка»:**
**з Кацярынай Несцяровіч і Марынай Новікавай.**



**Пасля запісу праграмы «Выпускны баль». Злева направа, стаяць: акцёр Валерый Мароз, рэдактар Генадзь Паршыкаў, невядомы госць, памочнікі рэжысёра Тамара Маланіна, Маргарыта Міцкевіч, Таццяна Касмачова; сядзяць: Зінаіда Бандарэнка, рэжысёры Саша Калініна, Вера Руцкая, памочнік рэжысёра Анатоль Варэнік, рэжысёр Юрый Хашчавацкі.**



**З Народным пісьменнікам БССР Іванам Шамякіным.
На 100-гадовым юбілеі Алаізы Пашкевіч (Цёткі) на Гродзеншыне. 1976 г.**



**З Заслужаным артыстам БССР
Юрыем Смірновым і артыстам
Мікалаем Казініным. 1976 г.**



**Сустрэча з докерамі Мікалаева. 1978 г.**



Ля Каралеўскага палаца
Амаліенборг
у Капенгагене. 1978 г.




Адна нага ў Еўропе,
другая — у Азіі.




Дні культуры ў Сібіры. Свярдлоўская вобласць, недалёка ад Першаўральска. Каментатар Леанід Ларуцін, рэжысёр БТ Віктар Карпілаў, галоўны рэдактар радыё Тамара Якута. 1979 г.




**Эфір на Омскім тэлебачанні. Працоўны момант.**



**Запіс «Літаратурных сустрэч» у Доме літаратараў. Побач — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Максім Лужанін, Народны пісьменнік БССР Кандрат Крапіва, крайнія справа — Народны паэт Ніл Гілевіч БССР, Народны пісьменнік БССР Васіль Быкаў. 1979 г.**



**Нашы знакамітыя «лятучкі». У вялікай студыі радыё галоўныя рэдактары тэлебачання, справа налева: Ніна Шоба, Аляксей Хадарын, Людміла Сідаровіч, Уладзімір Душкевіч. 1979 г.**



**У касцюме для В'етнама. Перад паездкай у рэспубліку. 1977 г.**



**На сцэне канцэртнай залы «Расія». У праграме «Пятая пара года». 1982 г.**



**Віншаванні з 8 сакавіка ў перадачы «Я для мамы платье сшила». 1980 г.**



Першамай.
З Нілам Гілевічам.



З каментатарам
Эдуардам
Варашылавым.
1980 г.



Семінар супрацоўнікаў радыё і тэлебачання ў Магілёве. 1980 г.



Мая любімая
Калыханка. 1983 г.

Эфір Кастрычніцкай
дэманстрацыі.
З Уладзімірам Шаліхіным.






Нам 25 гадоў. На сцэне дыктары тэлебачання: Уладзімір Яркоў, Валянцін Аксенцюк, Галіна Сямёнава, Элеанора Давыдоўская, Кацярына Несцяровіч, Таццяна Мацюшэнка, Зінаіда Бандарэнка, Тамара Бастун, Уладзімір Шаліхін. 1981 г.



**Дні Беларускага тэлебачання ў Грузіі. Экскурсія ў Мцхету. З журналістам Беларускага радыё Давідам Дубінскім. 1982 г.**



**Кадр з праграмы «И пока на земле существует любовь». Канцэртная зала «Расія». 1986 г.**



**Дзень Перамогі. Адкрытая сцэна ва Уруччы. 1985 г.**



**Ля Дома радыё хлебам-соллю сустракаю касманаўтаў Пятра Клімука, Уладзіміра Кавалёнка, Валянціну Церашкову.**



Дом ураду. Пасля ўручэння дзеячам культуры Ганаровай граматы Вярхоўнага Савета БССР. Справа ад мяне — Народны артыст СССР, мастацкі кіраўнік Хору радыё і тэлебачання Віктар Роўда. 1985 г.



Праводзіны Мікалая Чаргінца ў Афганістан.
Фота з асабістага архіва Васіля Быкава. 1985 г.



Сын Аляксандр
пасля палёту.
1985 г.



Санаторый «Сосны». Да нас прыехалі вілейцы:
сем'і Ігнатовічаў і Сяргеяў. 1986 г.



У Вышэйшай партыйнай школе прымаюць Ніла Гілевіча і Васіля Быкава. У цэнтры — рэктар ВПШ Мікалай Пахомаў, справа Генадзь Кап'ёў. 1985 г.



На сустрэчы з тэлерадыёслухачамі: кіраўнік аддзела дыктараў радыё Галіна Сідзельнікава, дыктары радыё Тамара Лонская і Лілія Пількевіч. 1986 г.



У радыёстудыі Генадзь Бураўкін і Уладзімір Кавалёнак з жонкай.



Канцэртная зала «Расія». Са спявачкай Таццянай Арлоўскай, паэтамі Аляксандрам Лягчылавым і Барысам Бруснікавым. 1986 г.



На «Славянскім базары» ў Віцебску ў прэс-цэнтры.
З дыктарам ЦТ Заслужанай артысткай РСФСР Ангелінай Воўк. 1987 г.



З генерал-лейтэнантам авіяцыі Анатолем Сульяновым.



З рэдактарам магілёўскай газеты, будучым дэпутатам Нацыянальнага сходу Тамарай Белкінай. 1987 г.



Гомель. Каля аўтобусаў ПТС. Запіс чарговых «Чырвоных гваздзікоў».
З рэдактарамі Нінэль Лапцевай і Юрыем Савіным.
У дзень гадавіны смерці маёй матулечкі.



**Бераставіца. Побач Народныя артысты БССР спявак Яраслаў Еўдакімаў і кампазітар Эдуард Зарыцкі. 1988 г.**



**Хлеб-соль ад Рэчыцкага раёна прымае пісьменнік Уладзімір Ліпскі. Побач Ігар Лучанок. Справа — Заслужаныя артысты Беларусі дыктар радыё Мікалай Чырык і спявак Іван Краснадубскі. 1989 г.**



Наш маленькі сын Валодзя.



Валодзя прымае прысягу.



Літва. Тракайскі замак. З мужам і сынам Валодзем.



**Дыктары тэлебачання пасля дыхальнай гімнастыкі. 1988 г.**



**Пасля канцэрта Ігара Лучанка «Ты, земля, такая одна».**
**Канцэртная зала «Расія». 1988 г.**



**Па дарозе ў Мінск пасля чарговай сустрэчы з тэлегледачамі заехалі да маёй стрыечнай сястры Ганначкі ў Старыя Цярэшкавічы.**



З Ядзвігай Паплаўскай і Народным артыстам СССР Яўгенам Глебавым на аўтарскім канцэрце кампазітара.



Падчас рэпетыцыі з аўтарам праграмы «Чырвоныя гваздзікі» Бахціярам Бахціяравым. 1990 г.



З будучым міністрам культуры Леанідам Гулякам. 1991 г.




Пасля Першамайскай дэманстрацыі з салісткай Дзяржаўнага народнага хору Святланай Пярмішынай і яе дачушкай. 1995 г.



Першы «Магутны Божа». Магілёў. 1993 г.



З унучкай Машай. 1992 г.



Журналіст Ягор Хрусталёў, спявачкі Алеся Ярмоленка і Ларыса Грыбалёва, мае калегі Ірына Смольская і Саша Байкоў у Маладзечне на Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі.




Фестываль «Магутны Божа». 1995 г.



Камчатка. Бераг Ціхага акіяна. З Заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь Надзеяй Мікуліч, з супрацоўніцай мясцовай адміністрацыі Верай Трыфанавай і прыхільніцай. 1995 г.

# Побач з першымі

Не скажу, што мне выпала часта кантактаваць з першымі асобамі дзяржавы, але некалькі разоў гэта было.

Тады ў чарговы раз святкавалі дзень Перамогі. Як і зараз, ветэранская калона на чале з кіраўніком краіны ішла з боку будынку ЦК КПБ. У тыя часы кампартыяй і фактычна ўсёй краінай кіраваў, светлай памяці, Пётр Міронавіч Машэраў.

Пакуль калона падыходзіла да плошчы Перамогі, мы з Уладзімірам Шаліхіным па чарзе бралі інтэрв'ю ў ветэранаў і герояў вайны. Маім суразмоўнікам быў сталага ўзросту ветэран са шматлікімі ўзнагародамі, калі да нас падбег адзін з кадэбэшнікаў і закрычаў, каб хутчэй прыбіралі камеры, бо калона ўжо прайшла мост. Машэраў павінен быў стаць у самым цэнтры — гэта значыць, на нашае месца. Мой суразмоўца раптам рашуча мяне спыніў: «Зіна, стой! Сёння — наш дзень!» Як яго ні пераконвала, не атрымалася. Машэраву прыйшлося стаць побач са мной. Мы абмяняліся віншаваннямі.

Той момант трапіў на фота, якое мне пазней прынеслі з ЦК Кампартыі Беларусі, але Машэрава «адрэзалі». На фота засталіся толькі рукі кіраўніка беларускай кампартыі.

Дарэчы, Пётр Міронавіч Машэраў быў неверагодна сціплы чалавек. Пасля яго трагічнай смерці сям'і не засталося амаль нічога. Ні машын, ні лецішча. Калі яго дачцэ Наталлі дваццаць гадоў таму прыйшлося накіраваць на аперацыю ў Германію свайго мужа, яна прадала палову кватэры. Наколькі мне вядома, на сённяшні дзень, сям'я Наталлі Машэравай жыве даволі абмежавана ў матэрыяльным сэнсе. Адчуваю сорам, што дапусцілі такую непавагу да сям'і першай асобы Рэспублікі.

З Л.І. Брэжневым мне таксама выпала сустрэцца. Але не так блізка, як з Машэравым. Як вядома, званне горада-героя Мінску доўга не давалі. Масква ўпіралася. Маўляў, пра якi гераізм можна гаварыць, калі немцы на трэці дзень вайны былі ўжо тут, а бамбіць горад пачалі з самага пачатку.

Тым не менш, на мой погляд, Мінск трэба было адзначыць. Бо былі ж тут і гераізм людзей, і партызанскі рух, і рэйкавая вайна. Цяпер, праўда, стаўленне да яе змянілася. Партызаны зробяць сваю справу — і схаваюцца ў лес, а мясцовыя жыхары адказваюць перад немцамі, якія знішчалі ўсё вакол.

Шмат зрабіў у справе ўзнагароды Мінска журналіст Мікалай Матукоўскі. Ён працаваў карэспандэнтам «Известий» і добра ведаў, як гэта пытанне можна «прабіць». Матукоўскі меў у Маскве добрыя сувязі. І за настойлівасць у гэтай справе яго можна толькі ўхваліць.

Рашэнне пра званне ўрэшце было прынятае ў 1974 годзе. Трэба ўручаць ордэн Леніна і «Залатую зорку», а Брэжнеў усё хварэе. Прыехаць жа Генеральны сакратар ЦК КПСС змог толькі праз чатыры гады, 25 чэрвеня 1978 года. Як заўсёды, урачыстасці прызначылі ў Оперным тэатры, адкуль ішла прамая трансляцыя на ўвесь Савецкі Саюз.

Яшчэ з раніцы мяне і рэжысёра папярэдзілі: імпрэзу трэба скончыць не пазней за дзявятую гадзіну вечара. Дасведчаныя людзі шэптам патлумачылі, што гэта звязана з працягласцю дзейнасці стымулятараў, якія Брэжнеў меў у сэрцы. Праз кожныя дзве гадзіны трэба было рабіць лекавую падпітку.

І вось ідзе канцэрт. Выходжу на сцэну і бачу, што Леаніда Ільіча пасадзілі не як звычайна пасярэдзіне шостага рада, дзе атачэнне і ахоўнікі рабілі пэўны квадрат, а з краю, бліжэй да выхаду. Канцэрт спакойна ідзе. Бліжэй да абазначанага часу бачу, што вакол яго пачалася мітусня. Праз некалькі хвілін выходжу аб'яўляць наступны нумар і раптам назіраю, як яго падымаюць і літаральна нясуць да выхаду. Аб'яўляю Народны дзіцячы калектыў Палаца прафсаюзаў «Равеснік», якім тады кіравала Марына Бяльзацкая. Дзеці

ўжо стаялі за маёй спінай, я толькі на крок адышла ад мікрафона і раптам галоўная заслона — шух! — зачынілася. На гэтым канцэрт закончыўся.

Цягнік Брэжнева стаяў на вакзале, як кажуць, «пад парамі». Так выпала, што мне ў той дзень таксама трэба было ехаць у Маскву на нейкі запіс. Мой цягнік быў наступным за брэжнеўскім. І раніцай, калі прыехала ў «Астанкіна» мяне закідалі пытаннямі: «Што здарылася на канцэрце ў Мінску. А можа ЁН ужо сканаў?»

Абставіны маёй сустрэчы з М.С. Гарбачовым былі зусім іншымі.

У СССР віравала перабудова. У якасці Генеральнага сакратара ЦК КПСС у Мінску Міхаіл Сяргеевіч быў толькі адзін раз, у лютым 1991 года. Паўдня ён наведваў розныя прадпрыемствы, потым быў кароткі абед і канцэрт у філармоніі. Але любіў Міхаіл Сяргеевіч пагаварыць на вуліцы з людзьмі. І на гэты раз размова зацягнулася. Трансляцыі не было. А я, каб падрыхтавацца, прыйшла ў філармонію значна раней. На ўваходзе праверылі дакументы. Па завядзёнцы, узяла ключ ад касцюмернага пакоя на другім паверсе, там звычайна пераапраналіся салісты і вядоўцы. Але туды не пускаюць спецслужбы. Усіх адпраўляюць пераапранацца ў падвал. Удзельнікаў канцэрта было больш за дзве сотні. А падвал цяжка назваць касцюмернай. Выкарыстоўвалася гэтае памяшканне для складавання рознага скарбу філармоніі — інструменту, дэкарацый і г.д.

Божа мой! Мне толькі-толькі пашылі новы канцэртны строй. Гэта быў мой першы выхад на сцэну ў ім. Мастак-мадэльер Дома мадэляў Іна Булгакава намалявала вельмі прыгожы эскіз! Гэта быў цуд! З белага крэпдэшыну, увесь расшыты золатам, буйны арнамент нацыянальнай вышыванкі ў карычневым колеры выглядаў стылёва і вельмі сучасна. Словам, не для падвала ён. Я падышла да супрацоўніка КДБ: «Калі ласка, прапусціце. Там касцюмерка, люстэрка, усе мае грымёрныя прылады!» На шчасце, ён пагадзіўся і прайшоў са мной, праверыў, ці закрытая фортка, і параіў не падыходзіць да акна.

Было гэта за гадзіну да запланаванага пачатку канцэрта. Гарбачоў яшчэ не прыехаў. Я спусцілася ўніз і расказала пра ўсё рэжысёру канцэрта Валянціну Дудкевічу, з якім мы шмат супрацоўнічалі. Гэта ўжо быў рэжысёр новай фармацыі, Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, Народны артыст Рэспублікі, які і сёння з'яўляецца мастацкім кіраўніком Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі.

Вокны касцюмернай выходзяць на вуліцу, якая цяпер называецца «Бульвар Мулявіна». Менавіта з боку ўніверсама «Сталічны» павінен быў прыехаць Гарбачоў і з бакавога ўваходу ўвайсці ў філармонію. Там ужо быў засланы чырвоны дыван. Час ад часу я ўсё ж пaглядала ў акно. Картэж генсека нарэшце пад'ехаў. З машыны вышлі Міхаіл Сяргеевіч і яго жонка Раіса Максімаўна. Імгненна вакол іх аказалася процьма людзей, і Гарбачоў затрымаўся яшчэ на гадзіну. Бедныя артысты, якія ўвесь гэты час туліліся ў падвале!

Урэшце Гарбачоў з жонкай накіраваліся ў канцэртную залу, а я таксама спусцілася ўніз за кулісы. Мы з Дудкевічам пачалі назіраць у дзірачку, якая на ўсіх сцэнічных заслонах зроблена спецыяльна. Заслона была закрытая, але мы бачылі ўсё, што робіцца ў зале. Міхаіл Сяргеевіч з Раісай Максімаўнай павольна падышлі да свайго шостага рада, які быў увесь пусты, і пачалі дзякаваць паклонамі. Атрымліваю каманду — выходзь. Адчуваю, што яшчэ рана, бо чую гучныя апладысменты, і яны ўсё кланяюцца. Мяне літаральна выпіхвалі на сцэну, а я ўпіралася. Як толькі адчула, што ў зале цішыня, выйшла за генеральную заслону да мікрафона. Зала зноў узарвалася апладысментамі. На мой погляд, не мне, а строю, які стварыла Іна Булгакава. Потым так ёй і сказала. Настолькі гэта было шыкоўна! Шкада, што аддала яго ў грымёрку. Напэўна, ужо і выкінулі.

На працягу ўсяго канцэрта Раіса Максімаўна нешта запісвала ў нататнік. Гэта, вядома ж, бачылі са сцэны ўсе ўдзельнікі канцэрта, а потым было шмат размоваў на гэту тэму. Першая лэдзі краіны, разумная, заўсёды прыгожа апранутая. Гэта не Ніна Пятроўна Хрушчова альбо Вікторыя Пятроўна Брэжнева, за якіх нам заўсёды было трохі сорамна.

Наколькі мне вядома, у першых лэдзі завядзёнка — ніколі не паўтарацца і двойчы не выходзіць на публіку ў адным і тым жа строі. І ўвогуле, да сваіх строяў некаторыя ставяцца вельмі раўніва. Асабіста ў мяне была даволі непрыемная гісторыя, звязаная з жонкай Ціхана Якаўлевіча Кісялёва, які тады быў старшынёй Саўміна Беларусі, а пасля смерці Машэрава ўзначаліў кампартыю рэспублікі, Нінай Фёдараўнай.

Як вядома, заробкі ў дыктараў заўсёды былі даволі сціплымі. На адзенне давалі па сто рублёў на год. Потым ужо нам крышку дабавілі грошай. Але гэта было значна пазней. Даводзілася шмат набываць за свой кошт. Усё кардынальна змянілася з прыходам каляровага тэлебачання. У нас з'явілася свая грымёрка, касцюмерка, а таксама грымёры і нават касцюмер. Прыемна мне дадаць, што некаторы час у нас працавала вядомая ў Мінску Тамара Ганчарова, якая адказвала за знешні выгляд дыктараў. Зараз яна ўзначальвае мадэльнае агенцтва «Студыя Тамара».

Для мужчын вырашыць пытанне добрага строю было значна прасцей, а жанчынам заўсёды трэба было шукаць нейкія варыянты. Адзінае, нас пускалі на базы, куды завозілі імпартныя рэчы. А вось дзе шыць, прыходзілася шукаць самому. Калі я ўжо была мастацкім кіраўніком дыктарскай групы (а гэта было 14 асоб), то пайшла на прыём да дырэктрысы пашывачнага атэлье Савета Міністраў. Тады гэта была Мар'яна Васільеўна Травіна. У нас адразу склаліся добрыя прыязныя адносіны, якія захаваліся на ўсё жыццё. Да гэтага атэлье дыктараў Беларускага тэлебачання і «прымацавалі». Нашы бухгалтары пераводзілі туды грошы — і ніякіх праблем надалей не было.

Канечне, больш за ўсё строяў выпадала шыць мне, бо даводзілася весці безліч канцэртаў, у тым ліку і ўрадавых. Акрамя гэтага было шмат розных выездаў. І мне, як кажуць, прыходзілася круціцца. Не раз нешта купляць альбо шыць прыватным чынам. Аднойчы ў атэлье Саўміна мне пашылі вельмі прыгожы новы строй. Я б сказала так: ён быў акадэмічна-эстрадным, больш прыстасаваным для

канцэртаў. Гэта была тканіна з люрэксам французскай вытворчасці. Тканіны ў партыйныя атэлье прывозілі з усяго свету. Калі ў крамлёўскую швейную майстэрню прыязджала дачка Леаніда Брэжнева Галіна і шыла сабе нейкі строй, то мясцовая дырэктарка адразу загадвала: «Прыбраць!» І цэлы рулон некуды «знікаў», каб потым з яго не пашылі каму-небудзь яшчэ. Напэўна, такая завядзёнка была і ў нас.

Першы раз у новай сукенцы выйшла на канцэрце ў Палацы спорту. Два аддзяленні. Як заўсёды, у першым я выходзіла ў вышыванцы ці нацыянальным строі. А да другога пасавала новая сукенка. Усім артыстам яна вельмі спадабалася. Шчаслівая пасля канцэрта прыехала дадому. З раніцы прыходжу ў дыктарскую, і адразу тэлефонны званок ад Травінай. Мар'яна Васільеўна нейкім дзіўным голасам пацікавілася, у якой сукенцы я ўчора была. Адказала. Тады яна спытала, ці магу зараз яе ўзяць і прыехаць у атэлье? Яна высылае за мной машыну. Ну, думаю, — УСЁ. Справа ў тым, што ззаду новай сукенкі была даволі доўгая шліца, якая для тых часоў лічылася занадта смелай. Падумалася, што нехта з чыноўнікаў звярнуў увагу. Аказалася, прычына зусім іншая.

Прыехала ў атэлье. У Мар'яны Васільеўны быў чырвоны ад хвалявання твар. Паклала на стол сукенку і спытала, што здарылася? Тая ў адказ: «Я зрабіла непапраўную памылку. Мы пашылі вам сукенку з той самай тканіны, з якой раней рабілі касцюм Ніне Фёдараўне Кісялёвай!» Так атрымалася, што менавіта ў гэтым самым касцюме яна прыйшла на канцэрт. Калі я ў другім аддзяленні выйшла на сцэну, то ўсе астатнія жонкі, якія былі ў той самай ложы, пачалі з усмешкай паглядаць на Ніну Фёдараўну. Яна схапіла сваю сумачку і хутка выйшла з ложы.

Раніцай жонка Кісялёва была ў кабінеце Травінай. Як яна зняважвала бедную Мар'яну Васільеўну, можна толькі здагадвацца, аднак фраза Травінай: «Каб я не падсунула бліжэй да сябе гэтую папяльнічку, яна б, пэўна, кінула яе ў мяне!» — гаворыць пра многае. Дадам таксама, што жонка Кісялёва працавала тады ў міністэрстве адукацыі.

Мар'яна Васільеўна прапанавала пакінуць сукенку, а ў трохдзённы тэрмін пашыць для мяне іншую. Я адказала, што заўтра еду з «Песнярамі» ў Маскву, учарашні варыянт майго адзення ўсім спадабаўся, а прамой трансляцыі адтуль не будзе. Яна пагадзілася. Ніякіх трансляцый, сапраўды, не было, аднак гэта не дапамагло. Праз пэўны час Мар'яну Васільеўну Травіну звольнілі і адправілі на пенсію. Нас, усіх дыктараў, перасталі там абслугоўваць. Пасля атэлье Саўміна мы наладзілі стасункі з Беларускім цэнтрам моды, і гора больш не ведалі.

Дарэчы, з «Песнярамі» я працавала не аднойчы. Канцэрты ў Дзяржаўнай цэнтральнай канцэртнай зале «Расія» заўсёды ішлі па некалькі дзён з поўным аншлагам. Тое, што зрабіў Уладзімір Мулявін для Беларусі, немагчыма ацаніць. З Валодзем вельмі прыемна было знаходзіцца на сцэне. Ён адчуваў сваіх салістаў, музыкантаў, гледачоў, паводзіў сябе без найгрышу, вельмі натуральна. З пачатку 80-х гадоў побач з ім была ўжо Святлана Пенкіна, светлая ёй памяць. Я па-ранейшаму шкадавала, што ён развітаўся са сваёй першай жонкай Лідзіяй Кармальскай, якая была для Валодзі паплечніцай і памочніцай ва ўсіх яго справах, і якую любіла ўся філармонія. Менавіта такая жонка павінна быць у геніяльных людзей. А Святлана — кінаактрыса, якая пасля здымкаў у кінафільмах адчувала сябе зоркай на першых ролях і патрабавала да сябе ўвагі, як і ўсе ў калектыве.

Пра прывілеі савецкіх часоў сказана і напісана нямала. Не буду паўтарацца. Пра тое, як працавала элітная лечкамісія, да якой мы, артысты, былі прымацаваныя, трэба сказаць адным словам: «выдатна». Гэта было поўнае паразуменне паміж пацыентамі і медперсаналам. І вось фінал. Калі лечкамісія пераязджала ў Ждановічы, адна мая добрая знаёмая, Заслужаная артыстка Беларусі, спыталася ў рэгістратуры: «Хто ж там будзе абслугоўвацца, калі нікога з нас не бяруць?» Ёй адказалі: «Эліта», — і дадалі: «Вышэйшыя дзяржаўныя асобы і героі Савецкага Саюза». Улічваючы, што апошніх амаль не засталося, гутарка цалкам ішла пра чыноўнікаў featuresрознага кшталту.

Мастакі, кампазітары, пісьменнікі, вучоныя — больш не эліта грамадства...

Мая першая сустрэча з Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам адбылася ў 1993 годзе, калі ён быў яшчэ дэпутатам Вярхоўнага Савета. Я вяла заключны канцэрт «Славянскага базару» ў Віцебску. Амфітэатр у Віцебску быў мне добра знаёмы яшчэ з 1988 года, калі была вядучай першага Фестывалю польскай песні. Перад самым заканчэннем канцэрта за кулісы да мяне падышоў Уладзімір Віктаравіч Грыгор'еў, які, дарэчы, быў ініцыятарам будаўніцтва віцебскага амфітэатра. У той час ён ужо не быў кіраўніком Віцебскага абкама КПБ, а генеральным дырэктарам завода даламітавай мукі. Ён прапанаваў адразу не ехаць у гатэль, а запрасіў мяне разам з Міхаілам Фінбергам на «маленькі» пачастунак.

Грыгор'еў прывёз нас у катэдж, які знаходзіўся пад Віцебскам. Адразу прапанавалі падняцца на другі паверх, дзе ўжо быў накрыты стол для гасцей. У правым куце сядзелі два чалавекі, у якіх (па тэлетрансляцыях пасяджэнняў Вярхоўнага Савета) я пазнала А.Р. Лукашэнку і У.Н. Канаплёва.

Селі за стол. Нас было каля трыццаці чалавек. Міхаіл Якаўлевіч умее на такіх «мерапрыемствах» падтрымліваць размовы. Заўсёды дасціпна жартуе, расказвае шмат анекдотаў. Хутка загулі застольныя размовы, якія перыядычна перапыняліся тостамі. І толькі А.Р. Лукашэнка з У.Н. Канаплёвым, якія сядзелі насупраць, былі як бы па-за межамі кампаніі. Мне захацелася прыцягнуць іх да размовы. Спытала: «Мы бачым па трансляцыях, як вы змагаецеся з карупцыяй. Хто ваша каманда? Каму вы давяраеце?» У адказ прагучала змрочнае: «Нікому».

На жаль, цяпер калектыў Міхаіла Якаўлевіча стаў як бы другасным. Створаны Прэзідэнцкі аркестр атрымаў ролю, якую раней выконвалі музыканты Фінберга.

# Жыццё наша непрадказальнае

1974 год. Урачыстасці з нагоды вызвалення Беларускай ССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Палацы спорту. Спецыяльна да гэтай даты Яўген Глебаў напісаў араторыю на тэкст Петруся Макаля «Мы славім Радзіму сваю».

На ўступе да араторыі я выходзіла на сцэну і чытала верш Петруся Макаля, фонам гучала мелодыя Яўгена Глебава. Я ўжо дакладна не памятаю, хто быў рэжысёрам таго канцэрта. Хутчэй за ўсё, Юрый Парыгоравіч Ужынцаў. Дырыжор зводнага аркестра параіў мне ўважліва слухаць мелодыю і кожнае чатырохрадкоўе пачынаць чытаць па ўзмаху яго рукі. Пасля заканчэння верша ўступаў зводны хор, які складаўся не толькі са сталічных, але і з абласных прафесійных калектываў.

Рэпетыцыі пачаліся за некалькі дзён. Улічваючы, што сцэна была занятая іншымі ўдзельнікамі гэтага маштабнага відовішча, мяне разам з піяністкай Людмілай Малышавай накіравалі на кватэру кампазітара Яўгена Глебава, які жыў, можна сказаць, насупраць Палаца спорту на Паркавай магістралі, якая цяпер завецца праспектам Пераможцаў. Тады і пазнаёмілася з жонкай кампазітара Ларысай Васільеўнай, з якой мы сябруем і па сёння.

Не магу сказаць, што за першы дзень рэпетыцый мы дамагліся нейкага поспеху: я чытала верш — мелодыі альбо не хапала, альбо заставаўся кавалак. Яўген Аляксандравіч бачыў, што я ў прыгнечаным стане. Мне трэба было ехаць на тэлебачанне на Камуністычную, 6, я заспяшалася, і ён прапанаваў правесці мяне да аўтобуснага прыпынку, які і цяпер знаходзіцца ўнізе каля Свята-Духава кафедральна-

га сабора. Гэты прыпынак заўсёды шматлюдны. Мы ўвесь час эмацыйна размаўлялі, на нас з цікавасцю паглядалі...

Да самой урачыстасці заставаліся яшчэ два дні. На наступны дзень, калі прыйшла на рэпетыцыю ўжо ў Палац спорту, у зале ўбачыла маю любімую артыстку Купалаўскага тэатра Марыю Захарэвіч. Адразу зразумела: гэта для мяне падмога, а можа, і замена мне. Усё распавяла Машы. «Пакажы верш», — папрасіла яна. Прабегла вачыма і параіла: «Ніякіх паўз! Мы не вакалісты, мы чытальнікі, паўзы робяцца па патрэбе, інакш будзе згублены і сэнс, і вершаваны малюнак». — «Дзякуй, Маша!»

Калі пачалі рэпетаваць араторыю Глебава, прачытала менавіта так, як параіла Марыя. На рукі дырыжора не звяртала ўвагі. Зараз прыгадаю гэты твор Петруся Макаля. Думаю, вам будзе цікава.

*Каля гаю крыніца,*
*Звон расінкі лагоднай,*
*Што дае мне напіцца*
*Чысціні першароднай.*
*З той крыніцы чароўнай,*
*З залацістага донца*
*Чэрпай жменяю поўнай*
*І нябёсы, і сонца.*
*З той крыніцы рачулка,*
*Як дзіця, трапяткая,*
*Выбягаючы гулка,*
*Акіяна шукае...*
*Мы — з крыніцы адзінай.*
*Мы, як злітыя рэкі,*
*Нашай любай Радзімай*
*Мы з'яднаны навекі.*

Каментаваць не буду. Але значна пазней, на іншых канцэртах, калі я чытала гэты верш са сцэны, бачыла слёзы на вачах людзей, а тады на рэпетыцыі ў Палацы спорту мяне нехта нават пахваліў. Зноў падышла да Машы. Я сапраўды

была ёй вельмі ўдзячная. На самім канцэрце ўсё прайшло выдатна.

У 1980 годзе ў Мінску праходзілі Алімпійскія гульні, а дакладней — некалькі матчаў алімпійскага футбольнага турніру. Перад пачаткам гульняў было вырашана даваць невялікія тэкставыя замалёўкі-дзённікі на 10 хвілін — я ў нацыянальным строі на фоне музыкі Яўгена Глебава з кінафільма «Апошняе лета дзяцінства» кожны дзень з розных месцаў сталіцы гаварыла прыгожыя словы пра Беларусь, пра тое, як мы рыхтуемся да Алімпіяды—80. Першая пляцоўка была на скрыжаванні вуліц Кірава і Леніна, побач з будынкам Вярхоўнага суда БССР. Мяне пасадзілі спінай да стадыёна «Дынама» на высокі куб. Аўтобусы, «перасоўна-тэлевізійныя станцыі» (ПТС) перакрылі рух... Калі давалі на поўную моц фанаграму глебаўскай мелодыі ў выкананні Эстрадна-сімфанічнага аркестра Беларускага радыё і тэлебачання пад кіраўніцтвам Заслужанага артыста БССР Барыса Райскага, не толькі я, але і ўсе мінчукі, якія шчыльна аточвалі нашу пляцоўку, адчувалі ўзнёсласць, натхненне, пачуццё палёту. Гэта была менавіта маршавая музыка. Раней гэтая мелодыя вельмі часта гучала па тэлебачанні.

Пасля знаёмства з Ларысай Васільеўнай Глебавай я часам яе ўзгадвала і... параўноўвала. З кім?

У нашай дыктарскай групе працавала найпрыгожая жанчына Давенора Галкіна. Мы з ёй сябравалі. Яна адна выхоўвала маленькую дачушку. З мужам, артыстам тэатра імя Горкага, жыццё не склалася. Усе ведалі, што Яўген Аляксандравіч Глебаў вельмі любіць нашу Вету. І раптам — разрыў. Я ніколі ў сяброўкі пра гэта не распытвала. Была ўпэўнена, што ініцыятарам таго разрыву быў Яўген Глебаў. Усё гэта адбывалася да сустрэчы Яўгена Аляксандравіча і Ларысы Васільеўны.

А Вета была вельмі добразычлівым, лёгкім у зносінах чалавекам з неверагодным пачуццём гумару. Аднойчы Галкіна прымусіла не проста смяяцца, а рагатаць усю тэлеглядацкую аўдыторыю, калі чытала ў кадры аб'яву пра тое, што ў крамы Мінска паступілі ў продаж электраяйка-

варкі. Напярэдадні рэдактар прынесла некалькі аб'яў, паклала на дыктарскі стол, сказала: перад мастацкім фільмам будзе паўза — прачытаеш. Калі ў эфіры дайшла чарга да гэтай самай аб'явы, Вета весела ўсміхнулася. Сапраўды смешна: і такога зместу аб'явы даводзілася чытаць тады дыктарам у кадры. «Паступілі ў продаж электраяйкі... — з усмешкай прамовіла Давенора. Потым: — Варкіяйкі... Яйкаваркі...» Карацей, перабірала розныя варыянты, і ўжо цяжка было стрымліваць смех, але Вета трымалася так лёгка і натуральна, што пра гэта доўга распавядалі, а тэлегледачы прасілі аб'явіць дыктару Давеноры Галкінай падзяку.

Праз некаторы час Давенора выйшла замуж за маскоўскага кінадраматурга Аляксея Лявонцьева і, на наш вялікі жаль, з'ехала ў Маскву. І толькі цяпер Ларыса Васільеўна распавяла мне, што ініцыятарам разрыву была сама Вета, а калі больш дакладна, то яе дачка Лёля, якая рашуча не прыняла Яўгена Аляксандравіча. І каб не траўмаваць дзіцяця, маці вырашыла разысціся з каханым. Цяпер Лёля таксама жыве ў Маскве. Божа! Як усё ў нашым жыцці пераплятаецца, непрадказальна сыходзіцца і разыходзіцца...

Так, я заўсёды параўноўвала гэтых дзвюх жанчын. На мой погляд, адна адной не саступае ні ў чым: ні прыгажосцю, ні розумам, ні інтэлігентнасцю, ні пачуццём гумару. І з адной, і з другой, калі размаўляем (цяпер у асноўным па тэлефоне), насмяёмся ад душы. Як гэта важна ў нашым цяперашнім жыцці!

* * *

2012 год. Спартыўны самалёт са Швецыі заляцеў у Беларусь і раскідаў па нашай зямлі плюшавых мядзведзікаў. Калі пачула пра гэта, уявіла, як радасна адрэагавала б нейкае дзіцятка, каб злавіла аднаго з іх. Але да парушэнні мяжы як быццам бы меў дачыненне Надзвычайны і Паўнамоцны амбасадар Каралеўства Швецыя ў Рэспубліцы Беларусь паважаны спадар Стэфан Эрыксан. Беларускі бок вырашыў не працягваць яго акрэдытацыю.

Часта ўспамінаю суботнюю раніцу ў канцы кастрычніка за два гады да той падзеі. Тэлефонны званок, і вясёлы голас:

— Добрай раніцы, спадарыня Зінаіда! Чым займаецеся?

— Збіраемся на лецішча.

— Вазьміце нас з Веранікай. Мы дзяцей адправілі на вакацыі і зараз вольныя.

— Божа, будзем шчаслівыя, калі ласка!

Паехалі. Акрамя нас была яшчэ адна нечаканая госця: залацісты рэтрывер Вафля, якая вельмі далікатна паводзіла сябе ў машыне. Пад'язджаем да хаты. Пачуўшы і ўбачыўшы Вафлю, мясцовыя «лайкі» напачатку пачалі кідацца на яе. Тая і ўвагі не звярнула на іх. Калі выскачыла з машыны — выхавана і інтэлігентна — яе высокая постаць не зварухнулася з месца. І тыя раптам змоўклі і неяк лісліва падціснулі хвосцікі. Яны пачалі падыходзіць бліжэй, і мы адчулі, што ім захацелася дакрануцца да гэтай прыгожай, годнай істоты. Мы ўсе з усмешкай назіралі за гэтым.

І хаця стаяў цёплы дзень, у нятопленай хаце было халаднавата. Мой гаспадар Генадзь вызваўся растапіць камін і згатаваць ежу, а мы рушылі ў грыбы. Лес за плотам. А Вераніка, жонка амбасадара, — заўзятая грыбніца. І пачалося: толькі і чуваць галасы: знайшла абабак, а я лісічку! А тут шмат кабылак, а ў мяне сыраежкі... Шкадавалі, што не знайшлі ніводнага рыжыка: іх сезон скончыўся.

І наша гаворка пра навакольны і раслінны свет Беларусі і Швецыі, пра тое, чым падобныя і чым адрозніваюцца нашы людзі, якія рысы характару найчасцей сустракаюцца ў шведаў і беларусаў... Прыгадалі, што ў часы Вялікага Княства Літоўскага ў нас была агульная мяжа. Так, была і вайна, але мы былі хаўруснікамі, а Браслаўскі павет нейкі час уваходзіў у Шведскае каралеўства і нават паспеў атрымаць узнагароду.

Вярталіся да абеду. Хата пратопленая, бульбачка беларуская зварана, марынаваныя белыя грыбочкі і шмат чаго на стале... Мой гаспадар парупіўся.

І зноў — размовы. Я ведала, што Стэфан Эрыксан наведвае беларускія сем'і. Яму цікава было ведаць узаема-

адносіны родзічаў, блізкіх людзей, іх выхаванне, звычкі, традыцыі. У сваіх выступах ён распавядаў пра нас тое, чаго мы самі пра сябе не ведаем. Колькі рабіў амбасадар дзеля таго, каб нашы народы адчувалі сябе, нягледзячы на адлегласць, блізкімі!

Стэфан Эрыксан паказаў нам добры прыклад, як хутка можна вывучыць мову, карыстацца ёю, і быць такім прыцягальным чалавекам. Ён жа, адным з першых, пераклаў на шведскую мову некалькі апавяданняў Васіля Быкава, і ягоным прыкладам кіраваліся іншыя замежныя дыпламаты.

Ведаю, што шчыры сябар Беларусі славацкі амбасадар Любамір Рэгак, які таксама добра вывучыў беларускую мову (у яго кабінеце на сцяне вісела мапа Вялікага Княства Літоўскага), у гэты ж час пераклаў на славацкую мову вершы Ніла Сымонавіча Гілевіча.

А жыццё сапраўды робіць такія павароты! Пройдзе час, і спадар Стэфан яшчэ вернецца ў Беларусь.

* * *

Павел Шарамет. Гонар беларускай журналістыкі. І яго таксама няма побач з намі.

Не верыцца, што гэта здарылася: перад вачыма яго вобраз, добразычлівы позірк. Успамінаюцца самыя розныя нюансы нашых сустрэч, нейкіх падзей, на якіх пашчасціла перамовіцца, быць разам.

Калі Павел з’явіўся на беларускіх каналах у праграмах «Праспект» і «Эканаміст», гэта стала падзеяй, бо па тым часе гэта быў зусім іншы тыпаж журналіста: журналіст-суразмоўца, які спакойна, лагодна і добразычліва, робячы нечаканыя паўзы, думаў і прымушаў думаць нас, тэлегледачоў. Многія беларускія тэлевядучыя яго не ўспрынялі, таму што самі пайшлі па лёгкім шляху: і па сённяшні дзень шмат хто, карыстаючыся тэлесуфлёрам, гаворыць хутка, без унутранага перажывання, не вядзе дыялог з тэлегледачамі, як гэта рабіў Павел. На жаль, не вельмі часта на тэлебачанні нам даводзілася пры сустрэчах вітацца. І раптам даведваюся: абедзве яго праграмы выціснулі з эфіру.

Ужо калі працаваў на расійскім канале «ОРТ», Павел разпораз наведваў Беларусь, па-ранейшаму сачыў за нашым палітычным жыццём. Аднойчы арганізаваў канцэрт «Рок за свабоду» з удзелам расійскага музыканта і спевака Вячаслава Бутусава і групы «Ю-Піцер». Улады дазволілі імпрэзу на плошчы Бангалор пры ўмове, што на сцэну не выйдуць апальныя гурты «Палац», N.R.M., «Нейра Дзюбель», «Крама», спявак Зміцер Вайцюшкевіч. І вось што прыдумаў Павел: каб перад пачаткам канцэрта разам з шэрагам нашых палітыкаў я выйшла на сцэну і сказала некалькі слоў пра Беларусь. Хадзіла, думала, хвалявалася, што сказаць.

Прыехала, прабілася да сцэны. Першае ўражанне: моладзь ідзе ды ідзе, мноства міліцыянтаў. Павел папярэдзіў, каб была гатовая да выступлення ў любую хвіліну. Нікога з выступоўцаў не было бачна. І толькі пад'ехаў мікрааўтобус з Бутусавым — і войкнуць не паспела, як узляцела на сцэну з дапамогай Паўла. Ён яшчэ паспеў крыкнуць: «Ваша выступленне чацвёртае, пачынайце без паўзы!»

Тым часам беларускія музыканты сказалі па некалькі слоў і — мая чарга. Прачытала тры чатырохрадкоўі пра Беларусь. Прыгадаю апошняе:

*Адчыніць гатовы дзверы*
*І на захад, і на ўсход,*
*Бо жыцця і лепшай долі*
*Ўсё чакае наш народ.*

— Калі вас сабрала гэтая плошча з удзелам Вячаслава Бутусава, — перайшла я на прозу, — вы падтрымліваеце акцыю «Рок за свабоду»?

— Так! — грымнуў натоўп.

— Вы за тое, каб наша Беларусь была вольнай, незалежнай, дэмакратычнай дзяржавай?

— Так! — разнёсся дружны кліч тысячаў маладых суайчыннікаў.

— Тады — жыве Беларусь!

— Жыве! — на ўсю моц выгукнула шматтысячная плошча.

Кажуць, што многія прыйшлі тады на канцэрт, каб проста паслухаць вядомага расійскага спевака, але для мяне гэта было сапраўднае яднанне беларусаў. Я была так уражаная гэтым эмацыянальным відовішчам, што не заўважыла, як зноў апынулася на руках Паўла Шарамета. Ён асцярожна паставіў мяне на зямлю. Трэба было хутчэй выбірацца з натоўпу, бо ўжо чуліся крыкі адказных за парадак чыноў: «Хто дазволіў? Адкуль яна ўзялася? На сцэну нікога не пускаць!»

Тым часам Анатоля Лябедзьку, Валерыя Фралова, Сяргея Калякіна не дапусцілі да сцэны. Дагэтуль не разумею, як Паўлу ўдалося ўсё пралічыць, зарыентавацца і зрабіць так, каб я паспела прамовіць свае словы.

Ніколі не забуду, як частавала ў сябе дома Паўла Шарамета і Святлану Калінкіну смажанымі ў кляры грыбамі-парасончыкамі. І як, смакуючы і смеючыся, ён па-дзіцячы захапляўся пачастункам, імкнучыся адгадаць: з чаго ж гэта прыгатавана — мяса птушкі ці труса?

Гэта Павел пазнаёміў мяне і майго мужа з Барысам Нямцовым. Мы паехалі ў Маскву на сустрэчу з прадстаўнікамі дэмакратычных колаў Расіі. На Беларускім вакзале нас сустракаў Павел. І калі мы выехалі з прывакзальнай плошчы, ён раптам прапанаваў: «У нас яшчэ ёсць час. Заедзем да Барыса Нямцова?» Божа, гэта была такая нечаканая і такая радасная сустрэча! Мне падалося, што вялікая зала офіса стала цеснай для гэтых двух вялікіх і прыгожых мужчын. Адразу адчулася, што яны сябры: задавалі нам пытанні і адначасова абменьваліся ўражаннямі, жартавалі.

Знешне яны былі вельмі розныя, і адначасова было такое падабенства паміж імі: абодва валодалі выключнай харызмай, пачуццём гумару, нейкай прыцягальнай сілай і даверлівасцю позірку. Даведаўшыся, што мы не былі яшчэ ў храме Хрыста Збавіцеля, арганізавалі нам яго наведванне. Тады не было ніякага прадчування велізарнай трагедыі, непапраўнай страты для Беларусі, Украіны і Расіі. Нашага Паўла не стала праз год пасля забойства Барыса Нямцова...

У дзень, калі грымнуў той страшэнны выбух у цэнтры Кіева, з самага ранку і да позняй ночы, і ў наступны дзень

амаль усе асноўныя тэлеканалы Украіны (у адрозненне ад беларускіх) вялі праграмы пра Паўла Шарамета. Колькі цікавых фактаў, колькі людзей выказваліся пра слыннага сына Беларусі! Не забуду словы маладога ўкраінца: «У Беларусі Шарамет адседзеў у турме, з Расіі яго выціскалі як маглі, а ва Украіне яго забілі».

Калі ішла на развітанне ў храм Усіх Святых, перад вачыма праходзілі тэлекадры развітання ва Украіне. Гэта там, а ў нас... Скажу шчыра, хвалявалася: лета, субота, лецішчы... Дый урэшце беларусы прыйсці пабаяцца... І заплакала ад палёгкі, калі ўбачыла бясконцы ланцужок людзей з кветкамі. І, колькі там была, ён не змяншаўся.

Дзякуй вам, людзі, што разумееце, што адбываецца побач з намі і што трэба рабіць, каб нашы дзеці і ўнукі не зведалі, што такое вайна, якая можа ўварвацца ў наш такі крохкі мір!

* * *

Але перанясемся на год назад.

8 кастрычніка 2015 года. Дзень прысуджэння Нобелеўскай прэміі. Даўно я так не хвалявалася, калі глядзела трансляцыю са Стакгольма ў гэты дзень, і ў дзень, калі ўручалі нашай Святлане Алексіевіч Нобелеўскую прэмію.

Так!

Ведай нашых!

Ведай, свет, Беларусь!

Вось такія мы, беларусы!

Мне вельмі прыемна, што некалі вельмі даўно мы з ёй пазнаёміліся на тэлебачанні, што яна прымала ўдзел у перадачах, якія мы вялі разам з Алесем Адамовічам. І сама Святлана рабіла аўтарскія праграмы.

Памятаю, як моцна яе цкавалі за «Цынкавых хлопчыкаў». Маўляў, нічога падобнага ў Афганістане не было. Далёка не ўсе адважыліся стаць на яе абарону. Уласцівую творам Алексіевіч прагу да праўды моцна тады падтрымаў акадэмік Андрэй Дзмітрыевіч Сахараў, калі ў сваім артыкуле ён адзначыў, што ў Афганістане было сапраўды так,

як пра гэта расказала ў сваёй кнізе Святлана Аляксандраўна, што, хоць і рэдка, але савецкім салдатам даводзілася знішчаць сваіх, каб не трапілі ў палон. І тут жа некаторыя пачыналі апратэстоўваць, што ўсё гэта выдумкі і «ачарненне» подзвігу савецкіх воінаў.

Святлана Алексіевіч — з'ява для Беларусі. Яна атрымала сусветнае прызнанне. За апошнія гады выйшла некалькі соцень кніг Святланы Алексіевіч на розных мовах. Яна сваёй творчасцю ўзняла аўтарытэт усёй нашай краіны. І сёння нашым выступам за мяжой не будуць крычаць: «Брава рускай!» (як гэта было са мной у Македоніі) — а «Брава, Беларусь!»

Апошнім часам мне некалькі разоў выпала прыняць удзел у рабоце над аўдыёкнігамі. І адна з іх была менавіта тая, за якую Святлана Алексіевіч у 2015 годзе і атрымала Нобелеўскую прэмію. Размова пра «Час сэканд-хэнд». Але пра ўсё па чарзе.

Летам 2012 года кіраўнік «Радыё Рацыя» Яўген Вапа паведаміў пра стварэнне пры радыё Беларускага гістарычнага таварыства, пад кіраўніцтвам Яраслава Іванюка. Мне прапанавалі зрабіць аўдыёверсію кнігі ўспамінаў Ларысы Геніюш «Споведзь», якая ў польскім варыянце называецца «Птушкі без гнёздаў». Спачатку была думка зрабіць гэтую працу ў Беларусі, але тады (перш за ўсё па палітычных матывах) гэта было амаль немагчыма, і я паехала ў Польшчу, у Беласток.

У Ларысы Антонаўны вельмі складаная манера пісання. Уплыў чэшскай і польскай моваў рабіў тэкст не зусім зразумелым шырокай беларускай грамадскасці. Калі рабіўся запіс, знайшоўся чалавек, журналіст «Белсату» Зміцер Косцін, які змог гэта ўсё ўдакладніць.

Аўдыёдыск «Птушкі без гнёздаў» стаў дадаткам да польскага перакладу кнігі ўспамінаў Ларысы Геніюш «Ptaki bez gniazd» з рэдкімі фотаздымкамі ў выданні Беларускага гістарычнага таварыства ў Польшчы.

Потым у 2013 годзе я запісала аўдыёкнігу Рыгора Барадуліна «Лепей», якую Глеб Лабадзенка сабраў з рукапісаў

паэта. Чытаць даводзілася амаль з ліста. Дыск з гэтым запісам — дадатак да цудоўна аформленай і ўнікальнай аднайменнай кнігі паэта, якая не мае ніводнай друкаванай літары, усё напісана ад рукі самім Рыгорам Барадуліным.

Работа над запісам твору «Час сэканд-хэнд» была для мяне не толькі цікавай, пачэснай і нечаканай, але і няпростай. Няпростай па тых эмоцыях, якія я адчула. Ініцыятарам быў незалежны Саюз беларускіх пісьменнікаў у асобе яго кіраўніка Барыса Пятровіча. У маім творчым жыцці неяк усё так звязваецца ланцужком, што сама потым дзіўлюся. Я добра знаёмая з творчасцю яго дзядзькі Барыса Сачанкі. Невялічкае апавяданне пісьменніка «Ліст да маці» заўсёды раздавала на сваіх курсах для чытання. А некалі менавіта яго дала пачытаць дзяўчыне, якая тады рабіла сюжэты для «Белсата». Тэкст пранізлівы, глыбокі. Лічу, што вядоўцы павінны не толькі выпрацоўваць у сябе пэўную артыстычнасць, але і шчырасць, як бы прапускаць тэкст праз сябе. Тая дзяўчына прачытала апавяданне і заплакала. А я ўзрадавалася яе рэакцыі — тэксты трэба чытаць не толькі вуснамі, але і сэрцам.

Калі Барыс Пятровіч прапанаваў агучыць «Час сэканд-хэнд. Канец чырвонага чалавека», я была вельмі ўзрушаная, бо ўжо да гэтага прачытала кнігу і добра разумела веліч прапановы. Уразіла разуменне таго, што ўсе мы як бы з’яўляемся часткай гэтага чырвонага чалавека, а кніга — люстэрка, якое дазваляе паглядзець на сябе збоку.

Пашанцавала яшчэ з адным. Гукааператар Алег Чыжык — чалавек шчыра ўлюбёны ў беларускую мову. Мне неверагодна лёгка з ім працавалася. Нават, калі ўзнікалі нейкія пытанні (бывала, спрачаліся) па націсках, то ён імгненна адшукваў у інтэрнэце патрэбны варыянт, які я потым спраўджвала на філфаку БДУ ў Марыі Пятроўны Карповіч. Яе слова было канчатковым.

Запіс выпаў на канец вясны 2017 года. Мне было надзвычай цікава як мага глыбей унікнуць у сэнс напісанага і патрапіць у правільную інтанацыю. Іншым часам запішам патрэбны кавалак тэксту, крышку пасяджу — і прашу ўсё перапісаць. Часта прыходзілі думкі, а як жа працава-

ла пісьменніца, як у яе хапіла моцы на такую псіхалагічна складаную тэму...

Пацвярджэнне незвычайнасці кнігі Святланы Алексіевіч — сістэма савецкага ладу жыцця. Колькі было такіх сем'яў, калі жылі побач кат і ахвяра. А калі ў адным чалавеку спалучаліся, ды і спалучаюцца, калі гаварыць пра сённяшні дзень, талент, уменне перадаваць пачуццё цудоўнага, прыгожага — са звычайным паклёпніцтвам, бязлітасцю і жорсткасцю.

Успамінаю ліст майго таты да мамы, дзе ён напісаў, што мама была ў акупацыі, і ён, камуніст, не мае права вярнуцца да яе. Некаторы час той ліст захоўваўся ў мяне. Калі трапляў мне на вочы, апякаў душу і сэрца, і я яго знішчыла. А цяпер шкадую і ганю сябе за гэта. Не вінаваты тата, што апынуўся ў самым пекле вайны, што нашы салдаты і афіцэры ваявалі пад пільным наглядам НКВД. І не вінаваты, што быў часткай той савецкай сістэмы. Як усе мы, хто жыў у пастаянным страху за сябе, і за свае сем'і. І пра гэта таксама напісала ў сваёй кнізе Святлана Алексіевіч.

А матуля мая часта ўспамінала самыя шчаслівыя для сям'і перадваенныя гады. Адзінае, што азмрочвала іх жыццё, — гэта начныя візіты «варанкоў» у двор іх інтэрната. Раніцай людзі заўсёды недалічваліся каго-небудзь са сваіх жыхароў. Гэта пачалося з 1937 года. Каля дзвярэй нашага пакоя заўсёды стаяў падрыхтаваны вузельчык.

А тое, што ўлада робіць выгляд, быццам бы няма ў краіне нобелеўскай лаўрэаткі, гэта справа часовая — перамены абавязкова будуць.

Мяркую, што ўплыў твораў менавіта Васіля Быкава, Алеся Адамовіча і Святланы Алексіевіч на светапогляд беларусаў і на мой жыццёвы выбар велізарны.

Вельмі пачэсна, што кіраўнік Беларускага ліцэю Уладзімір Колас прапанаваў мне ўвайсці ў Раду беларускай інтэлігенцыі. У яе складзе былі сапраўдныя зоркі грамадскай думкі нашага часу, гонар нацыі: паэты Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, светлая ім памяць, Сяргей Законнікаў, Анатоль Вярцінскі, акадэмікі Аляксандр Вайтовіч і Радзім Гарэцкі,

прафесар Георгій Лепін, пісьменнікі Вольга Іпатава і Алесь Пашкевіч, мастак Алесь Марачкін, скульптар Алесь Шатэрнік, гісторыкі Валянцін Ткачоў, Алег Трусаў, мовазнаўца Алена Анісім, эканаміст Васіль Шлындзікаў, і шмат хто яшчэ з вядомых у Беларусі і за яе межамі людзей.

Са многімі з іх мне не раз давялося сустракацца ў жыцці, а паэт Анатоль Вярцінскі нават прысвяціў мне верш (спачатку не адважвалася, каб не падалося нясціплым, але прыгадаю тыя радкі):

*Што кажа каран*
*Пра лёс жаночы?*
*На ўвесь экран*
*Зініны вочы.*
*Экран блакітны.*
*Вочы сінія.*
*Голас Зінін.*
*Усмешка Зініна.*
*Фальшу ні грана.*
*Выраз бясцэнны.*
*Панна экрана.*
*Княгіня сцэны...*

Аднойчы ў Бялынічах была сустрэча, у якой акрамя мяне ўдзельнічалі Радзім Гарэцкі, Сяргей Законнікаў і Вольга Іпатава. На яе быццам бы добраахвотна прыйшлі толькі некалькі чалавек. На самай справе, мясцовае кіраўніцтва пільна сачыла за тымі, хто на гэта адважыцца.

На шчасце, ёсць людзі, якія ў тваёй памяці, у тваім сэрцы застаюцца назаўсёды, сустрэчы з імі і становяцца тымі сцежкамі, якія вядуць кожнага з нас да Беларусі. Цалкам разумею песімізм з гэтай нагоды, які перад ад’ездам у Канаду выказала Вольга Іпатава. Сапраўды, шлях да Беларусі ў нашага народа будзе вельмі няпростым. Але прайсці яго за нас не можа ніхто.

Упэўнена, калі б на беларускай тэрыторыі быў хаця б адзін тэлеканал накшталт «Белсату», які б можна было ба-

чыць не «па талерцы», а свабодна ў кожным доме, беларускія тэлегледачы адразу змянілі б сваё меркаванне адносна палітычнай сітуацыі ў свеце. Праўдзівую інфармацыю, на жаль, беларусы, якія не маюць інтэрнэту, не атрымліваюць.

Дарэчы, калі ствараўся тэлеканал «Белсат», шмат хто быў гатовы стаць яго кіраўніком. Памятаю, адпаведнае пытанне мне задаў згаданы вышэй шведскі амбасадар у Беларусі Стэфан Эрыксан. Прыемна, што мой адказ: «Толькі Агнешка Рымашэўская», — ужо больш за дзесяць гадоў спраўджваецца. Пры ўсіх хібах і цяжкасцях, адзіны незалежны ад беларускіх уладаў тэлеканал існуе. Упэўнена, каб не настойлівасць і энергічнасць спадарыні Агнешкі, мы б страцілі яго даўным-даўно.

Усе апошнія гады я цесна супрацоўнічала з «Белсатам». Па-першае, у якасці сябра Рады «Белсату», якую ўзначальваў Уладзімір Колас. У складзе Рады былі: старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў, кінарэжысёр Юры Хашчавацкі, філосаф Валянцін Акудовіч, журналісты Святлана Калінкіна і Анатоль Гуляеў. А таксама Генадзь Бураўкін і Мікола Анемпадыстаў, светлая ім памяць. Разам з Агнешкай Рымашэўскай і Аляксеем Дзікавіцкім мы збіраліся на пасяджэнні, калі трэба было абмяркоўваць новыя праекты ці нешта мяняць у праграме.

Акрамя таго, мы праводзілі з вядоўцамі майстар-класы і трэнінгі. Я па-ранейшаму сачу за журналістамі, якія выходзяць у эфір. Прыемна, калі пасля тваіх парадаў і заўваг журналіст чулліва рэагуе, і ты бачыш змены ў лепшы бок.

Хацелася б пажадаць майму любімаму «Белсату» адшукваць больш прывабных, прафесійных і таленавітых журналістаў.

Манера вядоўцы цяпер змянілася. Ад нас калісьці патрабавалі размаўляльнасці і суперажывання, а цяпер трэба трымаць нейтральнасць і занадта хуткі тэмпа-рытм, а ад гэтага ў нейкай ступені адчуваецца агрэсія, якой у нашым жыцці і так хапае.



Мае першыя «Дажынкі». Столін. 1995 г.



Мае апошнія «Дажынкі». Нясвіж. 1996 г.



Сын Уладзімір на маім бенефісе. 1996 г.



З Народным артыстам БССР Віктарам Вуячычам на маім бенефісе.



На маім бенефісе. З дырэктарам бібліятэкі імя А.С. Пушкіна Наталляй Чуевай і Народнай артысткай БССР Наталляй Гайда.



Наша сям'я пасля бенефісу. З дзядзечкам Міцем, бабуляй Нінай, сынам Уладзімірам і нашым сябрам Анатолем Саханевічам.



З нашым знакамітым Аляксандрам Мядзведзем. 1996 г.



З сынам Уладзімірам у НЦМТДМ. 1996 г.



Вулічны выступ сына Уладзіміра каля Еўропа-цэнтра ў Берліне. 1996 г.



Залаты шлягер. Са спявачкамі: Заслужанай артысткай БССР Нэлі Багуслаўскай, Народнай артысткай Расіі, Заслужанай артысткай УССР Тамарай Міянсаравай і Капіталінай Лазарэнка. 1996 г.



Вяртанне дадому пасля канцэрта. 31 снежня 1996 г.



Ерэван. 40 гадоў Армянскаму тэлебачанню. Са спявачкамі: Заслужанай артысткай Расіі Ірынай Оціевай, Ларысай Грыбалёвай і Сабінай Мурадзян. 1996 г.



Мінск. Бульба з патэльні.
З Генадзем і Марыён Куле. 1997 г.



З маёй калегай Заслужаным дзеячам культуры БССР Тамарай Бастун. 1998 г.



З маёй сяброўкай і дарадчыцай Марыяй Пятроўнай Карповіч. 1997 г.



**Пасля канцэрта аркестра Міхаіла Фінберга на Кастрычніцкай плошчы Мінска. З сябрамі з Берліна Крысціянам Штэрцам і Вольфгангам Бютнэрам.**



**Мае мужчыны. З Анатолем Саханевічам і Крысціянам Штэрцам. 1998 г.**



**Хольт, Паўночная Германія. З дырэктарам Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Аленай Дзмітрыевай, Крысціянам Штэрцам, Марыён Куле, Петэрам Рэлінгерам. Фота мужа Генадзя. 1997 г.**



Пасля канцэртнай праграмы «Спяваем разам» аркестра Міхаіла Фінберга. Мазыр. 1998 г.




У чарговай камандзіроўцы ў Гомелі. З журналістамі БТ Лідзіяй Рыбалкінай і Уладзімірам Субатам. 1998 г.



З салістамі аркестра Міхаіла Фінберга Тарыэлам Майсурадзэ, Стэлай, Народнымі артыстамі Беларусі Мікалаем Скорыкавым, Якавам Навуменкам і дырэктарам Белдзяржцырка Таццянай Бандарчук у Італіі. 1998 г.



Дні культуры Беларусі ў Кемерава. Злева ад мяне — Ігар Лучанок, справа — губернатар вобласці Аман Тулееў і Народная артыстка Беларусі спявачка Наталля Руднева. 1998 г.



Наша старэнькая і любімая бабуля Ніна. 1998 г.



З маёй любімай суседкай па лецішчы Заслужанай артысткай БССР Таццянай Сцяпанавай ля яе дачнага дома.



«Залаты Шлягер». З Рыкарда Фолы і прыхільніцай спевака. 1999 г.



«Залаты шлягер». З Тамарай Раеўскай і Тэрэзай Кесовія. 2000 г.



З кампазітарам Ізмаілам Капланавым.




«Залаты шлягер». З Народным артыстам Расіі Яўгенам Мяньшовым. 2001 г.



Са спевакамі Якавам Навуменкам і Галінай Грамовіч *(крайняя злева)* нас прымалі ў Лунінцы. 1999 г.




Ля скінутага герба БССР. 2005 г.




Магілёў. «Магутны Божа». Злева ад мяне — мая калега Ганна Янава, справа ад мяне — сябар журы фестывалю Жанета Ялфімава. 1998 г.



На юбілейнай вечарыне Заслужанай артысткі БССР Валянціны Карэлікавай. З Заслуженым артыстам БССР Леанідам Барткевічам і Валерам Скаражонкам. 2004 г.



Адкрыццё 12-га Міжнароднага фестывалю «Магутны Божа» ў Магілёве. Благаславенне ад Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта. 2004 г.

Паміж арганізатарам фестывалю «Магутны Божа» пробашчам Раманам Факсінскім і музыказнаўцам з Санкт-Пецярбурга Ігарам Маціеўскім ды гасцямі фестывалю. 2000 г.





Фестываль «Магутны Божа». Злева — сябар журы музыказнаўца з Лондана Гаю дэ Пікарда. Каля мікрафона — старшыня журы Віктар Роўда. 2001 г.



**Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Марыя Аляксандраўна Барысік** *(злева ад мяне)* **неаднойчы арганізоўвала сустрэчы вучняў з беларускімі дзеячамі культуры ў сваёй школе. 2008 г.**



**З экс-міністрам абароны Паўлам Казлоўскім. 2001 г.**



**З адзіным кандыдатам у прэзідэнты Уладзімірам Ганчарыкам. 2001 г.**



**Сустрэча з гледачамі. 2006 г.**



**Плошча Бангалор. Журналістка Ірына Халіп, палітык Андрэй Саннікаў, паэт Генадзь Бураўкін. 2005 г.**



**На могілках у Глушы каля надмагільнага каменя Алеся Адамовіча. Справа ад мяне: Уладзімір Някляеў, Наталля Адамовіч, Радзім Гарэцкі, Валянцін Тарас. 2007 г.**




**На сустрэчы з жыхарамі Бялынічаў. Акадэмік Радзім Гарэцкі, пісьменніца Вольга Іпатава, старшыня Таварыства беларускай мовы ў Магілёве Алег Дзьячкоў, паэт Сяргей Законнікаў. 2005 г.**



**На канцэрце гурта майго сына Уладзіміра. 2007 г.**



**У нас у гасцях праваабаронца Алег Волчак з сям'ёй. 2005 г.**



**З сястрой Наталляй, яе мужам Міхаілам і братам Аляксандрам на яго 60-годдзі. 2004 г.**



З пісьменніцай Вольгай Іпатавай
і яе мужам Ягорам Фядзюшыным.



Ля касцёла Святой Ганны
ў вёсцы Мосар. З сябрам
сына Аляксандра Сяргеем
Кудраўцавым. 2009 г.



Бычкі. З Валянцінай Быкавай. 2009 г.



На магіле сына.



Пасляваенныя гады. Валянціна Уладзіміраўна Быкава.
Можа, з той самай кароўкай.



Святочны канцэрт Народнага хору ветэранаў «Спадчына».
Справа мастацкі кіраўнік хору Мікалай Хвісюк. 2009 г.



З журналісткай Жанай Літвіной. 2008 г.



У мяне ў гасцях дыктары БТ Элеанора Давыдоўская, Таццяна Мацюшэнка, Галіна Рудакова, Валянцін Аксенцюк. 2008 г.



З экс-суддзёй Канстытуцыйнага суда Міхаілам Пастуховым і былым намеснікам старшыні Беларускага Хельсінкскага Камітэта Валерыем Косткам.



**Актывісты арганізацыі «Дзіцячы дыябет».
Справа ад мяне — яе старшыня Святлана Захарава.**




**З жыхарамі вёскі Германавічы. Злева ад мяне — арганізатар сустрэчы Ада Райчонак. За мной — цымбаліст Алесь Лявончык. 2009 г.**



**У нас у гасцях нашы сябры: Марыя і Георгій Барысікі, Людміла Сяргей, Яўген Ігнатовіч, Андрэй Клімаў, Леанід Піхоцкі. 25 красавіка 2009 г.**



Уладзімір і Ксенія. Пасля вянчання ў мінскім храме Аляксандра Неўскага. 2010 г.



Мая нявестка. У канцэрце Заслужанага ансамбля «Зорачка».



Нашы мужчыны за шахматамі пасля вяселля Уладзіміра і Ксеніі.



Пасля шлюбу сына наша сям'я павялічылася: Уладзімір, Святлана, Пётр Мінчанкі, Ксенія і Уладзімір Кап'ёвы.




З Генадзем чакаем аўтобус ля Цэнтральнага вакзала Берліна. 2011 г.



Германія. Хоф. З былымі супрацоўнікамі аркестра
Міхаіла Фінберга Генадзем і Нінай Мончаш. 2011 г.



**З дачкой Генадзя Бураўкіна Святланай. 2011 г.**



**З'езд беларусаў свету. З заснавальнікам і экс-старшынёй Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага Алегам Рудаковым. Вільнюс. 2013 г.**



**У Беластоку пасля запісу аўдыёкніжкі Ларысы Геніюш. Са Станіславам і Ганнай Сцепанчук ды нашымі сынамі Уладзімірам і Томашам. 2012 г.**


Чытаю дыктоўку гродзенцам. 2014 г.


Інтэрв'ю «Белсату» пасля маёй юбілейнай вечарыны
ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі. 2014 г.




**Віншаванне з Новым 2015-м годам. З Анатолем Лябедзькам і Станіславам Багданкевічам.**



**Са Святланай Алексіевіч. 2015 г.**



**Старое тэлебачанне, новыя іншамаркі і мае ўнукі.**




**Юбілейны торт з Томска. З маімі ўнукамі. 2019 г.**



# Подых новага

На пачатку 90-х гадоў пасяджэнні Вярхоўнага Савета трансляваліся ў прамым эфіры. Здавалася, што адкрылася сцежачка да Беларусі. Я з задавальненнем хадзіла на апазіцыйныя мітынгі. У тым ліку і на той, калі да будынку беларускага ўрада прыйшлі больш за сто тысяч рабочых. Аўтобусы ўжо не хадзілі, пешшу дабралася да педагагічнага ўніверсітэта, дзе дамовіліся сустрэцца з маёй добрай сяброўкай Марыяй Пятроўнай Карповіч. Яна тады выкладала на філфаку БДУ.

Марыя Пятроўна валодала выдатным пачуццём гумару. Аднойчы мы з ёй прысутнічалі на творчай вечарыне нашага таленавітага кампазітара Эдуарда Ханка. І якраз там адбылася прэм’ера яго песні на верш Рыгора Сакалоўскага «Таварыш прэзідэнт». Памятаеце:

*«Товарищ Президент, настанет тот момент,*
*Когда вам до конца поверят люди...»*

Песня выклікала шмат спрэчак і крытыкі.

У антракце выходзім у фае канцэртнай залы «Мінск» і адразу сутыкаемся з кампазітарам. Ён радасна пытаецца: «Ну як вам мая новая песня?» Марыя Пятроўна з усмешкай на твары: «Эдуард Сямёнавіч, так вы ж сваёй песняй нашым знакамітым паэтам Нілу Гілевічу, Рыгору Барадуліну, Генадзю Бураўкіну як сярпом па яйцах». Песня так і не атрымала падтрымкі ў беларусаў, ды і ў прэзідэнта таксама.

Дарэчы, менавіта дзякуючы Марыі Карповіч цяпер у Беларусі замацаваўся выраз «Спяваем разам». Міхаіл Фінберг даручыў мне знайсці прыгожыя словы для назвы

праграмы аркестра, каб прыцягнуць увагу беларусаў. А Марыя Пятроўна параіла гэты абарот, які потым з'явіўся на трамваях і тралейбусах.

А мітынг пачынаўся. На трыбуну падняўся кіраўнік ураду В.Ф. Кебіч і вядомыя апазіцыйныя дэпутаты фракцыі БНФ. Людзі вакол патрабавалі годнага жыцця і адстаўкі ўрада. Далі мікрафон Кебічу. Натоўп моцна загуў. Кебіч узяў мікрафон, але не ведаў, што той ужо ўключылі. Ён сказаў фразу, якую пачулі ўсе: «Пакуль гэтае быдла не супакоіцца, я не буду гаварыць». Плошча эмацыйна ўзарвалася. Далей сітуацыю ўзялі ў свае рукі вядомыя апазіцыйныя дэпутаты Зянон Пазняк і Сяргей Навумчык.

У гэты момант мяне і знайшла расчырванелая ад хвалявання Марыя Пятроўна. Аказалася, ёй дапамог міліцыянт. Калі яна запыталася ў яго на беларускай мове, ён у адказ параіў шукаць мяне там, дзе больш за ўсё бел-чырвона-белых сцягоў.

На тым мітынгу да нас падышоў былы рэжысёр літаратурнага вяшчання беларускага тэлебачання Уладзімір Святлоў, бацька будучага міністра культуры. Вельмі цікавая, неардынарная асоба. Адсядзеў у ГУЛАГУ за тое, што пятнаццацігадовым хлопцам у час акупацыі працаваў у тэатры імя Янкі Купалы, граў на цымбалах. Напісаў надзвычай змястоўную кнігу сваіх успамінаў — з такой неверагоднай любоўю да людзей, што здзіўляешся дабрыні і шчырасці гэтага мужнага чалавека. Светлая яму памяць! Заўсёды хадзіў на мітынгі, прыгожы, інтэлігентны. Ён не толькі быў выдатным пісьменнікам і высокапрафесійным рэжысёрам, але яшчэ і добрым мастаком. Дагэтуль некалькі яго карцін упрыгожваюць маю кватэру.

На жаль, перамены аказаліся не такімі, пра якія мы марылі...

Ліхацкія і рызыкоўныя дзевяностыя гады. А дакладней, 1994 год. Бягу паплаваць у басейн Палаца чыгуначнікаў. Уваход у басейн якраз насупраць майго дома. Лета, пачынаецца навальніца, неяк пацямнела, і я спяшаюся прабегчы пляцоўку, дзе заўсёды шмат аўтамашын. Людзей мала,

але здалёк бачу і чую нейкую валтузню, і раптам адчайны крык: «Женщина, помогите!» — бачу хударлявага мужчыну запіхваюць у салон аўтамабіля, і гэты гвалт робяць здаравенныя каўказцы. Бягу хутчэй. Усё адбывалася імгненна. Машына разварочваецца, на вялікай хуткасці праязджае міма, і я бачу твар таго каго трымаюць, а да мяне падыходзяць двое. І тут я пачынаю амаль крычаць: «Што вы сабе дазваляеце? Хто даў вам такое права?» Чую ў адказ: «А вы знаете, сколько он нам должен? Двести шестьдесят тысяч долларов! И он должен за это ответить». — «Тогда такие разборки делайте на сваей земле, а не на нашей. Я сейчас же иду звонить». — «Не советуем. Пожалеете». І тады я зноў да іх: «Вы что думаете, я одна буду это делать? Вон мужчина под зонтиком. А та женщина з детской коляской? С балконов люди смотрят!» Сапраўды, так і адбывалася. Мне ўжо было не да басейна. Вярнулася дадому, як толькі набрала «02», выклала інфармацыю дзяжурнаму, адразу пачула: «Нам уже звонили». На працягу амаль месяца тэлефанавала знаёмым высокім чыноўнікам. Адказ быў адзін: «Не волнуйтесь, всё делается. Мы сообщим». А потым амаль усіх начальнікаў сілавых структур пачалі мяняць, і я зразумела: улада ўсталёўвае і абараняе толькі сябе. Да простых людзей стаўленне абыякавае. А ў мяне да гэтага часу перад вачыма той хударлявы блакітнавокі чалавек з адчаем у позірку. Што з ім сталася?

* * *

Тое, што перамены не тыя, якіх мы так чакалі, зразумела, калі праводзіла першыя «Дажынкі».

Дэбютавалі «Дажынкі» ў 1996 годзе, у Століне Брэсцкай вобласці. Разлічана ўсё было на гадзіны тры-чатыры, бо пераможцам уручалі ключы ад новых жыгулёў «Лада», якія прыпаркавалі проста на цэнтральнай плошчы горада. Прыгожая сцэна была ўсталявана ў парку. Яе аформіла мастачка беларускага тэлебачання Галіна Холад. Уся такая вытанчаная, з добрым густам — і цалкам аб'ектыўна, што потым ёй прысвоілі званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў

Беларусі». Сцэна была аздобленая ў нацыянальным стылі, яе ўпрыгожвалі вялізныя сланечнікі. Пашыць новую вышыванку не паспелі, таму імпрэзу праводзіла ў аднатоннай сукенцы блакітнага колеру. За столікамі ля сцэны сядзелі пераможцы, перавязаныя чырвонымі стужкамі.

Усім гэтым мерапрыемствам загадваў Іван Іванавіч Пашкевіч, які паходзіў з тых мясцінаў. На той час ён быў дырэктарам прадстаўніцтва тэлерадыёкампаніі «Мир», потым стаў дэпутатам, намеснікам кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі, а зараз жыве ў Амерыцы. Увесь час ён удакладняў пэўныя моманты з нашым рэдактарам Людмілай Георгіеўнай Палкоўнікавай. Перш за ўсё звязаныя з прысутнасцю на «Дажынках» Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. Верталёт з кіраўніком дзяржавы прызямліўся паблізу, і мы бачылі яго яркую афарбоўку, ён чакаў свайго гаспадара.

Нарэшце пачалося. Аляксандра Рыгоравіча пасадзілі за столік ля самай сцэны. Пачаліся выступы артыстаў. І тут Пашкевіч падбег да мяне. Сказаў, што прэзідэнт будзе толькі дзве гадзіны. Маўляў, што паспеем за гэты час, тое паспеем. Таму прынцып будзе новы: некалькі выступаў — уручэнне прызоў пераможцам. Вядомыя ўсім артысты захваляваліся (асабліва тыя, хто абраў канцоўку), бо па сутнасці гэта азначала чарговую ломку сцэнару, але вядоўцы — людзі да ўсяго звыклыя. Часам да апошняга моманту не ведала, хто будзе выступаць наступным.

Праз пэўны час Пашкевіч падбег да мяне зноў: «Аб'яўляй Ярмоленку! І на гэтым усё скончым, бо ўсіх ужо ўзнагародзілі!» Далей павінны былі ляцець паветраныя шары і выступаць кіраўнік дзяржавы. Але да Аляксандра Рыгоравіча падыйсці баяліся. Пакуль гучалі апошнія словы песні Анатоля Ярмоленкі, сама падышла да краю сцэны, прысела (на шчасце, сукенка гэта дазваляла) і спыталася: «Аляксандр Рыгоравіч, вы будзеце зараз выступаць?» Той адказаў: «Канечне!» Я запрасіла яго да мікрафона.

Ён падняўся на сцэну, абняў мяне за плечы і сказаў у мікрафон: «Я хачу, каб сёння вы былі такім ж прыгожы-

мі, як гэта дзяўчына...» Я рассмяялася («дзяўчыне» ўжо споўнілася 57 гадоў!) і шапнула на вуха яму падзяку за тое, што бабулю ператварыў у дзяўчыну. Аляксандр Рыгоравіч таксама засмяяўся і прадоўжыў пра свой верталёт, які бы птушка хутка падымецца ў неба, а ён усіх віншуе са святам і ў думках застаецца з намі.

Так яно і атрымалася: імпрэза далей працягвалася без яго.

А праз некалькі месяцаў адбыўся сумнавядомы рэферэндум, які па сутнасці зрабіў прэзідэнцкія паўнамоцтвы неабмежаванымі.

На столінскіх «Дажынках» пераможцам уручылі ключы зусім не ад тых машын, якімі ўзнагароджвалі. Некаторым давялося яшчэ амаль год чакаць свае «Жыгулі»...

У наступным годзе «Дажынкі» былі ў Нясвіжы. Там з машынамі атрымалася недарэчнасць. Высветлілася, што ў якасці ўзнагарод выкарысталі канфіскаваныя беларускімі мытнікамі аўто. Яны аказаліся ў росшуку. Расіяне падалі ў суд — і «прызы» давялося вяртаць.

Трэці раз правесці «Дажынкі» планавалася ў Шклове, але я цвёрда вырашыла больш на іх не ездзіць. Напярэдадні мне патэлефанаваў рэжысёр Аляксандр Вавілаў, каб даведацца пра мае планы. Адмова не стала для яго адкрыццём. Саша толькі спытаў: «Не можаце, альбо ваша пазіцыя не дазваляе?» Я адказала: «Лічыце і так, і так»...

Неўзабаве шклоўскія «Дажынкі» адмянілі. Год тады выпаў з вельмі дрэнным ураджаем, святкаваць не было чаго. Да таго ж, у Шклове завалілі падрыхтоўку. Горад аказаўся не гатовы. Нягледзячы на тое, што іх адмянілі, пра маю адмову не забыліся і больш на «Дажынкі» не запрашалі.

Яшчэ прыгадваецца, як 5 траўня 1996 года ў сталічным Доме афіцэраў адбыўся мой бенефіс. З гэтай нагоды хочацца падзякаваць Людміле Палкоўнікавай, якая ўсё спрадзюсавала, рэжысёру імпрэзы Аляксандру Вавілаву, Міхаілу Якаўлевічу Фінбергу і ўсім артыстам, што прынялі ў ёй удзел.

Яшчэ вельмі ўдзячна Міністэрству абароны рэспублікі, фабрыцы «Камунарка» — менавіта дзякуючы ім ніхто з

удзельнікаў маёй імпрэзы не пайшоў са сцэны без падарунка.

На імпрэзе планавалася прысутнасць Аляксандра Лукашэнкі. Нават у сярэдзіне шостага рада для яго і аховы вызвалілі той самы квадрат месцаў. Аднак Аляксандр Рыгоравіч не прыехаў. Сказалі, што ён павінен быць на нейкім важным хакейным турніры. Але велізарны кошык з кветкамі ад прэзідэнта быў урачыста ўнесены на сцэну. Думаю, у Аляксандра Рыгоравіча ўнікальная інтуіцыя, прадчуванне таго, хто ў будучым можа аказацца не побач з ім.

* * *

Прыход новай улады на тэлебачанні быў успрыняты неадназначна, хаця многім яшчэ здавалася, што курс Бураўкіна будзе адноўлены. Крыўдна, але мы моцна памыляліся...

Са зменай кіраўніцтва Белтэлерадыёкампаніі пачалася змена кадраў.

Дыктараў пакрыху пачалі цурацца, устанаўліваліся новыя правілы гульні. Шчыра кажучы, пра ўсё гэта не задумвалася, бо ўжо гадоў дзесяць (а можа і болей) працавала «па сумяшчальніцтве» — вяла канцэрты ў аркестры Міхаіла Якаўлевіча Фінберга, і займела тое, што звычайна называюць «запасным аэрадромам».

Як кіраўнік групы дыктараў беларускага тэлебачання, сама планавала часы нашай работы і мела магчымасць улічваць папярэджванні Міхаіла Якаўлевіча пра будучыя канцэрты альбо фестывалі. Ставіла на гэты час свае выходныя.

Аднойчы мяне запрасіў да сябе Рыгор Леанідавіч Кісель, які на той час кіраваў усім тэлебачаннем і радыё краіны, і сказаў, што да нас прыязджае А.Р. Лукашэнка. Я была старшынёй жаночай рады Белтэлерадыёкампаніі. Пасада грамадская і збольшага фармальная.

Мне было прапанавана выступіць і расказаць пра сучасныя жаночыя праблемы. Сустрэча праходзіла ў самым вялікім студыйным павільёне — «шасцісотцы». Усё памяшканне заставілі крэсламі, узвышэнні заслалі дыванамі, на сцэне паставілі трыбуну. Села бліжэй да яе, у трэці рад.

Выступоўцы казалі толькі пра неабходнасць абнавіць тэхніку, мэблю і г.д. Пра праблемы людзей — нічога.

Мне далі слова самай апошняй. Я расказала пра сапраўдныя людскія праблемы — маленькія заробкі і пенсіі, скарачэнні за два-тры гады да пенсійнага ўзросту, цяжкія для жанчын умовы работы. Вядома, гаварыла на беларускай мове.

Пры канцы сустрэчы слова зноў узяў Аляксандр Рыгоравіч.

Ён пачаў з майго выступу: «Вот тут выступала Зина. Как всегда, говорила на белорускай мове. Этим она создает себе имидж. За это ее любит народ. И это правильно». Ён зрабіў паўзу і раптам: «А что вы так ко мне привязались с этой мовай? Если вам так нравится, найму себе... Пусть пишут, а я буду говорить вам по-белорусски».

І паглядзеў проста мне ў вочы. Адказала: «А чаму б і не, Аляксандр Рыгоравіч! Мова ж наша, родная».

Раздражнёна адказаў: «Хорошо, Зина, я так и сделаю».

За спінай пачула шэпт: «Што нарабіла, паставіла крыж на сваім творчым жыцці».

Адразу ж адчула ціск. Пачаліся перашкоды для аўтарскай перадачы «Яшчэ не вечар», якую мы пачалі рабіць з каляжанкай Элеанорай Давыдоўскай, і запрашалі туды людзей сталага ўзросту. То ўзнікалі праблемы з апаратурай, то з транспартам, то з эфірным часам.

Праз некалькі тыдняў, калі прыйшла на рэпетыцыю ў аркестр, Міхаіл Якаўлевіч раптам сказаў: «Ад дасведчаных людзей дакладна ведаю: цябе будуць прыбіраць». Фінберг прапанаваў цалкам перайсці да яго на пасаду намесніка і творчага дырэктара.

Я яшчэ пратрымалася на тэлебачанні тры месяцы. Імкнулася дапамагчы сваім калегам па працы, бо разумела, што з маім звальненнем група будзе расфарміраваная. Валянцін Аксянцюк і Таццяна Мацюшэнка перайшлі на радыё, Вера Ропат, светлая памяць гэтай таленавітай жанчыне, уладкавалася ў літаратурную рэдакцыю, Сяргей Шышко і Марына Новікава перайшлі ў іншыя рэдакцыі, Каця

Несцяровіч сышла ў філармонію, а Галіна Рудакова наогул з’ехала ў Італію.

Цяпер дыктараў няма ні на тэлебачанні, ні на радыё.

* * *

Карыстаючыся нагодай, хачу назваць некаторых людзей, з якімі даводзілася разам працаваць. Вельмі любіла і люблю (сябруем да гэтага) сваю дыктарскую групу. А якія класныя рэжысёры працавалі на БТ — Віктар Карпілаў, Уладзімір Станкевіч, Віктар Шэвялевіч, Вера Руцкая, Уладзімір Міхарскі. Тэлеаператары — Валодзя Пранько, Ванечка Скорынаў, Валера Булдык, Толя Лешчанка, Толя Сцяпанаў.

Вяртаюся з якой-небудзь камандзіроўкі, падыходжу да будынка студыі на Камуністычнай, 6, а сэрца ледзь не выскоквае ад радасці, што ўбачу сваіх калег, што пачнуцца цікавыя размовы-запытанкі. Гэтыя размовы заўсёды грэюць душу.

Не магу не распавесці пра Нінэль Лапцеву. Яна працавала рэдактарам дзіцячага вяшчання Беларускага радыё, але, калі Бахціяр Бахціяраў стварыў рэспубліканскі фестываль дзіцячай песні «Чырвоныя гваздзікі», Нэлі была і нашым рэдактарам. Вельмі адукаваны светлы чалавек. Яна навучыла мяне працаваць з тэкстамі, імправізаваць, знаходзіць галоўную думку ў прадстаўленні канцэртных нумароў і скарачаць тэкст, калі спатрэбіцца зрабіць гэта ў час жывога эфіру.

У канцы 1990-х гадоў дырэктар і мастацкі кіраўнік у Магілёўскай абласной філармоніі Уладзімір Браілоўскі далучыў мяне да вядзення фестывалю «Залаты шлягер». Яго адразу палюбілі і гледачы, і ўдзельнікі: зоркі першай велічыні былога СССР, блізкага і далёкага замежжа. Каго толькі не пабачылі канцэртныя залы нашай рэспублікі: ад Мусліма Магамаева і Людмілы Зыкінай, да Раберціна Ларэці і Рыкарда Фолы, — пералічваць можна доўга. Канцэрты «Залатога шлягера» я вяла не толькі ў Магілёве. У 2000 годзе канцэрт «Залатога шлягера» з удзелам беларускіх і

расійскіх зорак давялося весці ў Маскве ў Крамлёўскім палацы, былым Палацы з'ездаў.

Музыкант і кампазітар Уладзімір Браілоўскі не толькі стварыў у Магілёве філармонію і фестываль «Залаты шлягер» — ён ператварыў горад у сапраўдны цэнтр музычнай культуры. І тое, што гэты таленавіты, інтэлігентны чалавек быў асуджаны і адсядзеў шэсць гадоў, для ўсяго артыстычнага асяроддзя было шокам. Калі канфіскоўвалі яго маёмасць, акрамя раяля ніякіх каштоўнасцяў не знайшлі.

Гарадская ўлада не зварухнулася, як быццам і не ведала, што бюджэтных грошай хапае можа на чвэрць, што расійскія зоркі патрабуюць перадаплаты за паўгода да пачатку фестывалю.

Я крышку спрычынілася да той сітуацыі, таму пра гэта распавядаю.

Калі аднойчы ў Віцебску пасля вядзення канцэртаў Славянскага базару зайшла ў бухгалтэрыю атрымаць грошы за восем канцэртаў, з радасцю распісалася за суму, роўную тром маім месячным заробкам. Над маім прозвішчам стаяла прозвішча Надзеі Бабкінай — за ўдзел у двух канцэртах сума завоблачная.

Нас, беларусаў, яшчэ ў савецкі час прывучалі ведаць сваё месца. Вядома, мы гэтую сітуацыю абмяркоўвалі, але ў голас не выказваліся. Я да таго, каб ведалі, як даводзілася Уладзіміру Веньямінавічу разлічвацца з расійскімі і замежнымі зоркамі.

Перад тым, як паехаць на канцэрт у Крамлёўскі палац, сумленна папярэдзілі, што грошай для нас няма, і мы ўсе пагадзіліся: увечары выезд, раніцай рэпетыцыя, вечарам канцэрт — і адразу на вакзал.

Калі здарылася бяда, шмат што рабілася, каб дапамагчы Уладзіміру. Асабліва з боку яго калег і падначаленых з Магілёва. У яго цукровы дыябет, яму пастаянна патрэбныя лекі, а ён у калоніі строгага рэжыму.

Я ўсё гэта ведала, перажывала, але дапамагчы не магла. Раптам тэлефануе жонка Уладзіміра Браілоўскага Людміла Яўгенаўна: «Валодзя загіне, у яго абвастрэнне, не магу да-

біцца медыцынскай дапамогі». Тэлефаную Ігару Лучанку. А ён перад гэтым ужо адправіў зварот на імя прэзідэнта са сваім і Уладзіміра Співакова подпісамі. Калі спатрэбіцца, сказаў, далучуся яшчэ.

Пачала тэлефанаваць нашым вядомым артыстам. Некаторыя адразу падтрымалі, а некаторыя катэгарычна адмовіліся. Я сама магла толькі арганізаваць, бо мой подпіс мог стаць перашкодай. І тады тэлефаную Заслужанаму артысту БССР Уладзіміру Правалінскаму, чалавеку добраму і чуллівому. Ён адразу адгукнуўся. Па тэлефоне ўсё абмеркавалі. Былы музычны рэдактар Белтэлерадыёкампаніі Людміла Палкоўнікава склала зварот. Ігар Міхайлавіч Лучанок падпісаў і яго. Трымаем сувязь з адвакатам Браілоўскага і чакаем. Па-мойму, праз месяц нашага Уладзіміра Веніямінавіча вызвалілі. У той год са сваёй дыктарскай групай сабраліся ў мяне дома адзначыць мой дзень народзінаў. Раптам зусім нечаканы званок у дзверы. Хуценька бягу, адчыняю. Божа! Уладзімір Браілоўскі! Разам з музыкантам і кампазітарам Ізмаілам Капланавым. Такога падарунка я не чакала. Для мяне гэта была сапраўдная ўзнагарода!

* * *

У аркестры Фінберга мне ўдалося пратрымацца толькі да 2001 года.

Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў мне патэлефанавала праваабаронца Людміла Гразнова і прапанавала напісаць некалькі радкоў для «Народнай Волі». Там зрабілі адпаведную рубрыку і друкавалі меркаванні вядомых людзей наконт маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбараў.

Анатоль Ярмоленка сказаў, што на выбары не ходзіць, за што пасля некаторы час аказаўся ў ценю. Вядомая музыказнаўца Элеанора Язерская напісала, што ведае, за каго цяпер будзе галасаваць. Я ж думала ўсю ноч і напісала: «Спрадвеку беларусы лічацца працавітымі, добразычлівымі, лагоднымі і вельмі цярплівымі. Прыходзіць да нас хамская ўлада, а мы ўсё церпім. І вось нам даецца шанец». Цяпер мне падаецца, што даволі рэзка выказалася.

Як толькі гэта было надрукавана ў газеце, з самай раніцы мне патэлефанавалі з Міністэрства культуры і выказалі сумнеў у тым, што тэкст пісала я, што мяне проста падставілі. Катэгарычна абвергла версію падставы і яшчэ раз пацвердзіла сваё аўтарства: «Так думаюць многія, проста людзі баяцца выказвацца». І пачалося...

Праз некаторы час у суботні дзень Фінберг выклікаў мяне. Сказаў, што хоча яшчэ працаваць, што ў яго вялікі калектыў, а я яго падставіла. Сказала, каб не хваляваўся, у панядзелак прыйду і напішу заяву. На гэта пачула: не трэба панядзелка, пішы зараз. Што я і зрабіла. Выйшла з офіса і больш у яго не ўвайшла.

Цікава, што за два дні да майго сыходу з аркестра я стаяла з музычным рэдактарам на аўтобусным прыпынку Плошчы Перамогі, каб разам ехаць на рэпетыцыю. Размаўляем. Раптам нехта ззаду мякка бярэ мяне за плечы. Паварочваюся. Перада мной сімпатычны, добра апрануты чалавек, які кажа: «Дзякуй за тое, што вы ўсіх нас абаранілі!» Я ў адказ: «А вам дзякуй, што вы гэта заўважылі!»

Радасна падумалася, што людзі чытаюць «Народную Волю»!

Без працы я доўга не была. Мяне запрасілі ў Мінскі палац дзяцей і моладзі: спачатку працаваць з дзецьмі, а потым арганізавалі курсы для дарослых «Майстэрства тэлевядоўцы» пры аддзеле інфармацыйнага забеспячэння і рэкламы, якім кіруе Любоў Лебедзева.

Дзякуючы такім апантаным людзям, як яна, Алена Арэшка, Кацярына Шашыташвілі там па сапраўднаму віруе жыццё. Дзецям там цікава, іх вучаць тэлевізійным прафесіям, з імі займаюцца прафесіяналы з беларускага тэлебачання: журналісты, тэлеаператары, мастакі. Дарэчы, у канцэртнай зале палаца я правяла сваю юбілейную вечарыну ў 2014 годзе.

Працавала там да верасня 2018 года.

Так што ціск, які церпіць цяпер апазіцыя, сыходзіць не толькі ад улады. Шмат залежыць ад звычайных людзей, іх сумленнасці, разумення палітычнай сітуацыі.

* * *

Вельмі ўдзячна лёсу, што звёў маю сям'ю з Валянцінай Уладзіміраўнай Быкавай, роднай сястрой пісьменніка Васіля Быкава (светлая памяць гэтай незвычайнай жанчыне). У мой першы прыезд у Бычкі ўжо напрыканцы ўрачыстасцяў, а народу там заўсёды зашмат, я прысела на прызбу і раптам чую: «А я цябе, Зіначка, па голасе пазнала». Паварочваюся і пытаю: «А чаму толькі па голасе?» — «Так, бо я ж не бачу нічога», — чую ў адказ. Так мы і пазнаёміліся. Даведалася, што ўжо можа паўгода як Валянціна Уладзіміраўна аслепла, жыла ціхенька, нікому не скардзілася. Мясцовыя дактары раілі аперацыю, але гарантыі не давалі.

Вось тут усё і закруцілася.

З дапамогай дацэнта зрокавага аддзялення 3-й клінічнай бальніцы Валерыі Іванаўны Навуменкі (дачкі пісьменніка Івана Навуменкі), уладкавалі Валянціну Уладзіміраўну на аперацыю. Імпартныя крышталікі выкупіў фонд Аляксандра Мілінкевіча і Іны Кулей. Наколькі я ведаю, гэты фонд дапамагаў многім. Аперацыя была зробленая вельмі добра, і паехала мая Валянціна Уладзіміраўна дахаты роўна на паўгода. Але не вытрымала рэжыму, падняла вядро з бульбай, калі садзіла яе на агародзе. І на адным воку парвала сятчатку. Мне патэлефанавала ўжо яе братавая Антаніна. Божа, па-мойму, Глеб Лабадзенка прывёз Валянціну да мяне. Аперацыя складаная, і зрабіць яе маглі толькі ў аддзяленні мікрахірургіі дзесятай клінічнай бальніцы. І зноў дапамагла Валерыя Навуменка. Дамаўлялася яна, але з умовай, што хірург не будзе ведаць пра тое, што гэта родная сястра Быкава. Мне было цяжка паверыць у гэта, але доктар баяўся, што гэта адаб'ецца на яго далейшай кар'еры. Я з сынам адвозіла Валянціну Уладзіміраўну, доктару сказала, што гэта мая родзічка. У хірурга рукі залатыя, але калі нечакана ўсё ж такі ён даведаўся, каму рабілася аперацыя, перастаў адказваць на мой мабільнік. Так і не змагла падзякаваць хірургу, гэта зрабіла мудрая Валерыя Іванаўна Навуменка.

Уся мая сям’я вельмі пасябравала з Валянцінай Уладзіміраўнай. Пасля аперацыі яна жыла ў нас. Вельмі інтэлігентная, шчырая і добразычлівая. А колькі цікавага распавядала пра сябе, Васіля Уладзіміравіча. Мы стэлефаноўваліся і нават перапісваліся. Калі муж папрасіў яе перанесці на паперу свае ўспаміны, яна даслала два таўстасценныя лісты. Яны ляжаць, чакаюць свайго часу. Асабліва цікавы яе расповед, як пяць беларускіх дзяўчат адразу пасля вайны накіравалі ў Германію. Там савецкія салдаты сабралі некалькі сотняў безгаспадарных кароў. Гэты статак яны паўгода пешшу гналі амаль праз усю Еўропу. Асабліва цёплыя ўспаміны ў яе былі пра Аўстрыю. Як ім дапамагалі тамтэйшыя людзі. Але да Ушач яны прыгналі толькі палову статка. Дзяўчаты так і не атрымалі па карове, як ім абяцаў ва ўзнагароду старшыня калгаса. Журналіст Глеб Лабадзенка зняў расповед Валянціны Уладзіміраўны на камеру. На мой погляд, гэты матэрыял варты мастацкага фільма.

# Няскоранасць ад матулі

Даволі часта чую розныя прэтэнзіі да беларускай апазіцыі, у большасці цалкам абгрунтаваныя. Але лічу: у сучасных умовах апазіцыя і не можа быць іншай. Умовы, у якіх яна зараз існуе, жорсткія і неспрыяльныя.

Маю на гэты конт адпаведны асабісты досвед. У беларускіх выбарах прымала ўдзел двойчы. Падтрымліваю погляды амаль усіх дэмакратычных плыняў. Але Аб'яднаная грамадзянская партыя, якую да нядаўняга часу ўзначальваў Анатоль Лябедзька, аказалася самай блізкай па духу. Вельмі яго паважаю за прыстойнасць і мэтанакіраванасць.

У 2004 годзе я ішла на выбары па Смаргонскай выбарчай акрузе.

Прыехалі мы туды з Анатолем Лябедзькам і Андрэем Дзмітрыевым. Тады яны яшчэ былі разам. Планавалася, што Дзмітрыеў будзе дапамагаць мне ў выбарчай кампаніі. Перад гэтым мясцовая выбарчая камісія знайшла ў маёй дэкларацыі аб даходах «жахлівую» недакладнасць — аж 20 рублёў. Нават давялося ісці ў Цэнтрвыбаркам на адпаведнае пасяджэнне ЦВК.

Нягледзячы на тое, што перад падачай дэкларацыі з усімі намі шчыльна працаваў юрыст і вядомы знаўца выбарчага заканадаўства Міхаіл Пліска, я дапусціла крыўдную памылку. Калі перапісвала дадзеныя з чарнавіка на чысты варыянт, замест чацвёркі напісала двойку. На жаль, ніхто з нашай каманды гэтага не заўважыў.

Лідзію Ярмошыну я ведала яшчэ па Бабруйску, куды мы ездзілі з аркестрам Фінберга на канцэрт. Тады яна толькі пачынала сваю кар'еру. Як звычайна, пасля канцэрта, які праходзіў на цэнтральнай плошчы, быў банкет. Да майго

століка падышла Лідзія Міхайлаўна, расказала пра сваю цікаўнасць да мастацтва і захапленне працай Міхаіла Якаўлевіча. Потым на пасяджэнні ЦВК Ярмошына выказалася прыблізна так: «Тут у нас ёсць прыклады, калі ў кагосьці на 800 тысяч канцы з канцамі не сыходзяцца. Няўжо мы з-за нейкіх 20 рублёў будзем закрываць шлях паважанаму чалавеку?»

У Смаргонь мы прыехалі з маім мужам Генадзем Мікалаевічам за дзён дзесяць да выбараў. Знялі кватэру. Спачатку Андрэй Дзмітрыеў пачаў актыўна мне дапамагаць, аднак хутка кінуў мяне і паехаў у Расію на выбары зарабляць грошы ў якасці паліттэхнолага. Гэта была здрада. Як высветлілася — далёка не апошняя.

Увесь клопат па арганізацыі выбараў узяў на сябе былы завуч сярэдняй школы, выдатны педагог і чалавек, Тадэвуш Картавік, светлая яму памяць. Разам са смелай настаўніцай, дэпутаткай мясцовага Савета, Ірынай Верштадт яны былі літаральна рухавікамі каманды. У сустрэчах з выбаршчыкамі нам не адмаўлялі, але заўсёды гэта былі пустыя залы. Улада рабіла ўсё магчымае, каб людзі нас не чулі: зрывалі абвесткі, прызначалі мерапрыемствы праз гадзіну пасля заканчэння працоўнай змены альбо адпускалі людзей з работы дадому за паўгадзіны да пачатку сустрэчы з выбаршчыкамі.

Сапраўднае стаўленне ўлады высветліў мой памочнік Тадэвуш Віктаравіч, калі завітаў да аднаго свайго добрага знаёмага чыноўніка. Каб прадэманстраваць рэальныя адносіны да нас, той уключыў гучную сувязь і звярнуўся да мясцовага вертыкальшчыка. У адказ на просьбу наладзіць сустрэчу з выбаршчыкамі прагучала: «Памяшканне можаце даваць, але людзей на гэтую сустрэчу не пускаць ні ў якім разе».

Канкрэтных прыкладаў можна прывесці яшчэ шмат, і яны даволі красамоўна сведчаць пра тое, што такое «выбары» па-беларуску. Крыўдна, што ў гэтых фальсіфікацыях актыўны ўдзел прымаюць настаўнікі, якія потым вучаць нашых дзяцей.

Сумна было назіраць, як мяняецца стаўленне людзей. Пры маіх ранейшых прыездах у Смаргонь з канцэртамі я бачыла ў вачах захапленне. Людзі не ведалі, як і куды мяне пасадзіць і чым частаваць. А ў гэты прыезд адчувала вакол сябе вакуум. У адной школе на сустрэчы з выбаршчыкамі завуч выйшла да мяне і сказала: «Калі ласка, заходзьце». І адчыніла дзверы. А там — пустая зала. Людзі баяліся дапамагаць.

Тыя выбары былі сумешчаныя з рэферэндумам, які адмяняў абмежаванне колькасці прэзідэнцкіх тэрмінаў, і ўсюды я казала пра небяспечнасць падобных змен. Шкада, улады рабілі ўсё, каб нас не слухалі.

Абавязкова хачу некалькі слоў сказаць пра Івана Фёдаравіча Крука, які быў памочнікам у Астравецкім раёне, бо, пасля змянення памераў выбарчых акруг, мае выбаршчыкі жылі і там. Сам ён некалі працаваў у міліцыі і бачыў памеры юрыдычнага беззаконня. Як чалавек сумленны, часам ён не мог гэта нават вытрымаць.

Вельмі ўдзячна былому палітвязню, адкрытаму і шчыраму чалавеку, адукаванаму і разумнаму палітыку Васілю Севасцьянавічу Лявонаву, светлая яму памяць, і сябру палітсавета АГП Анатолю Васільевічу Паўлаву. Калі даведаліся, што Андрэй Дзмітрыеў пакінуў мяне без дапамогі, яны разам з жонкай Васіля Лявонава Антанінай Міхайлаўнай прыехалі падтрымаць, далі мне шмат разумных парад, пазнаёмілі з вельмі карыснымі людзьмі, якія потым мне дапамагалі.

Гэта было так важна для мяне, бо на той момант я была ў разгубленасці.

Больш за дваццаць гадоў жыцця ў апазіцыйным асяроддзі прынеслі мне шмат цікавых знаёмстваў і кантактаў. Асобна хачу вылучыць Андрэя Клімава, бо з ім кантактавала не толькі я, але і мая стрыечная сястра Ганна Каваленка. Андрэй Клімаў — эмацыйны палітык, у нечым рамантык, летуценнік, настойлівы змагар за свае погляды. У адрозненне ад многіх іншых, яму было што губляць — банк, газета, будаўнічая фірма, заможнасць.

Так атрымалася, што падчас сваёй чарговай «адсідкі» ён апынуўся «на хіміі» ў Баршчоўцы — вёсцы паміж Гомелем і Рэчыцай.

Недалёка ў вёсцы Старыя Цярэшкавічы жыла мая сястра Ганна Мікалаеўна. Тая самая, што не раз згадвалася падчас успамінаў пра дзяцінства. Яна працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. У сваёй школе арганізавала «беларускі куток», куды я перадала адзін свой беларускі строй. Яе любілі і вучні, і бацькі. Яна прытрымлівалася дэмакратычных поглядаў, выпісвала «Народную Волю», з якой і даведалася пра перавод Клімава ў недалёкія ад іх мясціны. Адразу ж сабрала поўныя сумкі хатняй ежы і паехала шукаць Андрэя.

Яны размаўлялі шмат гадзін і паўтаралася гэта амаль кожны тыдзень. Па тэлефоне Ганна мне не раз казала, што палюбіла Андрэя як сына. Захаплялася яго мужнасцю і светапоглядам. У Баршчоўку ездзіла альбо яна сама, альбо яе муж Сцяпан, былы экскаватаршчык. Яна нагатуе ежы, Сцяпан адвозіць. Адны каструлі пакідае, іншыя забірае.

Як яна радавалася, калі даведалася, што Андрэя адпускаюць раней тэрміна! Але вечарам таго дня яна мне патэлефанавала і сумным голасам сказала, што Клімава выпусцілі, і ён да яе не заехаў.

Хутка сястра трапіла ў бальніцу і праз дзён дзесяць памерла.

Некаторыя звязваюць гэтыя дзве падзеі, але я б не спяшалася з абагульненнямі і высновамі. Ведаю, што Андрэй моцна перажываў гэты момант, і мы неаднойчы гаварылі пра тое.

Калі Ганны не стала, на пахаванне прыйшла амаль уся вёска. Старыя Цярэшкавічы — даволі вялікае паселішча. З птушкафабрыкай, з размешчаным непадалёк племзаводам, дзе вырошчваюць элітных бычкоў. З аднаго боку жывуць сталыя жыхары, з другога — чарнобыльскія перасяленцы. Маю сястру ведалі ўсе. Такую колькасць народу, як на развітанні з ёй, я бачыла толькі ў Мінску на пахаваннях вядомых людзей.

* * *

У 1993 годзе мяне запрасілі быць вядоўцай новага праекту Міжнароднага хрысціянскага фестывалю духоўнай музыкі «Магутны Божа», які ладзілі ў Магілёве. Першы яго ініцыятар і кіраўнік быў пробашч касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі і Святога Станіслава Уладзіслаў Блін. Праз некалькі гадоў яго перавялі на працу ў Віцебск. Ягоным пераемнікам, а таксама кіраўніком і дырэктарам фестывалю стаў ксёндз Раман Факсіньскі.

З якой цеплынёй успамінаю гэтыя фестывалі!

Гарадскія ўлады слаба дапамагалі арганізацыі свята, усё трымалася на ініцыятыве кіраўніцтва касцёла, саміх вернікаў і некаторых сяброў з Польшчы. Напрыклад, з Ганнай і Станіславам Сцепанчук з Беластоку мы і дагэтуль падтрымліваем добрыя стасункі.

Мяне запрасілі быць вядучай фестывалю, дапамагчы з афармленнем сцэны, падключыць тэлебачанне. Вялікія ўрачыстыя канцэрты праходзілі ў Магілёўскім Палацы хімікаў, конкурсныя — у касцёле і ў музычным каледжы. Іх удзельнікамі былі канкурсанты з блізкага і далёкага замежжа.

Гасцей заўсёды было вельмі шмат. На першы фестываль прыехалі паломнікі ў складзе 200 замежных студэнтаў з Масквы, якія прадстаўлялі ўсе хрысціянскія канфесіі. Былі нават студэнты-хрысціяне з Афрыкі. Толькі на першым фестывалі ў Магілёве пабывалі прадстаўнікі духоўнага мастацтва амаль з 20 краін свету. Прыязджалі многія епіскапы і святары праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай цэркваў Беларусі і замежжа.

Для Магілёва гэтыя фестывалі былі сапраўдным духоўным святам і праваслаўных, і каталікоў. Напачатку я вяла іх адна. Потым падключыла сваіх маладых калег Ірыну Смольскую і Сашу Байкова, а таксама сына Уладзіміра з яго песнямі духоўнага зместу. Афармляла сцэну мастачка тэлебачання Галіна Холад. Ну як жа прафесійна яна зрабіла гэтае афармленне! Яно было падаравана фестывалю нашым тэлебачаннем і доўгія гады ўпрыгожвала сцэну.

Над рэстаўрацыяй касцёла святога Станіслава ў 1991 годзе працаваў мастак Алесь Пушкін разам з Феліксам Янушкевічам. У правым баку касцёла яны ў знакавых асобах Беларусі адлюстравалі гісторыю нашай краіны: старшыню Рады БНР Яна Сераду, кіраўніка партыі БНФ Зянона Пазняка; была намалявана Канстытуцыя Беларусі 1995 года... Калі прыехала на фестываль, увесь гэты роспіс быў задрапіраваны белым палатном, а праз чатыры гады па патрабаванні гарадскіх уладаў яго наогул замалявалі белай фарбай.

Журы ўзначальваў Народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР прафесар Віктар Уладзіміравіч Роўда. У складзе журы былі народныя артысты БССР Любоў Каспорская і Віктар Скарабагатаў, прафесар Беларускай акадэміі музыкі Ганна Каржанеўская. Заўсёды апладысментамі сустракалі загадчыка аддзялення музыкі фонду Ф. Скарыны Брытанскай нацыянальнай бібліятэкі, спадара Гая дэ Пікарда, светлая яму памяць, Заслужанага дзеяча Украіны Ігара Маціеўскага, дырыжора кафедры хору з горада Торунь музыказнаўцу Рамана Гручу.

Разам з энтузіястамі: хормайстрам і выкладчыкам філіяла музычнай акадэміі Магілёва Жанетай Ялфімавай, Ганнай Каржанеўскай, Віктарам Скарабагатавым — сядзелі за поўнач, распісвалі канцэртныя праграмы, каб раніцай паспець выклікаць удзельнікаў на рэпетыцыю. І ў нас ніколі не ўзнікала пытання, а колькі нам заплацяць, бо мы ведалі, што гэта ляжа на плечы вернікаў.

На адзін з апошніх фестываляў запрасілі аднаго вядомага артыста з Мінска, каб ён разам са мной правёў канцэрты адкрыцця і закрыцця фестывалю. Пасля першай жа рэпетыцыі ён спытаў: колькі мне заплацяць? Ксёндз Раман Факсіньскі з радасцю (таму што раней у яго не было такой магчымасці) адказаў: 100 даляраў. І раптам у адказ: «Што? Ды я толькі за аб'яву ў Палацы Рэспублікі па закулісным мікрафоне «На сцэну запрашаецца прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка!» атрымліваю 50 даляраў. А тут увесь вечар на сцэне!» Ён правёў толькі канцэрт адкрыцця, атрымаў свае 100 даляраў — і з'ехаў у Мінск.

Ксёндз Раман вельмі смелы чалавек. Колькі ён змагаўся за мяне!

Гарадскія ўлады ціснулі, паставілі ўмову: ці фестываль, ці Бандарэнка. Ксёндз Раман мне тэлефануе: «Прыязджайце ўсё роўна, папрацуйце ў конкурсных канцэртах». Мой адказ быў такі: «Паважаны айцец Раман, вам трэба захаваць фестываль, не рызыкуйце». І я перастала ездзіць у Магілёў. Адразу са сцэны знікла беларуская мова, дый фестываль паціху пачаў сыходзіць.

Дадам яшчэ, што неаднойчы на наш фестываль прыязджаў і вітаў са сцэны Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, уладыка Мітрапаліт Філарэт. І мне самой даводзілася сустракацца з Яго Высокапраасвяшчэнствам на розных мерапрыемствах, размаўляць з ім, бываць на яго службах — і заўсёды атрымлівала духоўнае падмацаванне.

* * *

Мая мара: каб беларуская мова стала роднай для ўсіх беларусаў. Але гістарычна склалася так, што беларусы доўга жылі ў польскамоўным асяроддзі, доўга жылі, і зараз жывуць у рускамоўным асяроддзі. Наша грамадства падзеленае. Каб нас аб'яднаць, моўная палітыка павінна праводзіцца вельмі асцярожна.

Мы жывем у шматнацыянальным свеце, і павінны асабліва ўважліва ставіцца да культуры і мовы іншых. Але пры гэтым мы маем права патрабаваць такой жа павагі і да сябе. І як прыклад гэтага: беларуская грамадзянка, напалову ўкраінка, атрымала Нобелеўскую прэмію за кнігі, напісаныя на рускай мове. І ўспрымаецца гэта добра.

Мне часта задаюць пытанне: ці не шкадую, што з-за сваёй пазіцыі апынулася па-за дзвярыма тэлебачання. Быць несвабодным чалавекам радасці мала. І я рада, што сябрую з журналістамі, якія працуюць у незалежных сродках масавай інфармацыі: на тым жа «Белсаце», ці ў маёй любімай газеце «Народная Воля».

Шчаслівая, што далучылі мяне да вядзення самага ўрачыстага свята для Беларусі — 100-годдзя з Дня абвяшчэння

незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. Нечаканы быў дазвол улады. І тое, што столькі беларусаў прыйшлі на святкаванне, напалохала ўсіх галоўных чыноўнікаў, таму і зноў пачаўся ўціск і забароны.

Калі перагортваю старонкі свайго жыцця і параўноўваю з днём сённяшнім, бачу, адчуваю, як мы змяніліся. Змяніліся ўсе мы.

Менш стала дабрыні, той жа адкрытасці людской. У размовах часта чуеш: усё вырашаюць грошы. У наш час нават думкі такія лічыліся непрыстойнымі. Перш за ўсё мы думалі пра сумленнасць, адукаванасць, духоўнасць. А сёння па ўсім свеце хвалямі пракатваюцца нецярплівасць, нянавісць, варожасць, агрэсія — усё гэта проста льецца з экранаў тэлебачання, інтэрнэту, з газет, ад палітыкаў.

І я дзякую Госпаду, што нарадзіла мяне мама менавіта ў той час. Лёс падштурхнуў мяне на нікім не занятую сцежачку. Калі б гэта адбылося пазней, напрыклад, у гэтыя гады, у мяне нічога не атрымалася б. Цяпер людзі мастацтва павінны прабівацца, расштурхоўваць сваіх калег, сваіх канкурэнтаў, ісці напралом. Калі чытаю ў інтэрнэце пра ўсё гэта, кожны раз думаю: «Не, гэта не мой час, мой час быў для мяне шчаслівы».

Нягледзячы на шматлікія войны, што прайшлі па нашай зямлі, беларусам удалося выпрацаваць рэлігійную талерантнасць і павагу да поглядаў суседзяў. Можа таму дагэтуль у нас у характары і гасціннасць і добразычлівасць. Любая ўлада ад Бога. Нам наканавана жыць па Божых запаветах, любіць Госпада, любіць адзін аднаго, падтрымліваць. Наша пакаленне не дайшло да Беларусі, не здолела, не паспела. Адна надзея на дзяцей і ўнукаў. І мая заўсёдная малітва: каб не давялося ім браць у рукі зброю бараніць незалежнасць Беларусі.

20 гадоў таму газета «Вячэрні Мінск» надрукавала малітву, якую даслаў студэнт Мінскага медыцынскага інстытута. Прозвішча не памятаю. Менавіта яе неаднойчы чытала са сцэны на фестывалях «Магутны Божа». І не толькі там. Яе радкамі я і развітваюся з Вамі.

*Ойча Нябесны, захавай ад варожага ўціску, вайны і голаду, ад брацкай нязгоды. Не карай нас бяспамяцтвам і не дай забыцца святой мовы нашай беларускай, гісторыі і традыцыяў нашых. І дай нам бязмерную любоў, каб мы бясконца любілі святую Беларусь.*

# Паказальнік імёнаў

**А**

Агняцвет Эдзі *83*
Адамовіч Алесь *115, 118*
Аксенцюк Валянцін *93, 127*
Акудовіч Валянцін *120*
Алексіевіч Святлана *3, 95, 115, 116, 118, 140*
Алфімава Інга *44*
Анемпадыстаў Міхал *120*
Анісім Алена *119*
Арлова Вера *75*
Арэшка Алена *131*
Астравумаў Сяргей *32, 33, 41*
Аўрамчык Мікола *12*

**Б**

Бабкіна Надзея *129*
Байкоў Аляксандр *138*
Балашоў Віктар *85, 88*
Бандарэнка Аляксандр *20, 21, 57*
Бандарэнка Аляксандр *10–14, 18–20, 31, 33, 66, 67, 118*
Бандарэнка Васіль *12*
Бандарэнка Ігар *11–15, 17–19, 21, 35, 66, 67*
Бандарэнка Кацярына *19, 20, 29, 67*
Бандарэнка Леанід *64*
Бандарэнка Любоў *13, 18, 20*
Бандарэнка Людміла *56*
Бандарэнка Надзея *35, 66*
Бандарэнка Наталля *33, 38, 67*
Бандарэнка Парфірый *11*
Барадулін Рыгор *116, 117, 121*
Барысенка Варвара *31*
Бастун Тамара *37, 41*
Бахціяраў Бахціяр *128*
Блін Уладзіслаў *138*
Браілоўскі Уладзімір *128–130*
Браілоўская Людміла *129, 130*
Братушэнка Мікалай *84*
Броўка Пятрусь *50, 51, 54, 55*
Брэжнева Вікторыя *102*
Брэжнева Галіна *104*
Брэжнеў Леанід *54, 58, 89, 100, 101, 104*

Бугрымава Ірына *31*
Булгакава Іна *101, 102*
Булдык Валерый *128*
Бураўкін Генадзь *91–98, 118, 120, 121, 126*
Бураўкіна Святлана *95–97*
Бутусаў Вячаслаў *113*
Быкава Антаніна *132*
Быкава Валянціна *132, 133*
Быкаў Васіль *112, 118, 132, 133*
Бяльзацкая Марына *100*

**В**
Вавілаў Аляксандр *125*
Вайтовіч Аляксандр *119*
Вайцюшкевіч Зміцер *74, 113*
Вангелаў Зоран *90*
Вапа Яўген *116*
Варашылаў Эдуард *42, 65*
Варашылава Святлана *42, 65*
Вахрамееў Філарэт *140*
Верштадт Ірына *135*
Вуячыч Віктар *87*
Высоцкая Вольга *85*
Вярцінскі Анатоль *118, 119*
Вяткін Уладзімір *66*

**Г**
Гагарын Юрый *59, 60*
Галкіна Давенора *41, 109, 110*
Ганчар Віктар *72*
Ганчарова Тамара *103*
Гарбачова Раіса *102*
Гарбачоў Міхаіл *101, 102*
Гарэцкі Радзім *119*
Гаўрылкін Леанід *94*
Геніюш Ларыса *116*
Герцык Уладзімір *87*
Гілевіч Ніл *53, 94, 112, 118, 121*
Глебава Ларыса *107, 109*
Глебаў Яўген *107–109*
Гразнова Людміла *130*
Грамовіч Галіна *70*
Грачышнікава Любоў *59*
Груча Раман *139*
Грыбалёва Ларыса *70*

Грыгор’еў Уладзімір *106*
Грышкевіч Людміла *56*
Гульцяй Барыс *62*
Гуляеў Анатоль *120*

**Д**

Дабранраваў Мікалай *84*
Давідовіч Лілія *53, 65*
Давыдоўская Элеанора *127*
Данілава Ларыса *69*
Даніловіч Баляслаў *30, 31*
Даніловіч Лідзія *30*
Данілюк Святлана *52*
Данэлія Георгій *62*
Дарафеева Ірына *98*
Дзвінская Эла *73*
Дзікавіцкі Аляксей *120*
Дзмітрыеў Андрэй *134–136*
Дранько-Майсюк Леанід *54*
Дрынеўскі Міхаіл *95*
Дудкевіч Валянцін *83, 102*

**Е**

Еўдакімаў Яраслаў *86*

**Ж**

Жараў Міхаіл *75*

**З**

Забаркін Аляксандр *78*
Завадская Вольга *71, 72*
Завадскі Зміцер *71*
Зайга Вінертэ *50*
Законнікаў Сяргей *118, 119*
Замоўскі Савелій *41*
Захарава Святлана *69, 70*
Захаранка Юрый *72*
Захараў Павел *69*
Захарчанка Віктар *79*
Захарэвіч Марыя *24, 25, 108*
Зыкіна Людміла *128*

**І**

Іванюк Яраслаў *116*
Іпатава Вольга *93, 119*

**К**

Кабзон Іосіф *86, 87*
Каваленка Ганна *14, 15, 22, 57, 136,137*
Каваленка Сцяпан *137*
Кавеленаў Юрый *50*
Казінец Міхаіл *46*
Каландзёнак Анатоль *78, 79*
Калінін Міхаіл *63*
Калінкіна Святлана *114, 120*
Калякін Сяргей *114*
Канаплёў Уладзімір *106*
Кандратава Ніна *85*
Кап'ёва Ганна *56*
Кап'ёва Ксенія *73, 74*
Кап'ёва Марыя *74*
Кап'ёва Надзея *56*
Кап'ёва Ніна *36, 37, 45, 63–66*
Кап'ёў Аляксандр *57, 64, 67–69*
Кап'ёў Афанасій *74*
Кап'ёў Генадзь *33–40, 45, 53, 56, 57, 63–65, 86, 111, 114, 135*
Кап'ёў Мікалай *36, 37, 63–65*
Кап'ёў Пётр *63*
Кап'ёў Уладзімір *25, 68, 70, 72–74, 138*
Кап'ёў Ціхан *74*
Капланаў Ізмаіл *130*
Караева Марыя *35*
Каржанеўская Ганна *139*
Кармальская Лідзія *105*
Каробкіна Святлана *49*
Карпенка Вера *71*
Карпенка Генадзь *71, 72*
Карпілаў Віктар *128*
Карповіч Марыя *117, 121, 122*
Картавік Тадэвуш *135*
Карызна Уладзімір *52*
Каспорская Любоў *139*
Каўпак Сідар *16*
Кебіч Вячаслаў *122*
Кірылаў Ігар *85*
Кісель Рыгор *126*
Кісялёў Ціхан *103, 104*
Кісялёва Ніна *103, 104*
Клем Людвіга *62*
Клімаў Андрэй *136, 137*

Клімовіч Марыя *5, 9–22, 24, 25, 27, 31, 34–37, 39, 64, 66, 67*
Клімовіч Мікалай *14–17, 22, 23*
Клімовіч Піліп *9, 10*
Клімовіч Сафія *14–16, 17, 59*
Ключароў Аляксандр *66*
Колас Уладзімір *118, 120*
Колас Якуб *27, 88*
Корж Дзмітрый *76*
Корж Пётр *63*
Кострыкаў Аляксандр *69*
Косцін Зміцер *116*
Красоўскі Анатоль *72*
Крук Іван *13*6
Круцько Аляксей *34*
Круцько Мялання *10, 34*
Ксяндзоў Генадзь 97
Кулей Іна *132*
Кулікоў Юрый *66*
Купала Янка *59, 88*
Курган Ілля *88*
Курзіна Тамара *15–17*
Кучынскі Валерый *48*

**Л**
Лабадзенка Глеб *116, 132, 133*
Лапцева Нінэль *128*
Ларуцін Леанід *62, 76*
Ларэці Раберціна *128*
Лебедзева Любоў *131*
Левітан Юрый *85*
Ленін Уладзімір *52*
Лепін Георгій *119*
Лешчанка Анатоль *128*
Ліхач Зоя *56*
Лось Надзея *56*
Лукашук Аляксандр *72*
Лукашэнка Аляксандр *106, 121, 124–127, 139*
Лучанок Ігар *59, 84, 130*
Лябедзька Анатоль *71, 114, 134*
Лявонава Антаніна *136*
Лявонаў Васіль *136*
Лявонцьева Валянціна *7, 82*
Лявонцьеў Аляксей *110*
Лякерман Эдуард *30*
Лякерман Яўген *22, 30*

**М**


Магамаеў Муслім *128*
Макаль Пятрусь *107, 108*
Малышава Людміла *107*
Марачкін Алесь *119*
Маргунова Святлана *85, 86*
Матукоўскі Мікалай *100*
Маціеўскі Ігар *139*
Мацюшэнка Таццяна *127*
Машэрава Наталля *99*
Машэраў Пётр *52, 54, 81, 84, 91, 92, 95, 99, 100*
Мэве Яўген *66*
Мележ Іван *7, 8*
Мілінкевіч Аляксандр *132*
Мітрохін Мікалай *59*
Міхарскі Уладзімір *128*
Міхейчык Аляксандр *68*
Міхеткін Генадзь *73*
Моін Марк *75*
Молчан Таццяна *70*
Мохарт Таццяна *69*
Мулявін Уладзімір *105*
Мядвецкая Валянціна *56*
Мядвецкі Пётр *56*
Мядзведзь Аляксандр *66, 75*


**Н**


Навуменка Валерыя *132, 133*
Навуменка Іван *132*
Навуменка Якаў *48, 70*
Навумчык Сяргей *122*
Насілоўская Нона *50, 51, 53, 54*
Несцяровіч Васіль *38, 39, 41–46*
Несцяровіч Кацярына *56, 127, 128*
Нікіфараў Фёдар *39*
Ніязбердзінава Агульдзінара *50*
Новікава Марына *127*
Новікаў Уладзімір *34*
Някляеў Уладзімір *54, 95*
Някрасаў Мікалай *32*
Нямцоў Барыс *114*


**П**


Падгайскі Анатоль *48*
Пазняк Зянон *122, 139*

Палескі Вячаслаў *7, 46, 76, 77*
Палкоўнікава Людміла *124, 125, 130*
Панамароў Валянцін *81*
Папанаў Анатолій *81, 82*
Паплаўская Ядзвіга *70, 97*
Папоў Юрый *89*
Паўлаў Анатоль *136*
Пахмутава Аляксандра *84*
Пахомаў Мікалай *61, 62*
Пахомаў Сяргей *62*
Пашкевіч Алесь *119*
Пашкевіч Іван *124*
П'еха Эдзіта *65*
Пельтцэр Канстацін *76*
Пельтцэр Таццяна *77*
Пенкіна Святлана *105*
Пікарда Гай *139*
Піхоцкая Элеанора *66*
Піхоцкі Леанід *66*
Плешакова Станіслава *91*
Пліска Міхаіл *134*
Познер Уладзімір *60*
Правалінскі Уладзімір *130*
Пранько Уладзімір *128*
Пташук Міхаіл *57*
Пуцылеў Сямён *91*
Пушкін Алесь *139*
Пятніцкі Канстанцін *43*
Пятровіч Барыс *117*
Пячорына Валянціна *86*
Пячынская Тамара *48*

**Р**
Рабашапка Мікалай *80*
Рагаўцоў Уладзімір *84*
Радзюк Клаўдзія *69*
Раеўская Тамара *47, 48, 52*
Райскі Барыс *42, 47, 109*
Раінчык Васіль *98*
Ропат Вера *127*
Роўда Віктар *139*
Рудакова Галіна *128*
Рудамётаў Ігар *90*
Руцкая Вера *128*
Рымашэўская Агнешка *120*

Рыскельдзінава Розэ *50*
Рэгак Любамір *112*

**С**
Савіцкі Міхаіл *66*
Садоўскі Пётр *92*
Сакалова Людміла *85*
Сакалоўскі Рыгор *121*
Сакарыядзэ Кетэно *50*
Саковіч Павел *98*
Салілава Зоя *60*
Сахараў Андрэй *115*
Сачанка Барыс *117*
Святлоў Барыс *122*
Святлоў Уладзімір *122*
Семяняка Юрый *52*
Серада Ян *139*
Сідзельнікава Галіна *93*
Сіўчык Галіна *68*
Скарабагатаў Віктар *139*
Скорынаў Іван *128*
Смялкоўскі Леанід *30*
Смірноў Юрый *48, 56, 57*
Смольская Ірына *138*
Содаль Уладзімір *93*
Співакоў Уладзімір *130*
Сталін Іосіф *28, 87, 88*
Станкевіч Уладзімір *128*
Страціенка Тамара *85*
Стрыжакова Ганна *47*
Субат Уладзімір *93*
Суслаў Яўген *57, 78*
Сцепанчук Ганна *138*
Сцепанчук Станіслаў *138*
Сцяпанава Таццяна *80*
Сцяпанаў Анатоль *128*
Сыс Анатоль *93, 94*
Сяргей Анатоль *56*
Сяргей Людміла *56*

**Т**
Талібава Рано *50*
Тальвік Аліс *50, 51*
Тамела Наталля *70*
Тамковіч Аляксандр *71*

Ткачоў Валянцін *119*
Ткачэнка Віктар *89*
Травіна Мар'яна *103–105*
Трусаў Алег *119, 120*
Тулупава Анэля *51, 52, 54, 80*

**У**

Ужынцаў Юрый *107*
Ушкоў Анатоль *61*

**Ф**

Факсіньскі Раман *138–140*
Фінберг Міхаіл *79, 106, 121, 125–127, 130, 131, 134, 135*
Фолы Рыкарда *128*
Фралоў Валерый *114*
Фрунзэ Міхаіл *29*

**Х**

Ханок Эдуард *121*
Хаўратовіч Іосіф *45*
Хашчавацкі Юрый *120*
Хелемскі Якаў *50*
Хіліцкая Марыя *69*
Холад Галіна *123, 138*
Холадава Алена *69*
Хрушчова Ніна *102*
Хуцыеў Марлен *78*

**Ц**

Цітовіч Генадзь *78*
Цітоў Герман *60*
Ціхановіч Аляксандр *70, 97*
Ціхановіч Анастасія *70*
Цішчанка Мікалай *43, 44, 46*
Цогліна Ніна *27, 28*
Цымбал Таццяна *85*
Цярлецкі Уладзімір *57*

**Ч**

Чалая Тамара *7*
Чанін Віталь *56, 57*
Чаргінец Мікалай *66*
Чарнабаеў Віктар *80*
Чурбанаў Юрый *58*
Чыжык Алег *117*
Чэхаў Антон *27*

**Ш**

Шаліхін Уладзімір *46, 87, 99*
Шамчук Людміла *80*
Шарамет Павел *112–115*
Шатэрнік Аляксандр *119*
Шашыташвілі Кацярына *131*
Шлындзікаў Васіль *119*
Шпанаў Сяргей *32, 41*
Шутава Вольга *80*
Шчаглова Марыя *28, 29*
Шчаглова Таісія *28, 29*
Шчаглоў Анатоль *28, 29*
Шыбека Вера *85*
Шынкарык Ігар *71*
Шышко Сяргей *127*
Шышкова Валянціна *33*
Шэвялевіч Віктар *128*

**Э**

Эрыксан Вераніка *111*
Эрыксан Стэфан *110–112, 120*

**Ю**

Юкнявічэне Раса *71*

**Я**

Язерская Элеанора *130*
Якубовіч Павел *59*
Ялфімава Жанэта *139*
Янушкевіч Фелікс *139*
Ярмоленка Анатоль *124, 130*
Ярмошына Лідзія *134, 135*
Яроменка Мікалай *56, 57*

# Змест


Першыя крокі ........................................ 9

Маленства без дзяцінства ........................................ 19

Жыццёвы кірунак ........................................ 27

Нечаканыя выпрабаванні ........................................ 41

Шлях да прызнання ........................................ 49

Сям'я — лад жыцця ........................................ 63

Станаўленне ........................................ 75

Бураўкін ........................................ 91

Побач з першымі ........................................ 99

Жыццё наша непрадказальнае ........................................ 107

Подых новага ........................................ 121

Няскоранасць ад матулі ........................................ 134

Паказальнік імёнаў ........................................ 143

Літаратурна-мастацкае выданне

КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА

*Серыя заснавана ў 2009 годзе*

**Бандарэнка** Зінаіда Аляксандраўна

Мой шлях да Беларусі

Успаміны

Аўтар ідэі Аляксандр Тамковіч
Адказны за выпуск Алесь Пашкевіч
Рэдактар Барыс Пятровіч
Вокладка Уладзімір Цэслер
Камп'ютарная вёрстка Марына Пятровіч
Карэктура Святлана Цітова

Падпісана да друку з арыгінал-макета заказчыка 01.07.2020.
Фармат 60x84 1/16.
Папера крэйдаваная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13,6. Ул.-выд. арк. 9,9.
Наклад 500 ас. Замова 10926.
16+

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/142 ад 09.01.2014, № 2/34 ад 23.12.2013.
Вул. Цімiразева, 9, 220004, Мінск.
www.medisont.by

# Беражы лес

- ЧЫТАЙ КНІГІ НА **KAMUNIKAT.ORG**



• 50 000 КНІГАЎ, ГАЗЭТАЎ І ЧАСОПІСАЎ • РАЗМОВЫ ПРА КУЛЬТУРУ
• ЛІТАРАТУРНЫЯ РАДЫЁПЕРАДАЧЫ • НАВІНКІ ВЫДАВЕЦКАГА РЫНКУ

kamunikat.org
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

**Шаноўныя паны й паненкі, спадары й спадарыні!**

---

**Вы шукаеце фільмы, музыку ці літаратуру**

## па-беларуску?

**Завітвайце ў інтэрнэт-краму**

ІМБРЫК

www.imbryk.by

**Толькі на Імбрыку для Вас**

**! бясплатная дастаўка !**

**па Менску й Беларусі.**

## Марна часу не губляй – замаўляй на Imbryk.by!

**+375-29-757-58-67**

**Алесь Мазанік**



Зінаіда Бандарэнка — знакаміты дыктар Беларускага тэлебачання, Народная артыстка БССР.

Яна стаяла ля вытокаў тэлебачання нашай краіны, была вядучай шматлікіх міжнародных фестываляў і канцэртаў у былым СССР і незалежнай Беларусі.

Пра няпростыя выпрабаванні, якія выпалі на яе жыццё, пра незабыўныя сустрэчы з вядомымі дзеячамі культуры і палітыкамі, пра найцікавыя выпадкі з асабістага творчага досведу, пра свой шлях да Беларусі — Зінаіда Аляксандраўна шчыра і пранікнёна распавядае на старонках гэтай кнігі, багата ілюстраванай рэдкімі і гістарычнымі фотаздымкамі.

БЕЛСАТ tv
BELSAT

ISBN 978-985-7261-11-6
9 789857 261116

КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА

Зінаіда Бандарэнка **МОЙ ШЛЯХ ДА БЕЛАРУСІ**